ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№8 (1055), ЖНІВЕНЬ, 2021
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка. Эканоміка. Культура

ISSN 0320-7544



# ХЛЕБ У ЖАНОЧЫХ ДАЛОНЯХ

ГРУНТОЎНАЯ РАЗМОВА ПРА ВАЖНАЕ

НА ВАГУ ЗОЛАТА. ПЕРАМОГІ Ў ТОКІА

ЦЯГНІК У БУДУЧЫНЮ. ПАД ГУКІ КОЛАЎ

УЗДОЎЖ МЯЖЫ – ПЕШШУ

ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» — НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

## Газета для суайчыннікаў, якую чытаюць па ўсім свеце


ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY

Паклон зямлі і медалі

Купалле з працаўнікамі

Даўні след на новым палатне

Таленты збірае Віцебск

Карагоды творчасці на Самарскай зямлі

Мы будзем родны...

Крыніца тая вайна...

# У НУМАРЫ




БЕЛТА

**14** **Патрэбны рух наперад**

Прэзідэнт Беларусі лічыць недапушчальным замарозіць сітуацыю ў краіне, каб не было застою. Аляксандр Лукашэнка падтрымлівае неабходнасць перамен, але выключна ў рамках закону. Аб гэтым ён заявіў на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод прадстаўнікам шэрага сілавых структур.




**15** **У ліку 40 запланаваных**

Экспазіцыя беларускіх вытворцаў будзе прадстаўлена на міжнароднай выставе Armenia Expo 2021, якая пройдзе ў верасні ў Ерэване. Больш за дваццаць беларускіх прадпрыемстваў розных галін прадставяць у сталіцы Арменіі свае лепшыя навінкі, адаптаваныя пад перавагі і патрэбы армянскіх партнёраў.




**16** **Амбіцыйныя планы як драйвер росту**

Праекты будучыні становяцца галоўнай кропкай каардынат інавацыйнай эканомікі Беларусі. Сапраўды, як лічыць намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей Шчарбакоў, самае амбіцыйнае, што плануецца ажыццявіць у межах гэтай пяцігодкі, — так званыя комплексныя праекты будучыні.



# У НУМАРЫ

БЕЛТА




**24** НА ВАГУ ЗОЛАТА




## 28 Цягнік – у будучыню

Рэспубліканскі маладзёжны цягнік "#БеларусьМоладзьАдзінства" сёлета пераадолеў каля 2 тысяч кіламетраў па нашай краіне. Яго пасажыры — студэнты, валанцёры, блогеры, маладыя дэпутаты, выкладчыкі пабывалі ў самых розных кутках сінявокай. Пад гукі колаў яны абмяркоўвалі розныя надзённыя пытанні: ад патрыятычнага выхавання моладзі да рэалізацыі сацыяльна значных ініцыятыў. У праекце прынялі ўдзел і маладыя людзі з Новасібірскай вобласці Расіі, а таксама з краін Азербайджана і Таджыкістана.



## 32 Уздоўж мяжы — пешшу

У той, 12-ы дзень вандроўкі раніца была халаднаватай. Начавалі ў лесе за вёскай Медрыкі. Прачынацца не хацелася: праяўляецца стома штодзённай хады. Настрой, аднак быў прыўзняты, бо месца на начлег выбіралі без дыскусіі, дзе стаць лепш. У каторы раз пераконваемся, наколькі моцна ўплывае настрой на фізічны стан. Таму і выйшлі на маршрут аж у 10.15, сабраўшыся без спеху. Тое-сёе нават падрамантавалі..



## 38 Вера Палякова: "Я чалавек-стваральнік"

Пра што галоўнае ў сваім жыцці Вера Палякова хацела б распавесці чытачам часопіса? З такім пытаннем мы звярнуліся да нашай суразмоўцы. А яна, як ведаем, жыве адначасова нібы ў розных вымярэннях: як медыйная актрыса, тэлевядучая, кіраўніца тэатральнага праекту "ТрыТформаТ", дацэнт кафедры вакалу, сцэнічнай мовы і пластычных дысцыплін Акадэміі мастацтваў Беларусі. Да таго ж Вера і дачка, і жонка, і маці...



Грамадска-палітычны часопіс

**№ 8 (1055), жнівень, 2021**
Выдаецца з 1930 года.
Адноўлены ў 1944 годзе.

**Заснавальнік:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

**Галоўны рэдактар**
Харкоў Віктар Міхайлавіч

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Захарава, 19,
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 263-80-12.

**www.zviazda.by**
**E-mail:** belarus.mag@mail.ru

**Падпісны індэкс** — 220034

Рэгістрацыйнае пасведчанне 8, выдадзена 16.07.2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Дызайн і вёрстка:**
Юлія Корбут

**Карэктар:**
Аліса Гюнгер

**«Беларусь.Belarus»** выходзіць на беларускай, англійскай і кітайскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **«Беларусь. Belarus»** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

Падпісана да друку 22.08.2021.
Фармат 60х84 ⅛.
Афсетны друк.
Папера крэйдаваная.
Ум.-друк. арк. 5,58
Ул.-выд. арк. 7,12

Агульны наклад — 684 асобнікаў (на беларускай мове — 200).

**Заказ**

Друкарня:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, Мінск,
Рэспубліка Беларусь, 220123.


© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2021




## МІНСК-ХАНОЙ: З ТУРЫСТЫЧНЫМ ПРЫВІТАННЕМ

**Беларусь і В'етнам дамовіліся пра больш актыўнае супрацоўніцтва ў сферы турызму**

Прадстаўнікі дзвюх краін правялі круглы стол у рэжыме відэаканферэнц-сувязі на тэму турызму. Мерапрыемства адбылося пры арганізацыйным садзейнічанні беларускай дыпламатычнай місіі ў Ханоі. У сустрэчы прыняло ўдзел кіраўніцтва Нацыянальнага агенцтва па турызме з Беларусі і В'етнамскай адміністрацыі па турызме. Беларускі бок прэзентаваў патэнцыял турызму і профільныя мерапрыемствы, якія праходзяць у краіне.

У цэлым удзельнікі круглага стала абмеркавалі стан і перспектывы беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва ў галіне турыстычнай дзейнасці, абмяняліся меркаваннямі аб аптымальным узаемадзеянні ў сучасных умовах. Быў разгледжаны праект пагаднення аб супрацоўніцтве і абмене інфармацыяй.

Дасягнута таксама дамоўленасць ажыццяўляць узаемныя візіты для ўдзелу ў спецыялізаваных міжнародных выставах і інфармацыйных турах.

## ФЕСТЫВАЛЬ АДЗІНСТВА

**Унікальнае фальклорнае свята "Берагіня" адбылося ў гарадскім пасёлку Акцябрскі, што на Гомельшчыне**

Сёлета фальклорнае свята праходзіла пад дэвізам "Фестываль адзінства". У ім удзельнічалі калектывы мастацкай самадзейнасці з усіх рэгіёнаў краіны. Кожная каманда прадставіла асаблівасці нацыянальнага касцюма сваёй малой радзімы, а таксама самабытныя песні і танцы. Па традыцыі ў выканаўчых відах мастацтва журы выбрала лаўрэатаў. Дарэчы, многія калектывы творча выраслі менавіта на гэтым фестывалі і сёння іх імёны вядомыя ўсёй краіне.

Ужо трэцяе дзесяцігоддзе "Берагіня" — цэнтр прыцягнення для ўсіх тых, хто збірае разам, аднаўляе і захоўвае танцавальныя і песенныя традыцыі беларускага народа.

— Ніводная краіна не праводзіць рэгіянальныя фестывалі ў такой колькасці, як Беларусь, — адзначыў кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Іван Галабурда. — Пры гэтым наша галоўная мэта — не дасягненне камерцыйнай выгады, а захаванне адзінай культурнай прасторы.

У выпадку з Акцябрскім — гэта, безумоўна, "Берагіня". Сёння можна ўпэўнена казаць аб тым, што фестывальны рух у краіне ёсць і ён набывае развіццё. У насычанай праграме свята, у якой прынялі ўдзел больш за 300 чалавек, былі не толькі канцэрты калектываў, але і конкурсы музыкі, песень і танцаў, розныя выставы, прэзентацыі шэрагу культурна-асветніцкіх праектаў.

## СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ СТАНЕ БОЛЬШ

**Беларусь і Рэспубліка Карэя стварылі савет дзелавога супрацоўніцтва**

Адпаведны пратакол падпісалі старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч і прэзідэнт Карэйскай асацыяцыі міжнароднага гандлю (KITA) Кім Енг Джу) на інаўгурацыйнай сесіі, якая прайшла ў рэжыме відэаканферэнцыі.

Савет створаны ў рамках рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве паміж БелГПП і KITA, падпісанага 15 снежня 2020 года. Як адзначылі ў Беларускай гандлёва-прамысловай палаце, гэта новая пляцоўка для абмеркавання пытанняў бізнесу і ўмацавання эканамічнага, інвестыцыйнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. У склад дзелавога савета ўвойдуць кіраўнікі кампаній Беларусі і Рэспублікі Карэя, якія маюць паспяховы вопыт узаемадзеяння і ўносяць уклад у пашырэнне двухбаковых дзелавых і эканамічных адносін, а таксама прадпрыемствы, зацікаўленыя ў рэалізацыі сумесных праектаў у найбольш перспектыўных сферах. Старшынямі савета будуць кіраўнікі БелГПП і KITA.

У інаўгурацыйнай сесіі Беларуска-карэйскага савета дзелавога супрацоўніцтва прынялі ўдзел старшыня БелГПП Уладзімір Улаховіч, старшыня KITA Кім Енг Джу, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Рэспубліцы Карэя Андрэй Папкоў, прадстаўнікі Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі, адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій, адміністрацыі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», Міністэрства замежных спраў Беларусі, Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Мінэканомікі, Карэйскага інстытута міжнароднай эканамічнай палітыкі.

# ГРУНТОЎНАЯ РАЗМОВА ПРА ВАЖНАЕ

**Зносіны ў фармаце прамога дыялогу з медыясупольнасцю і экспертамі Прэзідэнт Беларусі практыкуе даволі часта. З аднаго боку, гэта магчымасць у сканцэнтраваным выглядзе пачуць аб настроях і праблемах грамадзян. А з другога — выдатны спосаб напрамую і аператыўна данесці да максімальна шырокай аўдыторыі пазіцыю дзяржавы на тую ці іншую сітуацыю. Цяперашняя вялікая размова з Прэзідэнтам стала самай працяглай у шэрагу падобных фарматаў. Гутарка ішла вакол падзей, так ці інакш звязаных з леташнімі выбарамі ў краіне, пандэміяй і глабальнымі тэндэнцыямі ў палітычнай і эканамічнай сферах. Прамую трансляцыю гэтага мерапрыемства вялі каля дваццаці інфармацыйных рэсурсаў Беларусі, Расіі і Украіны, у тым ліку і на англійскай мове. Абмяняцца думкамі, выказаць ініцыятывы, пачуць пункт гледжання Аляксандра Лукашэнкі сабраліся ў Палацы Незалежнасці каля трохсот чалавек, у тым ліку беларускія журналісты, прадстаўнікі заходніх СМІ, блогеры, навукоўцы, грамадскія дзеячы, палітолагі, дэпутаты. Прэзідэнт як заўсёды адказваў на пытанні адкрыта і эмацыйна. Закрытых тэм для абмеркавання не было. Абнаўленне Канстытуцыі, праца эканомікі, адносіны Беларусі з суседзямі, адказ на санкцыйную палітыку, сітуацыя на мяжы з Літвой і яшчэ дзясяткі найважнейшых пытанняў. Грунтоўная размова пра важнае для дзяржавы і народа доўжылася больш за восем гадзін.**

— Прыйшоў час Вялікай размовы, — з гэтых слоў пачаў сустрэчу Прэзідэнт. І працягнуў, патлумачыўшы сітуацыю:

— Сёння Беларусь апынулася ў фокусе ўвагі ўсяго свету. Як і чаму, вы гэта ведаеце не горш за мяне. Заўважу толькі, што не па сваёй волі. Мы пражылі няпросты год.

Па словах Прэзідэнта, многае з таго, што адбывалася ў апошні час у Беларусі, было ў большай ступені свядома скажона, нават перавернута з ног на галаву:

— Дзіўна, але часам нават вядомыя сусветныя сродкі масавай інфармацыі наводзяць цень на абсалютна відавочныя рэчы. Таму сёння патрэбная гэтая размова ў прамым эфіры, адкрытая, вочы ў вочы і без купюр.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў сучасным свеце месца дэмакратыі даўно заняў лічбавы дыктат:

— І кіруюць у гэтым свеце адкрытыя хлусня, хайп, хейт, булінг, тролінг, боты і іншыя камунікатыўныя навацыі. Сёння яны ствараюць негатыўны эмацыйны фон у грамадстве, або, як вы кажаце, інфармацыйны шум. Самае сумнае, што гэты штучны віртуальны свет уплывае на прыняцце рэальных фундаментальных палітычных рашэнняў на міжнароднай арэне.

Прэзідэнт падкрэсліў:

— Мы прайшлі сур'ёзнае выпрабаванне на нацыянальнае адзінства. Ведаем, у нас ёсць усё для таго, каб гэты перыяд сваёй найноўшай гісторыі прайсці годна. Ёсць народ — адукаваны, адданы інтарэсам суверэннай Беларусі. Ёсць усеагульнае разуменне, што ў сферы нацыянальных інтарэсаў мы ўсе глядзім у адным кірунку — дзяржаўным.

### Адносна Новай Канстытуцыі

Завяршыўся першы этап працы Канстытуцыйнай камісіі. На яе адрас паступіла вялікая колькасць прапаноў па ўдасканаленні Асноўнага Закона. Кіраўнік дзяржавы заўважыў:

— На пераменах настойвалі многія. І тады ўсе ўспрынялі змены ў Канстытуцыі як першы, самы галоўны і асноўны крок да гэтых пераменаў. Гэта значыць на падставе законаў, усё астатняе было б хаосам і беззаконнем.

— Нам хаваць няма чаго, мы павінны правесці рэферэндум па Канстытуцыі адкрыта, шчыра, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што канчатковы праект новай Канстытуцыі будзе папярэдне апублікаваны, каб грамадзяне змаглі азнаёміцца з прапанаванымі зменамі. Адказваючы на прапанову зрабіць нацыянальнае заканадаўства прыярытэтным адносна міжнароднага, Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што вернецца да гэтага пытання крыху пазней — калі будзе гатовы праект новай Канстытуцыі Беларусі:

— Вопыт ёсць — Расійская Федэрацыя. Таму, думаю, разам са старэй-




БЕЛТА

шым братам нам будзе лягчэй пераадолець і крытыку, і навалы розныя. МЗС, урад працуюць: трэба заўсёды ўзважваць, што мы ад гэтага атрымаем і што можам страціць. Але я асабіста на дадзены момант, зыходзячы з той інфармацыі, якая ў мяне ёсць, бліжэй да вашай прапановы (зрабіць нацыянальнае заканадаўства прыярытэтным. — Заўв. рэд.).

Прэзідэнт Беларусі растлумачыў, чаму менавіта цяпер так важная тэма абнаўлення Асноўнага Закона краіны:

— Нельга гэтую Канстытуцыю, якая ёсць (яна сапраўды вельмі аўтарытарная), перадаць таму прэзідэнту, які прыйдзе. Таму што мы не ведаем, хто ён ямшчэ будзе і як ён сябе павядзе. З гэтага ж усё пачалося: патрэбна новая Канстытуцыя, таму што "а раптам". Вось узялі б уладу з гэтай Канстытуцыяй — і ніхто б не варухнуўся. Таму так, трэба збалансаваць і частку паўнамоцтваў стратэгічнага характару перадаць Усебеларускаму народнаму сходу.

Прэзідэнт прызнаўся, што нядаўна якраз пераасэнсоўваў для сябе гэтае пытанне: чым будзе займацца УНС? Напрыклад, вызначаць стратэгію на будучыню, кантраляваць нейкія глабальныя пытанні. Прычым, магчыма, гэта будзе толькі часовая мера да таго часу, пакуль "усё не ўстаканіцца ў краіне":

— Пытанне ў тым, якімі паўнамоцтвамі мы надзелім Усебеларускі народны сход. Вось тут я пакуль не ведаю. І ўпэўнены, што мы з вамі знойдзем, якія паўнамоцтвы туды перадаць. Але перадаваць будзем толькі ў інтарэсах беларускай дзяржавы, у гэтым я кроўна зацікаўлены. Каб, калі пайду як першы прэзідэнт, гэта дзяржава не паваліліся.

Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, ці варта ў праекце новай Канстытуцыі прапісваць згадку пра нейтралітэт краіны:

— Што тычыцца нейтралітэту, гэта не абмяркоўваецца. Гэтае рашэнне Усебеларускага народнага сходу — тады ўсё бурна падтрымалі. Нейтралітэту няма фактычна. Па Канстытуцыі — нейтралітэт, а мы знаходзімся ў ваенна-палітычным блоку АДКБ і гэтак далей. Правільна гэта ці не — вядома, правільна. Гэта дадатковы ўзровень бяспекі.

Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь таксама знаходзіцца ў Еўразійскім эканамічным саюзе:

— Аб якім нейтралітэце можа ісці гаворка? Таму тут два варыянты: або мы вызначаем у Канстытуцыі, што мы не нейтральныя, альбо ўвогуле туды нічога не запісваем.

### Эканамічны рост і барацьба з пандэміяй

Падчас пандэміі зрабілі правільны выбар — не закрываць краіну і не спыняць эканоміку, нагадаў Кіраўнік дзяржавы:

— Мы не ашалелі і не ўвялі каменданцкую гадзіну, як ад нас патрабавалі, вы гэта памятаеце. Адзіная краіна і адзіны прэзідэнт, ён жа дык-


БЕЛТА

візіту спецыялісты СААЗ, хай і непублічна, але паміж сабой прызнавалі: пра тое, як арганізавана меддапамога ў Беларусі, трэба гаварыць на Захадзе, каб пра гэта чулі тыя, хто крытыкуе Прэзідэнта, таму што ўзровень лячэння і бяспекі па барацьбе з ковідам у Беларусі — беспрэцэдэнтны.

— Мы адмовіліся ад лакдаўна, нас білі, малацілі, як толькі хацелі, нас крытыкавалі ўсе, толькі лянівы не крытыкаваў за нашы падыходы, — нагадаў беларускі лідар. — Вы можаце сказаць: у чым розніца? Розніца, паважаныя сябры, у адносінах да людзей. "Дыктатар" прыстойна паставіў задачу перад органамі ўлады і прыстойна, прабачце за нясціпласць, ставіўся да людзей, без усялякага піяру.

Асновай стабільнага развіцця беларускай эканомікі ў першым паўгоддзі Прэзідэнт лічыць менавіта тое, што не спынілі эканоміку:

— Не загналі людзей у чатыры сцяны, калі мы выпрацавалі выразны падыход да лячэння людзей — амбулаторны, клінічны і санаторны этапы. Назавіце хоць адну багатую дзяржаву, якая пайшла гэтым шляхам? А гэта немалыя грошы. Але людзі даражэй.

татар, запрасіў прадстаўнікоў СААЗ, адчыніў дзверы ўсіх устаноў аховы здароўя.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што летась падзенне сусветнага ВУП у асобных, у тым ліку вядучых, краінах было каласальным:

— Мы, па-мойму, 0,1 або 0,2 працэнта ўсяго толькі страцілі ў мінулым годзе да папярэдняга. То бок, у нас у мінулым годзе быў вельмі высокі ўзровень. І да гэтага высокага ўзроўню мы сёння прыраслі — прыкладна 3,5 працэнта. Для нас гэта добрыя паказчыкі. Зразумела: усё, што адбываецца, шмат у чым абумоўлена знешнімі і ўнутранымі фактарамі. На знешніх рынках цэны на прадукты, на іншыя віды тавараў выраслі значна. А паколькі мы не зачыніліся ў мінулым годзе, у нас дастаткова было тавару, каб на рынку прапанаваць да гэтага попыту наш тавар па высокіх коштах. Таму мы атрымалі добры вынік. У тым ліку і ў плане знешняга сальда плацежнага балансу. Яно ў нас станоўчае.

Прэзідэнт адзначыў высокі попыт на беларускую прадукцыю:

— Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Ва ўсім свеце, асабліва ў нашай брацкай Расіі, на постсавецкай прасторы, ва Украіне і гэтак далей, людзі яшчэ раз убачылі беларускую прадукцыю. Асабліва прадукты харчавання. Мы нагандлявалі за паўгода каля трох мільярдаў долараў на прадуктах харчавання і плануем сёлета перасягнуць шэсць мільярдаў. Але гэта не галоўны наш тавар. Гэта значыць, у нас было што пры дэфіцыце прапанаваць свету. І свет купіў. Ну, натуральна, рост аб'ёмаў.

Пры такім попыце нас проста выратаваў.

## Мінулагоднія выбары

Прэзідэнт прызнаў, што ён не надаваў увагі правядзенню агітацыйнай передвыбарнай кампаніі, таму што не гэта было ў прыярытэце ў той час. Паводле яго слоў, сітуацыя была добра адлюстравана ў нядаўнім пяцісерыйным дакументальным фільме "2020":

— Я не самаўхіліўся. У мяне не было для гэтага часу. Мне трэба было абараніць людзей, выратаваць іх. Бо ў той час, у адрозненне ад іншых дзяржаў, Беларусь не закрыла межы, не ўвяла каменданцкую гадзіну, хоць гэтага патрабавалі не проста палітыкі з-за мяжы, а спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. І тады яны былі запрошаныя прыехаць і асабіста ацаніць абстаноўку.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь адзіная пайшла на такі крок, дала экспертам СААЗ доступ ва ўстановы аховы здароўя. Па выніках гэтага

## Адносіны з Расіяй

Беларусь ніколі не была супраць цеснага саюза з Расіяй, але аснова любога саюза — гэта аднолькавыя ўмовы і раўнапраўе. На гэта звярнуў увагу Прэзідэнт:

— Вы нас заўсёды трымалі на адлегласці, і цяпер вы трымаеце нас на адлегласці. У Расіі больш нікога няма, можа, вам не падабаецца гэта, але факт ёсць факт. І нават цяпер, падчас пандэміі, хоць вы і зачыніліся ад нас, мы ад вас не зачыняліся.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для звычайных грамадзян дзвюх краін раўнапраўе шмат у чым забяспечана:

— Але як можна інтэгравацца і рабіць крокі, калі ў вас кошты на прыродны газ у два-тры разы ніжэй, чым у Беларусі? Намёкі ад некаторых асоб ідуць, каб разбурыць гэтую інтэграцыю, каб нас адштурхнуць ад Расіі з намёкам на тое, што інтэграцыю яны разумеюць як уваходжанне Беларусі ў склад Расіі. Вы для нас — родныя людзі, я заўсёды праводзіў гэтую палітыку. Пры гэтым мы — суверэнныя і незалежныя дзяржавы, нашы людзі

вельмі цэняць тое, што праз шмат стагоддзяў мы сталі суверэннымі і незалежнымі. І калі я чую гэтыя намёкі, што Беларусь увойдзе ў склад Расіі, я думаю: а ці патрэбны Расіі яшчэ адзін галаўны боль? Не, і Прэзідэнт Расіі так гэта і разумее.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, каб развіваць інтэграцыю, асабліва ў сферы эканомікі, "не трэба таго, каб кагосьці ўзяць і ўключыць у склад".

Прэзідэнт падсумаваў, што ў Беларусі ніхто супраць Саюза з Расіяй не выступаў, акрамя некаторых асоб, а падзеі мінулага года многае паказалі і падштурхнулі Беларусь і Расію да больш актыўнага супрацоўніцтва.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, ніякія краіны не маюць такога ўзаемадзеяння, як Беларусь і Расія, таму дзяржавы без цяжкасцяў змогуць сумесна пераадолець любыя санкцыі, якія ўводзяцца супраць іх.

## Саюзная дзяржава

"Інтэграцыйныя карты" былі перафарматаваны ў саюзныя праграмы. Усяго іх 28. І засталося нявырашаным адно пытанне, паведаміў Аляксандр Лукашэнка:

— Калі мы ў Саюзе, калі бачым перспектыву, трэба выраўноўваць цэны і там, і тут. Або, як у вас прынята казаць, у свабоднае плаванне адпусціць. Захацелі — мы купілі там прыродны газ, дапусцім у "Газпрама". Няма ў "Газпрама"? У іншай кампаніі — у вас іх шмат, якія здабываюць прыродны газ. Гэта значыць свабодным павінен быць гандаль гэтым таварам. Адсюль будуць кошты. Мы не просім нізкіх коштаў. Мы роўных коштаў хочам.

Прэзідэнт нагадаў, што адзіная эканамічная прастора, якую Беларусь і Расія выбудоўваюць, прадугледжвае роўныя ўмовы для ўсіх суб'ектаў гаспадарання, прадпрыемстваў і людзей — рынкавыя ўмовы:

— Мы згодныя на рынкавыя ўмовы, але ўмовы павінны быць роўнымі. Мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі, што мы пераадолеем розныя бар'еры і выраўнаваць гэтыя ўмовы... Мне хацелася б спадзявацца, аб чым мы з Прэзідэнтам (Пуціным. — Заўв. рэд.) дамаўляліся, што ў гэтым годзе, у канцы года, адбудзецца Вышэйшы дзяржаўны савет Саюзнай дзяржавы. І ён павінен быць этапны, там мы павінны прыняць вельмі сур'ёзныя рашэнні. Думаю, калі там расіяне ўжо вельмі пабаяцца па газе зрабіць нейкі крок па выраўнаўванню ўмоў, мы гэтыя 28 саюзных праграм (карты былі перапрацаваныя) прымем. Гэта будзе каласальны крок наперад.

## Рэакцыя на санкцыі

Гаворачы аб развіцці беларускай эканомікі ва ўмовах санкцыйнага ціску, Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што экспарт сапраўды важны для краіны, бо значныя аб'ёмы выраблена прадукцыі прызначаныя для пастаўкі на знешнія рынкі. Аднак рынкі Еўрапейскага саюза і ЗША, якія цяпер уводзяць санкцыі, для Беларусі, не з'яўляліся прыярытэтнымі, айчынную прадукцыю туды ніколі асабліва і не пускалі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама нагадаў, што Беларусь практычна ўвесь час знаходзілася пад уплывам тых ці іншых санкцый. Адзіны перыяд без іх — калі па прапанове лідараў Расіі і Германіі Уладзіміра Пуціна і Ангелы Меркель Мінск быў выбраны ў якасці месца правядзення перамоў у "нармандскім фармаце" па ўрэгуляванні крызісу на паўднёвым усходзе Украіны.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў:

— Вось тады паўстала нейкае акно магчымасцяў, мы сталі не нейкім пасярэднікам, а сталі пляцоўкай для гэтых мірных перамоваў. Тут, у Мінску, была спынена буйнамаштабная вайна на Данбасе. Так, там пастрэльваць і з аднаго, і з другога боку, як мяне інфармуюць, па меншай меры штотыдзень. Але там няма гэтай вайны, якая была пад Дэбальцава і ў данецкім аэрапорце, памятаеце гэтую мясарубку? Вось тады да нас паставіліся па-чалавечы і сказалі: так, Беларусь — гэта тое месца, куды трэба ехаць.

Перш чым уводзіць у дачыненні да Беларусі санкцыйныя меры, трэба проста думаць, заявіў Аляксандр Лукашэнка:

— Не хватаць тое, што нашы "пратэстуны", збеглыя там з гэтых асноўных цэнтраў. Хватаюць, мы гэта бачым па тэксце. Чытаем іх тэкст, і потым тое, што прымаюць у Еўрасаюзе і Амерыцы, — адзін у адзін з памылкамі. У мяне ёсць табліца, я папрасіў — за што пакаралі БЕЛАЗ, за што пакаралі калектыў МАЗа і гэтак далей. І там, ну проста смешныя і вельмі цікавыя абгрунтаванні і матывацыя гэтых санкцый. Яны нават тут не могуць скласці нармальную матывацыю — за што.

Беларускі лідар паставіў задачу — вытрымаць узровень працы эканомікі. Вядома, будзе няпроста:

— Дарэчы, пасля "печенек" гэтых амерыканцы вырашылі ўвесці нейкія санкцыі. Магу папярэдзіць, паколькі ведаю: тут ёсць прадстаўнікі СМІ. Вы не думайце, што вось гэты шум, у тым ліку інфашум, — гэта ўсё ў адносінах Беларусі з ЗША, Беларусі з Еўрасаюзам, Польшчай і гэтак далей. Ды не, гэта шум там, наверсе. Але ёсць узроўні, на якіх мы вядзем з імі дыялог, перамовы, і ніколі ён не спыняўся. З палякамі (з літоўцамі наогул цяпер ніякіх кантактаў, але мы гэта перажывем), Еўрасаюзам, з амерыканцамі ў нас ёсць актуальная тэма, па якой

БЕЛТА


мы заўсёды адказна вядзем перамовы. Напрыклад, ЗША. Яны адкрыта казалі, што вельмі шанавалі нашу працу па барацьбе з кантрабандай і перамяшчэннем радыёактыўных матэрыялаў — 5 або 6 выпадкаў толькі ў мінулым годзе. Гэта яны шанавалі, як і ўвесь свет. І Расія гэта шануе, і Кітай. Але каму, прабачце мяне, патрэбна нейкая брудная выбухоўка, якая ідзе ў Еўрапейскі саюз? Для амерыканцаў гэта пытанне пытанняў. Мы за гэта іх шанавалі, разам працавалі. Мы і цяпер працягваем працаваць, але я іх папярэдзіў: калі яны пяройдуць ужо занадта моцна чырвоную рысу, мы з імі наогул і на гэтую тэму размаўляць не будзем. Да чаго гэта можа прывесці? Прыклад — нелегальная міграцыя.


БЕЛТА

### Адносіны з Украінай

Звяртаючыся да тэматыкі двухбаковых адносін з Украінай, Аляксандр Лукашэнка адзначыў:

— Палітычныя стасункі на вельмі нізкім узроўні, і чырвоная рыса пяройдзеная тады, калі Еўразвяз яшчэ не спыніў авіязносіны з намі, а Украіна гэта зрабіла. За што? Няўжо да такой мярзоты можна дайсці, каб, прабачце мяне, "пахерыць" усё, што было да гэтага часу, усё тое, што мы рабілі і зрабілі для Украіны?

Прэзідэнт заявіў аб датычнасці афіцыйных органаў улады Украіны да перакідання зброі ў Беларусь. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што заўсёды падтрымліваў Украіну і ўкраінскія ўлады і нават разумее, чаму яны ва ўгоду Захаду робяць недружалюбныя крокі ў адносінах да Беларусі:

— Добра, пабег за Захадам (прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі. — Заўв. рэд.), плюнуў на ўсё, але навошта ты баевікоў рыхтуеш на тэрыторыі Украіны і зброю закідваеш да нас сюды? Бо зброя ідзе ў асноўным з Украіны. Цяпер мы, вядома, зачынілі намёртва гэтую мяжу. Навошта вы гэта чыніце, бо народы — гэта ж суседзі, гэта ж родныя людзі.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў беларускіх СМІ неаднаразова паказвалі, як з Украіны ў Беларусь перакідваюць выбухоўку і боепрыпасы:

— Наш старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі вельмі выразна сказаў: мы бачым, хто з сілавікоў і афіцыйных органаў улады ва Украіне гэта арганізоўвае.

Менш за ўсё ва Украіне варта баяцца беларусаў, якія ніколі не зробяць поскудзі, калі з поўдня першымі не ступяць са зброяй на нашу зямлю, падкрэсліў беларускі лідар:

— Украінцы — працавітыя, прыгожыя людзі. Мы гатовыя з вамі размаўляць, мы гатовыя з вамі дамаўляцца.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што ва Украіне, Літве, Латвіі і Расіі дзейнічаюць беларускія санаторыі:

— Я ў іх грошы ўкладваў для таго, каб туды ехалі людзі — мясцовыя, нашы. У нас велізарная колькасць турыстаў. Вы закрылі авіязносіны ў Адэсу — каму вы горш зрабілі? Нашы пераарыентаваліся на Краснадарскі край, лётаюць у Турцыю — "Белавія" робіць трохі дугу. Турцыю мы не зачынялі, а маглі б увогуле не прымаць самалёты праз Украіну. Але яны лётаюць. Як вы мне прапануеце дастаўляць людзей на адпачынак? У нас іншага шляху няма — толькі праз Ра-сію. Польшча нам таксама забараніла. Таму не трэба мне цяпер ставіць умовы. Вы зрабілі ўсё і праклалі мне маршрут у Крым.

### Пастаўкі электраэнергіі і санкцыі ў адка

У Беларусі ёсць рэзервовыя магутнасці, каб пастаўляць электраэнергію Украіне, паведаміў Аляксандр Лукашэнка. А адносна верагодных адказных санкцый супраць паўднёвай суседкі Прэзідэнт сказаў так:

— З нашага боку ніякіх санкцый у дачыненні да вас уводзіць не збіраемся. Калі б хацелі вас паставіць на калені, будзем адкрытыя, мы б гэта зрабілі на працягу сутак разам з нялюбым вамі прэзідэнтам Пуціным, перастаўшы пастаўляць вам гаручазмазачныя матэрыялы. Як вядома, 35 працэнтаў ГЗМ пастаўляе ў Беларусь ва Украіну, да 40 працэнтаў — Расія. Што тычыцца паставак электраэнергіі, то, калі ласка, хоць з заўтрашняга дня. У нас ёсць рэзервовыя магутнасці. Асабліва ў гэты перыяд, не зімовы. І мы цяпер масава пераходзім дзе толькі можна на электрычнасць, пачынаючы ад жылля, электрамабіляў і г. д. Мы будуем электрычныя дамы, выдаткі на абслугоўванне якіх нават крыху менш, чым на прыродным газе.

### Недапушчальнасць сілавога рашэння

Пры гэтым Прэзідэнт перасцярог Украіну ад магчымай спробы сілай вырашыць пытанне ў Данбасе:

— Калі вы гэта зробіце пры падтрымцы трэціх краін, я ніколі не буду на вашым баку. Калі вы зноў з Расіяй у Данбасе сутыкнецеся, я буду паміж вамі. Гэта даўно занятая мною пазіцыя. Нават калі гэта будзе пагражаць майму жыццю. Але я ўпэўнены, што ні першы, ні другі варыянт нерэальны. Яго не будзе. Таму што разумных галоў ва Украіне дастаткова. Якая б у вас ні была армія, любая ваша спроба



БЕЛТА

сілай вырашыць пытанне скончыцца трагедыяй для Украіны. Я вас прашу, малю: выкіньце гэта з галавы. Ні ў якім выпадку не спрабуйце вырашаць гэтае пытанне сілавым чынам.

Прэзідэнт заўважыў, што любая вайна заканчваецца мірам і за сталом перамоў:

— Калісьці з чагосьці трэба пачынаць. Вы можаце сказаць: Зяленскі столькі разоў прапаноўваў Пуціну тое ці гэта. З боку Уладзіміра гэта па меншай меры трапятанне. Ён проста неспрактыкаваны чалавек.

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што трэба сесці за стол і дамовіцца, пры гэтым Украіне неабходна падзяляць пытанне Данбаса і Крыма — гэта "дзве розныя гісторыі".

Кажучы пра данбаскае пытанне, беларускі Прэзідэнт заўважыў, што Зяленскаму як кіраўніку дзяржавы варта было б вырашаць яго:

— Хтосьці так думае, хтосьці — гэтак. Але як толькі Данбас будзе ўкраінскім, усе будуць думаць аднолькава: ты вярнуў тэрыторыю, ты выратаваў людзей.

Уладзіміру Зяленскаму варта выконваць тое, што ён абяцаў падчас перадвыбарнай кампаніі, упэўнены беларускі лідар:

— Многае паабяцаў: вайны не бу-дзе і іншае. Так памры, але зрабі. Сядзь у верталёт і ляці ў Данецк, Луганск. Калі б Валодзя Зяленскі туды прыляцеў, і ва Украіне б апладзіравалі, і на Данбасе, і ў Луганску. І тым самым ён бы паставіў і мяне, і прэзідэнта Расіі, каго заўгодна ў такое становішча, што нельга было б адмовіцца рухацца насустрач. Таму што гэта быў бы крок. А вам не даюць гэта зрабіць, мне здаецца. І не дадуць.

Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў, што ў Данбасе трэба было правесці мясцовыя выбары. Прэзідэнт лічыць, што ў Уладзіміра Зяленскага быў шанец стаць міратворцам ва Украіне і сур'ёзна прасунуцца ў урэгуляванні канфлікту ў Данбасе. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, папярэдні прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка праваліў мінскія дамоўленасці, таму што быў кіруемы звонку.

### Адносіны з Літвой

Беларусь гатовая весці дыялог з Літвой, але без усялякіх папярэдніх умоў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Літва заўсёды жылі і будуць жыць як суседзі — мірна і дружна:

— Але калі — залежыць сёння ад нас. Нядаўна такі "брудны прамень" прамільгнуў: хай Лукашэнка зробіць тое і тое, і тады мы будзем пра нешта казаць. Вы мне ўмовы не стаўце. Вы не маеце на гэта права. Я не год і не пяць гадоў ва ўладзе. Я не хаваў у Беларусі ні баевікоў, ні апазіцыянераў — яны таксама ў вас у Літве ёсць, я ніколі гэтага не рабіў. Я не рабіў недружалюбных крокаў у дачыненні да Літвы. Калі вы хочаце, давайце пачнем на нейкім узроўні весці дыялог. Але без усялякіх папярэдніх умоў. Таму што Беларусь не заслугоўвае вось такой размовы.

Адказваючы на пытанне журналіста тэлеканала "Беларусь 1" аб тым, ці гатовая краіна сёння вярнуць Літве бумерангам тое, што было зроблена супраць Беларусі, Прэзідэнт сказаў:

— Гэта жорстка. Калі мы вернем бумерангам (гэта было б справядліва), то тады чым мы ад іх будзем адрозніваюцца? Мы будзем такімі ж, як яны. Таму не варта. Калі б мы гэтым "непаседам" — гэта адно, але любы бумеранг абернецца супраць звычайных латышоў і літоўцаў, якія хочуць з намі жыць і сябраваць. Справядліва, жорстка, але не трэба.

### Адносіны з ЗША

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся даць інтэрв'ю амерыканскаму тэлеканалу CNN, прадстаўніца якога прысутнічала на вялікай размове з Прэзідэнтам:

— Я не выключаю гэтага. Пры адной умове: калі вы дасце усё, што я скажу, не выразаючы, не дадаючы. Вось на гэтых умовах дамовіцеся з прэс-сакратаром.

Аляксандр Лукашэнка таксама прапанаваў журналістам CNN, якія нядаўна выпусцілі фэйкавы сюжэт аб наяўнасці пад Мінскам лагера для палітвязняў, пабываць у гэтым раёне і паглядзець, што там знаходзіцца на самай справе. А размяшчаецца там звычайная вайсковая часць, з якой амерыканскія журналісты чамусьці зрабілі месца пазбаўлення волі. Фэйк быў выкрыты ў эфіры беларускіх тэлеканалаў.

У размове з журналістам CNN Кіраўнік дзяржавы адхіліў папрокі ў рэпрэсіях:

— Мне з амерыканцамі зусім проста казаць. Скажыце, калі ласка, пытанне рытарычнае (я адказваю на ваша пытанне): вы (ЗША — Заўв. рэд.) навошта застрэлілі дзяўчыну ў Кангрэсе, якая была ўдзельніцай войнаў у абарону Злучаных Штатаў Амерыкі і іх інтарэсаў? Пасля гэтага пытанне аб рэпрэсіях у дачыненні да насельніцтва з майго боку проста цямнее. Вы прывыклі да таго, што вы гегемоны ў свеце — вам усё дазволена. Колькі чалавек вы пасадзілі пасля падзей ля

Кангрэса? Калі вы законна абранага прэзідэнта (я маю на ўвазе Трампа) растапталі, прыбралі яго са сродкаў масавай інфармацыі. Гэта што, было законна?

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў час прэзідэнцкіх выбараў у ЗША грамадзяне галасавалі па пошце, але бюлетэні выкінулі ў смецце. Былі і іншыя шматлікія парушэнні. У той жа час Прэзідэнт заўважыў, што, калі б у Беларусі галасавалі па пошце, краіну б парвалі на кавалачкі:

— Вам — можна. Вы творыце беззаконне ва ўсіх месцах свету і мне гаворыце аб нейкіх рэпрэсіях. З майго боку не было ніякіх рэпрэсій. Я прыняў правілы гульні тых бандытаў, якія пад кіраўніцтвам амерыканскіх спецслужбаў рушылі да нас у суверэнную і незалежную дзяржаву. Я — Прэзідэнт, па Канстытуцыі абавязаны абараніць гэтую дзяржаву. Што я і зрабіў. Якія ж тут рэпрэсіі? Я кагосьці застрэліў, кагосьці забіў?

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што праціўнікі беларускай дзяржавы цяпер спрабуюць падвесці яго да міжнароднага трыбуналу, але ім не было за што зачапіцца.

Адказваючы на пытанне пра інцыдэнт з самалётам RyanAir, Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь адкрытая для міжнароднага расследавання:

— Чаго ж вы не прыехалі расследаваць? Факты на стол. Прыязджайце, дакажыце, што Лукашэнка пасадзіў гэты самалёт. А вы не едзеце расследаваць, таму што ўсе факты ў вас на руках і вы бачыце: не б'е, не атрымліваецца...

Прэзідэнт упэўнены, што ЗША абыякавыя да Беларусі:

— Вы далёка, і вам пофіг, што адбываецца ў гэтай Беларусі. Вы нават не ведаеце, дзе яна размешчана. І вы нават праз дзесяць хвілін забыліся, каго кармілі "пячэнькамі". Вы проста карыстаецеся сваім манапольным правам друкаваць замежную валюту і кантраляваць яе ход. І карыстаецеся тым, што ў выніку падзей у Еўропе, Азіі на гэтым падняліся, стварылі магутную імперыю, якая паволі коціцца ўніз, дзякуючы вашай незразумелай палітыцы.

Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што беларусам з амерыканцамі пакуль яшчэ цяжка цягацца. Гаворачы аб чырвоных лініях у адносінах з Беларуссю, якія замежным дзяржавам лепш не пераходзіць, Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не меў на ўвазе Злучаныя Штаты Амерыкі:

— Я не магу сказаць, што гэта я намаляваў чырвоную рысу для Амерыкі. Мне вельмі складана з беларускім патэнцыялам і са сваімі магчымасцямі намаляваць гэтую чырвоную рысу.

> **"Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні дарог. Калі б мы падчас "пратэстаў" праявілі слабіну, нас бы паласавалі. У выніку пачалася б новая сусветная вайна"**

### Наступны прэзідэнт і выбары

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што хто і калі будзе прэзідэнтам Беларусі пасля Яго — няпростае пытанне:

— Каго беларускі народ абярэ, той і будзе прэзідэнтам, гэта сапраўды так. Якую пазіцыю пры гэтым буду займаць — я не вызначыўся.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што думае аб гэтым:

— Гэта натуральна. Гэта ж не вечная пасада. Я чалавек. І часам проста хачу спакойна пажыць, але потым пачынаю паглыбляцца ў разважанні і думаю, што спакойнага жыцця ў мяне ўжо не будзе. Таму што такая праца.

Прэзідэнт прызнаўся, што ў чымсьці нават зайздросціў экс-прэзідэнту Украіны Леаніду Кучме:

— Пры сустрэчы пытаюся ў яго, як ён сябе адчувае. Кажа, выдатна. І бачу, што сапраўды выдатна. Пачынаю абдумваць і бачу, што я так не змагу. Я проста ўрос у гэтую краіну, а яна ў мяне. І не разумею, як можна жыць і, пайшоўшы на пенсію, займацца якойнебудзь іншай справай. Я гэта пакуль не ўяўляю.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пасля яго прыйдуць людзі:

— Не трэба гадаць, калі сыдзе Лукашэнка і гэтак далей.

Ён заўважыў, што ніколі нельга быць дакладным, нават называючы канкрэтныя тэрміны. Як прыклад прывёў гучныя планы апазіцыі з нагоды "Дня волі".

Таксама Прэзідэнт выказаў сваё меркаванне адносна альтэрнатыўнага зыходу выбараў:

— Мне казалі, вось вы не вылучаеце сваю кандыдатуру, а раптам абяруць прэзідэнтам кагосьці? Я ўсё зраблю, каб было аб'ектыўна. І калі абяруць з іншай кагорты, значыць, наш народ павінен перажыць тое, што перажыла Грузія, Украіна. Раз на чужых памылках не навучыўся, значыць, павінен гэты этап прайсці.

На пытанне аб тым, хто будзе наступным прэзідэнтам Беларусі, кіраўнік дзяржавы адказаў — той, каго абярэ народ:

— Ён не можа з'явіцца з ніадкуль. Калі мяне выбіралі, часы былі іншыя, тады рызыкнулі. Цяпер людзі думаюць інакш.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што на наступных выбарах у Беларусі абавязкова пераможа прагматычны нармальны чалавек.

### Пра "рэпрэсіі"

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

— Ніякіх рэпрэсій не было. І не будзе ў маёй краіне ніякіх рэпрэсій. Таму што мне гэта не трэба, мне гэта на шкоду. Я не страляў сабе ў нагу, а тым больш у галаву. Разгарнуць рэпрэсіі ў Беларусі — гэта самога сябе застрэліць.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што ніколі не пяройдзе "гэтую рысу і гэты бар'ер".

Прэзідэнт падкрэсліў, што леташнія масавыя акцыі ў краіне не былі мірнымі і гэта планавалася першапачаткова:

— Якія гэта мірныя акцыі — выбухі, петарды і іншае? Яно ж відаць, адкуль ляцелі. Скажаце, што гэта ў

адказ на "жорсткасць"? Ды не, яны прынеслі іх туды. Яшчэ гэтай "жорсткасці" не было, сутыкненняў. А яны з гэтымі боепрыпасамі туды прыйшлі. Завострыванні, нажы, іншая выбухоўка. Яны навошта гэта туды прынеслі, на мірныя акцыі? Таму мірнымі акцыямі там не пахла.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі на такія падзеі адрэагавалі значна мякчэй, чым, напрыклад, у ЗША:

— Колькі зняволеных па Вашынгтонскай справе, калі там хацелі зладзіць пераварот, цяпер знаходзяцца пад следствам і ў турмах, не назавеце? Вы не ведаеце. А ў Беларусі вам любы журналіст скажа: мінімум паўтысячы пакутуе ў турмах, яны там па законе сядзяць. Не справа была ўрывацца ў парламент ЗША, уварваліся — атрымалі. Вы за што хочаце нас пакараць? За тое, што мы абараніліся, не страляючы агнястрэльнай зброяй у галаву жанчынам? Не трэба. Што тычыцца мірных акцый, мы бачылі, якія яны мірныя. Мы вам пакажам кадры, як заязджалі з тылу і ламалі амапаўцаў і іншых, калі людзі сядзелі з разбітымі тварамі і ляжалі ў бальніцах. За два дні 11 сур'ёзных траўмаў атрымалі супрацоўнікі міліцыі. Мы бачылі, як рабілі гэта ачумелыя. Паглядзіце гэтыя кадры ў інтэрнэце. Скажыце, мы развязалі гэтую бойню? Мне патрэбна была вайна? Мне, наадварот, на карысць было, каб было ціха.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што несанкцыянаваныя акцыі спансіраваліся Захадам.

### Пра фэйкі

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў заявы аб катаваннях у ІЧУ на вуліцы Акрэсціна ў Мінску ў 2020 годзе:

— Адказваю пра катаванні на Акрэсціна. Гэта фэйк. Гэта няпраўда. Слухайце, навошта іх катаваць? Там жа следства не вялі. Навошта катаваць там людзей? А калі там нехта і быў з сінякамі, дык яны атрымалі іх на вуліцы, калі рынуліся на ўнутраныя войскі і АМАП. А іх ужо потым затрымлівалі. У гэтым будынку, у памяшканні на Акрэсціна, не было такой неабходнасці. Ніякіх там катаванняў не было. Гэта вы ўсё прыдумалі, таму што трэба было прыдумаць.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

— Калі знесці цяпер Прэзідэнта — у Беларусі будзе бяда. Можа, нават Беларусі не будзе. Але ў вас гэта не атрымаецца. Таму супакойцеся. А санкцыі ўвадзіце. Пажывём — пабачым, да чаго гэта прывядзе. Трэба супакоіцца, узяць галаву ў рукі і падумаць, як нам выходзіць з гэтай сітуацыі. Вы ж развяжаце Трэцюю сусветную вайну. Вы што, да гэтага штурхаеце нас з расіянамі? Вы хочаце перамагчы ў гэтай вайне? Не будзе пераможцаў. А калі і будуць — то не вы. Давайце сядзем за стол перамоваў і пачнем казаць пра тое, як выйсці з гэтага становішча, таму што ўгразлі настолькі, што зваротнага шляху не будзе. Гэта мая вам парада.

Падчас пратэстнага перыяду Беларусі ўдалося прадухіліць пачатак новай сусветнай вайны, звярнуў увагу Прэзідэнт:

— Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні дарог. Калі б мы падчас "пратэстаў" праявілі слабіну, нас бы паласавалі. У выніку пачалася б новая сусветная вайна. Я разумею, што на другім баку штыкі точаць, таму падняў войска, вывеў "Паланэз". Адна мая каманда — і мы б нанеслі ўдар, але яны не перайшлі рысу. Калі б адбылося інакш, Расія б ніколі не адступіла і не страціла Беларусь. Пачалася б завіруха, а гэта ядзерная дзяржава. Вось ад чаго мы тады сышлі.

### Адносіны з Польшчай

Прэзідэнт Беларусі выказаўся за наладжванне нармальных адносін з Польшчай. Адказваючы на пытанне журналісткі польскай газеты, што гатовы Аляксандр Лукашэнка зрабіць для паляпшэння беларуска-польскіх адносін, Прэзідэнт сказаў:

— Я ўсё рабіў, каб у нас былі добрыя адносіны з Польшчай. Вы вырашылі, што будзе па-іншаму, узялі пад казырок і ўсё, што вам ЦРУ сказала, зрабілі. Таму вы думайце, што рабіць. Я гатовы на ўсё, я маю на ўвазе на любыя размовы, і яны ідуць.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нават цяпер працягваюцца кантакты з прадстаўнікамі Польшчы на розных узроўнях, у прыватнасці, абмяркоўваюцца пытанні гуманітарнага характару:

— Мы негалосна гэты дыялог вядзем. І бачым, што кіраўніцтва Польшчы зразумела, у якое балота яны ўлезлі, ну і мы там з імі сядзім. Паколькі мы, напэўна, не зусім дурныя людзі — і палякі, і беларусы, — нам трэба выбудоўваць нармальныя адносіны.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ёсць прыклады, калі прадстаўнікі Польшчы выбудоўваюць паспяховы бізнес у Беларусі і гатовыя працягваць сваю справу, укладваць інвестыцыі:

— Чаго мы будзем з бізнесам ваявацьці з палякамі? Навошта? Гэта ж нармальныя людзі, з якімі нам жыць.

У той жа час ён звярнуў увагу на крывадушныя заявы асобных польскіх палітыкаў і ў прыватнасці Анджэя Дуды, які заклапоціўся вынікамі выбараў у Беларусі, хоць сам прыйшоў да ўлады з мінімальнай разбежкай пры падліку галасоў:

— Не вам лезці ў наш агарод! Ну сказалі два словы і хопіць, разумеючы, што нам жа жыць разам. І там,



БЕЛТА

у Амерыцы, ацэняць (усё ж такі два словы сказалі), і тут не будуць супраць вас. Трэба ж гнуткую палітыку праводзіць. Лёс наш такі — і Польшча, і мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы, на скрыжаванні многіх інтарэсаў. Не, палезлі ў бутэльку. Чаго вы лезеце? Што, вы нас на калені паставіце? Ніколі ў жыцці. Таму давайце шукаць нармальныя адносіны. І яны ведаюць, што трэба.

Аднак шлях да дыялогу праз выстаўленне папярэдніх умоў немагчымы, перакананы Прэзідэнт:

— Не тая сітуацыя, каб мне высоўваць нейкія ўмовы. Знойдзем мы агульную мову, таму што нам ад гэтага нікуды не падзецца.

**"Вы багатыя, вы можаце заплаціць CNN і іншым грошы — і яны будуць бразгаць языком. Спыніцеся нарэшце! Бо лепш жыць у міры. Паглядзіце, якая прырода, якая прыгажосць у той жа Вялікабрытаніі! Так, загадзілі вы Заходнюю Еўропу, але не зусім. Ёсць добрыя месцы, ёсць горы. Навошта вы раздзяляльныя лініі ўносіце праз столькі гадоў? "**

### Дзень народнага адзінства

Таксама падчас Вялікай размовы Прэзідэнт распавёў, чаму вырашыў не аб'яўляць выхадным днём 17 верасня:

— Па Канстытуцыі Прэзідэнт вызначае — святочныя, выхадныя дні. Але давайце шчыра: я праехаў шмат краін — столькі выхадных, як у нас, няма нідзе. І ў Расіі таксама: вы там як пачынаеце з Новага года — бяда для нас.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэтае пытанне застаецца адкрытым:

— Я гатовы перадаць гэтыя паўнамоцтвы заканадаўчаму органу — вы ўжо потым будзеце выхадныя аб'яўляць. Гэтае пытанне не зачынена, яго можна вырашыць у любы час. Пакуль пачнем з гэтага.

Прэзідэнт перакананы, што Дзень народнага адзінства заснаваны 17 верасня цалкам справядліва, гэтую дату можна лічыць днём уз'яднання беларускага народа:

— Таму не трэба на нас тут каціць, крычаць. Свята будзе. Гэта сапраўды свята. Калі б гэтага дня не было, не было б нашай краіны. Гэта для нас святы дзень.

### Падатковы манеўр

Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне журналіста РБК, распавёў аб тым, як адбываецца працэс кампенсацыі ад расійскага падатковага манеўру ў нафтавай сферы.

— Падатковы манеўр трэба аблічыць і кампенсаваць, калі будзе такая пастанова. Але зрухі ў гэтым кірунку ёсць. З нашага боку таксама былі абавязацельствы, мы іх выканалі і зрабілі першы крок. Гэта ў памеры каля 50 працэнтаў, — заявіў Прэзідэнт.

Ён распавёў, што Беларусь хоча працаваць з расійскімі прадпрыемствамі ў роўных умовах. Таксама Прэзідэнт паведаміў, што Беларусь разлічвае на дапамогу з крэдытаваннем праз Еўразійскі банк.

Аляксандр Лукашэнка згадаў, што з Расіяй абмяркоўвалася і пытанне дапамогі ва ўмовах санкцыйнага ціску з боку калектыўнага Захаду.

— Гаворка ішла аб нафтаперапрацоўцы і пастаўцы нафтапрадуктаў, аб выхадзе на прымальныя цэны па газе, банкаўскія і фінансавыя льготы. Бо 40 працэнтаў банкаўскай сістэмы Беларусі — расійскія. Я папрасіў у Прэзідэнта Расіі, яны ўжо пачалі выдзяляць сродкі.

Таксама Аляксандр Лукашэнка распавёў, што звярнуўся да Пуціна з просьбай забяспечыць для беларускіх прадпрыемстваў роўныя магчымасці па дзяржаўных закупках, аб забароне блакавання беларускай прадукцыі на межах, асабліва сельскагаспадарчай. Па словах Прэзідэнта, перамовы працягваюцца.

### Пра расійскія ваенныя базы

Прэзідэнт адказаў на пытанне, пры якіх умовах у Беларусі можа з'явіцца расійская ваенная база. Беларускі лідар таксама нагадаў, што ў ЕС сёння мноства ваенных баз:

— Чыіх — зразумела. На гэтых базах не проста танкі "Абрамсы" — там размешчаная ядзерная зброя! І таму я іх пытаюся: вы чаго парыцеся, калі ў вас база на базе сядзіць і базай паганяе! Ядзернай зброяй бразгаеце! І вы нам нейкія ўмовы ставіце, асцерагаецеся, што тут будзе нейкая база? Ды вы спачатку ў сябе разбярыцеся!

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў:

— Калі будзе трэба, тут не проста база будзе — тут усе ўзброеныя сілы Расійскай Федэрацыі будуць размешчаныя. А пры якіх умовах? У выпадку небяспекі развязвання новай сусветнай вайны. Цяпер Расіі марнаваць грошы і ствараць тут базы які сэнс? Я быў бы зацікаўлены, калі б тут былі размешчаны нейкія сур'ёзныя ракетныя ўстаноўкі, але іх нельга да тэатра ваенных дзеянняў непасрэдна падвесці, прама ў агарод натаўцаў, таму што яны будуць абстраляныя з самай звычайнагй зброі. Ніколі Расія сюды не перасуне зброю, тым больш ядзерныя ўстаноўкі: яны будуць пад абстрэлам з тэрыторыі Польшчы і Літвы. А самалёты — час падлёту з Расіі — сюды 3 хвіліны. Няма ніякай неабходнасці марнавацца. І мы адпрацавалі з Прэзідэнтам Расіі ўсе маршруты "Белыя лебедзі" (расійская баявая авіяцыя. — **Заўв. рэд.**) абляцелі межы. І мы прадэманстравалі ім — не дай бог тузанецеся...

### Хто амбудсмен у Беларусі

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў:

— Калі ў Беларусі ішла гаворка пра амбудсмэна, чаму я ад гэтага адмовіўся? Таму што я на сябе ўзяў гэтыя функцыі — абарону правоў чалавека. Ніхто лепш Прэзідэнта не зможа іх абараняць — сапраўдныя правы чалавека, заснаваныя на справядлівасці. Я шмат разоў казаў, што хутка справядлівасць будзе запатрабаваная ўсюды. Яна вельмі запатрабавана

ў Расіі. А мы на гэтым будуем сваю палітыку — сумленнасць, прыстойнасць і справядлівасць.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

— Што тычыцца сапраўдных правоў чалавека — права на жыццё, на працу, на годную заработную плату, на ахову здароўя, адукацыю і іншае, — у нас што, гэтыя праблемы ўпушчаныя? Не. І менавіта дзякуючы гэтаму нам удалося пераканаць нашых людзей (засцерагчыся. — **Заўв. рэд.**) ад згубных рухаў. А тыя, хто рынуўся тады, усё ж такі ўсвядомілі, што ў нас яшчэ ёсць Бог.

**Замест эпілога**

Прэзідэнт Беларусі заявіў, што хацеў бы пажадаць замежным прадстаўнікам, якія прысутнічалі на мерапрыемстве, калі ў іх нешта ёсць чалавечае, паглыбіцца і зразумець, што было і што адбываецца.

І хоць бы проста не перашкаджаць:

— Калі ў вас ёсць цікавасць, давайце супрацоўнічаць. Няма цікавасці — адыдзіце ў старонку і не перашкаджайце. Вы нас усё роўна не адарвеце ад Расіі і не схіліце на свой бок! Мы з вамі хацелі супрацоўнічаць, мы да выбараў прапаноўвалі многае — і вы нас прымалі. Чаму вы раптам звар'яцелі на Захадзе? Навошта вам трэба было здзейсніць спробу зламаць нашу краіну? Мы ж мелі нармальныя адносіны, і была перспектыва іх выбудоўваць. Але ж вы самі ўсё загубілі ўласнымі рукамі!

Аляксандр Лукашэнка дадаў:

— Мы не былі супраць Расіі, гэта наша брацкая краіна. Гэта наша агульная айчына ад Уладзівастока да Брэста, зразумейце вы нарэшце! Гэта наша з рускімі грамадства. Мы нічым не адрозніваемся ад рускіх, наогул ад расіян нічым не адрозніваемся. Вы гэта павінны ўспрыняць як дадзенасць. Калі вы гэтую дадзенасць нашу найвялікшую не ўспрымеце, быць вайне. А навошта?! Гэтай вайны не будзе сёння, пры нас, але навошта, каб нашы дзеці ваявалі? І вы павінны гэта прызнаць! Прызнаць, што Кітай падняўся ў тым ліку дзякуючы Еўрасаюзу і асабліва Амерыцы.

Прэзідэнт заўважыў:

— Вы багатыя, вы можаце заплаціць CNN і іншым грошы — і яны будуць бразгаць языком. Спыніцеся нарэшце! Бо лепш жыць у міры. Паглядзіце, якая прырода, якая прыгажосць у той жа Вялікабрытаніі! Так, загадзілі вы Заходнюю Еўропу, але не зусім. Ёсць добрыя месцы, ёсць горы. Навошта вы раздзяляльныя лініі ўносіце праз столькі гадоў? Навошта ўносіце бойню ў цэнтры Еўропы? Беларусь — гэта нават не Украіна, Беларусь — гэта святое месца. І калі тут не дай бог нешта адбудзецца насуперак гэтаму светламу — быць вайне. Беларусь ніхто не саступіць. Я хачу, каб вы гэта ўсвядомілі. Мы не хочам вайны.

**P.S. Усяго сказанага ў ходзе больш чым васьмігадзіннай размовы на старонках часопіса не змясціць. Мы імкнуліся выбраць усё самае важнае і цікавае. Але, безумоўна, многія нюансы сустрэчы яшчэ будуць абмяркоўвацца, запатрабуюць дэталёвага аналізу і асэнсавання. Тым ці іншым чынам, у той ці іншай форме вяртанне да Вялікай размовы будзе працягвацца.**

Васіль **Харытонаў**

БЕЛТА



АКТУАЛЬНА

# ПАТРЭБНЫ РУХ НАПЕРАД

**Прэзідэнт Беларусі лічыць недапушчальным замарозіць сітуацыю ў краіне, каб не было застою. Аляксандр Лукашэнка падтрымлівае неабходнасць перамен, але выключна ў рамках закону. Аб гэтым ён заявіў на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод прадстаўнікам шэрага ў сілавых структурах.**

"Хачу звярнуць вашу ўвагу на адну акалічнасць (гэта з вашага асяроддзя — міліцэйскага, Узброеных Сіл). Некаторыя нашы ваеннаслужачыя (яны так не гавораць, але я скажу больш жорстка) не разумеюць: ну навошта Прэзідэнту гэты рэферэндум, ну навошта гэта Канстытуцыя (абнаўленне Канстытуцыі. — **Заўвага рэд.**), ды не трэба гэтага рабіць. Хлопцы, не! Мы не можам так зрабіць. Па-першае, мы паабяцалі. Па-другое, вы ж помніце іх (апанентаў. — **Заўвага рэд.**) лозунг: "Перамены, перамены, перамены". І мы сказалі: так, патрэбны перемены", — заявіў, у прыватнасці, Кіраўнік дзяржавы.

"І яны сапраўды патрэбны. Мы не можам замарозіць у краіне сітуацыю і абстаноўку, інакш паўторацца брэжнеўскія часы. Маладыя людзі гэтага не помняць, але мы ж, старэйшыя, добра помнім гэты перыяд застою. Таму патрэбны рух наперад, патрэбны гэтыя перамены. І тады мы сказалі: так, патрэбны, але гэтыя перамены павінны быць законнымі. Інакш кажучы калі ісці да перамен, трэба пачынаць з Канстытуцыі", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт адзначыў, што нават і не гэта галоўнае. "Мы і так на месцы не стаялі. Мы з вамі стварылі першую суверэнную, незалежную дзяржаву. Што яшчэ трэба? Мы застанемся ў гісторыі. Галоўнае — што будзе пасля нас, хто прыйдзе пасля нас, хто будзе Прэзідэнтам, якая сістэма кіравання будзе. І не дай бог гэта паўторыцца (спроба расхістаць дзяржаву і ўладу. — Заўвага рэд.), новае пакаленне ўтрымае краіну ці не? Актуальнае пытанне", — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што і ён не святы, але за чвэрць стагоддзя тым не менш не было дапушчана грубых сістэмных памылак. "Не зрабілі мы іх. Так, былі памылкі, недахопы. Мы першапраходцамі былі, нам не было дзе навучыцца нечаму. Таму не выключана, што былі памылкі. Але сістэмных памылак мы не дапусцілі. Мы не ламалі, не крышылі. Ніякай дыктатуры ў нас у краіне няма, я ўжо гаварыў, — сказаў Прэзідэнт. — У мяне няма ядзернай зброі, у мяне няма кіберхакераў і іншага, каб я націснуў недзе кропку і ўвесь свет перавярнуўся. Якая тут дыктатура?!".

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што ў Беларусі выбудавана вельмі жорсткая кіруемая дзяржава. "Калі б мы гэтага не зрабілі, мы б не стварылі гэту дзяржаву", — падкрэсліў ён.

У сувязі са сказаным Кіраўнік дзяржавы акрэсліў шэраг пытанняў аб тым, што будзе пасля таго, як у Беларусі выберуць новага Прэзідэнта: "Вы гарантуеце, што прыйдзе чалавек, які будзе спакойна рухаць краіну наперад? Хто гарантуе ў гэтай сітуацыі? Калі з Захаду нас цісnuць, хочуць парваць, падзяліць: гэта — у Польшчу, гэта — туды, гэта — сюды, а тое і цалкам, як яны кажуць, далучыць Беларусь да Польшчы. Нас падаграваюць з Украіны. Вы бачыце, што адбываецца. Не дай бог натаўцы пераступілі б граніцу адтуль, Расія ўбаку не застанецца".

"Таму што тут бяспека Расіі, тут сутыкненне з асноўным праціўнікам — натаўскім. Як бачыце, мы ў такім акружэнні, што нам трэба вярцецца і заўсёды ўмець адчуваць гэта ўсё на кончыках пальцаў для таго, каб недзе не спатыкнуцца. Каб захаваць сваю дзяржаўнасць", — удакладніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ў гэтым кантэксце прыгадаў і аб падзеях у Афганістане, на якія цяпер пераключыў увагу ўвесь свет: "Афганістан з'явіўся. Усе цяпер звярнулі ўвагу на Афганістан. Але не думайце, што яны нас забудуць. Зразумела, новая міжнародная канфігурацыя. Таму трэба быць вельмі акуратнымі і асцярожнымі і не паводзіць сябе як слон у пасуднай краме"

"Іншым разам даводзіцца ісці па вельмі тонкім лёдзе. Таму нам трэба выбудаваць далей рух такім чынам, каб новая ўлада не загубіла дзяржаву як мінімум", — рэзюмаваў Прэзідэнт Беларусі.

Уладзімір **Хромаў**



У ЭКСПАРТНЫМ КІРУНКУ

# МІСІЯ ВЫКАНАЛЬНАЯ

**У Палацы Рэспублікі прайшла сустрэча кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь з прадстаўнікамі экспартна-арыентаваных прадпрыемстваў і арганізацый — членаў Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Усяго ў сустрэчы прынялі ўдзел 58 кіраўнікоў замежных устаноў Беларусі, а таксама прадстаўнікі каля двухсот кампаній і арганізацый з усіх рэгіёнаў краіны.**

Сустрэчу адкрываў бізнес-брыфінг па пытаннях супрацоўніцтва Беларускай гандлёва-прамысловай палаты з замежнымі ўстановамі, падчас якога выступілі старшыня БелГПП Уладзімір Улаховіч і першы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандр Гур'янаў. Яны адзначылі значнасць і эфектыўнасць сумеснай працы Палаты і беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтваў пры правядзенні мерапрыемстваў, скіраваных на развіццё міжнародных кантактаў бізнесу і прасоўванне беларускага экспарту, пазначылі асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння па падтрымцы знешнеэканамічнай дзейнасці айчынных прадпрыемстваў.

Першы намеснік міністра замежных спраў таксама падкрэсліў, што Беларуская гандлёва-прамысловая палата — гэта надзейны партнёр для замежных устаноў.

— У нас стаіць задача па актыўнаму развіццю менавіта дзелавога вымярэння супрацоўніцтва. Дзелавыя колы — наша падтрымка, таму мы павінны працаваць больш шчыльна і скаардынавана. Аднаўляецца правядзенне выстаў і дзелавых абменаў, аказваецца неабходная фінансавая падтрымка такіх мерапрыемстваў, але гэтым інструментарыем трэба карыстацца яшчэ больш актыўна. Мы павінны вяртаць практыку прамых зносін, вывазу нашых экспарцёраў непасрэдна на рынкі, — адзначыў Аляксандр Гур'янаў.




Старшыня БелГПП Уладзімір Улаховіч у сваю чаргу падкрэсліў значную цікавасць у правядзенні сустрэчы з боку дзелавой супольнасці:

— Амаль 200 кампаній, якія прымалі ўдзел у мерапрыемстве, арыентаваныя на экспарт, іх цікавяць канкрэтныя пытанні па працы на замежных рынках. І ім неабходная кансультацыя нашых пасольстваў. Сёння час патрабуе цеснага ўзаемадзеяння і працы ў адной камандзе. Гэта тая галоўная задача, якую трэба вырашыць, адкрываючы новыя рынкі, новыя краіны, выкарыстоўваючы наяўныя магчымасці, не адмаўляючыся ні ад аднаго экспартнага кірунку, а толькі нарошчваючы іх.

Па завяршэнні брыфінгу адбыліся двухбаковыя B2D-сустрэчы кіраўнікоў дыпламатычных місій Рэспублікі Беларусь з кіраўнікамі прадпрыемстваў. Падчас перамоваў былі абмеркаваны перспектывы ўзаемадзеяння па прасоўванні экспарту, праблемныя пытанні збыту прадукцыі ў краінах знаходжання кіраўнікоў беларускіх дыпмісій.

Уладзімір Улаховіч выказаў надзею, што тыя дамоўленасці, якія дасягнуты паміж айчыннымі вытворцамі і замежнымі ўстановамі, будуць максімальна прыкладнога характару і прынясуць карысць прадпрыемствам, падтрымліваючы тую дынаміку экспарту, якая атрымалася ў першым квартале і першым паўгоддзі.

Пасля перамоваў з прадстаўнікамі дзелавых колаў дыпламаты наведалі ААТ "Беларуская ўніверсальная таварная біржа", дзе азнаёміліся з магчымасцямі і механізмамі экспарту беларускай прадукцыі з выкарыстаннем біржавых інструментаў.

Аляксей **Фядосаў**

ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ

# У ЛІКУ 40 ЗАПЛАНАВАНЫХ

**Экспазіцыя беларускіх вытворцаў будзе прадстаўлена на міжнароднай выставе Armenia Expo 2021, якая пройдзе ў верасні ў Ерэване**

Больш за дваццаць беларускіх прадпрыемстваў розных галін прадставяць у сталіцы Арменіі свае лепшыя навінкі, адаптаваныя пад перавагі і патрэбы армянскіх партнёраў. ААТ "Гомсельмаш" упершыню прыме ўдзел у выставе. Між тым, дзве машыны гэтага прадпрыемства пад брэндам "ПАЛЕССЕ" з мінулага года ўжо працуюць на палях Арменіі.




Слуцкі сыраробны камбінат прадставіць у Арменіі вырабы гандлёвай маркі "Ясь Белавус" — сыры, сухое малако і масла. Гэтыя віды беларускай прадукцыі традыцыйна карыстаюцца попытам на Каўказе. У 2020 годзе яны разам са слівкамі і тварагом пераважалі і ў экспарце беларускіх прадуктаў у Арменію.

Сярод удзельнікаў беларускай экспазіцыі на міжнароднай выставе Armenia Expo 2021 таксама Калінкавіцкі малочны камбінат і прадпрыемствы канцэрна "Белдзяржхарчпрам", якія прадэманструюць кандытарскую, бакалейную і алкагольную прадукцыю.

Арганізатарам беларускай экспазіцыі ў Ерэване з'яўляецца выставачнае прадпрыемства "Белінтэрэкспа" Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Як адзначылі ў "Белінтэрэкспа", выніковасць удзелу ў гэтай выставе будзе ўзмоцнена традыцыйнымі элементамі экспазіцыі Made in Belarus: прамакампаніяй у Арменіі, інфармацыйным семінарам для ўдзельнікаў, наведваннем армянскіх прадпрыемстваў.

Сама ж міжнародная выстава Armenia Expo праводзіцца 20-ы раз як універсальны рэгіянальны гандлёва-прамысловы форум. Мерапрыемства праходзіць пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Арменіі, а таксама ўрада Рэспублікі Арменія.

Варта адзначыць той факт, што ўсяго ў 2021 годзе выставачным прадпрыемствам "Белінтэрэкспа" БелГПП запланавана больш за 40 беларускіх экспазіцый на міжнародных выставах у Арменіі, Балгарыі, Казахстане, Іране, Кеніі, ААЭ, Сербіі, Узбекістане і іншых краінах.

Аляксандр **Піменаў**

# АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

## Праекты будучыні становяцца галоўнай кропкай каардынат інавацыйнай

Сапраўды, як лічыць намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей Шчарбакоў, самае амбіцыйнае, што плануецца ажыццявіць у межах гэтай пяцігодкі, — так званыя комплексныя праекты будучыні. Гэта асаблівыя і маштабныя праекты, якія стануць своеасаблівым пунктам адліку нацыянальнай інавацыйнай эканомікі. Цяпер яны ўжо сфарміраваныя, хоць, як адзначыў Сяргей Шчарбакоў, рабілася гэта няпроста:

— Таму што трэба было выбраць тое, што стане драйверам далейшага росту.

Сярод праектаў будучыні — нацыянальны электратранспарт, біятэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе, дакладнае земляробства, інавацыйная ахова здароўя, біятэхналогіі для фармацэўтыкі, разумныя гарады Беларусі. Праекты, якія ў далейшым атрымаюць прыярытэтнае фінансаванне.

Па словах намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, найбольш прасунутым цяпер з'яўляецца праект па развіцці электратранспарту. Па сутнасці, гэта праект, паводле якога ўжо з'явіліся нейкія прамежкавыя вынікі. Напрыклад, ёсць узоры электрамабіляў, распрацаваныя ў Акадэміі навук.

Але гэтым праект не абмяжоўваецца. У ім, у прыватнасці, закладзена развіццё кампанентнай базы электратранспарту.

— Гэта і цягавыя рухавікі, акумулятары і, вядома ж, узоры тэхнікі. Калі праект яшчэ толькі фарміраваўся, было ўсведамленне, што прыярытэтным стане не стварэнне масавага



БЕЛТА



БЕЛТА

легкавога электратранспарту, а менавіта камерцыйнага, сельскагаспадарчага, — падкрэсліў Сяргей Шчарбакоў.

Цяпер, дарэчы, у межах праекта вядзецца праца над двума ўзорамі электрагрузавікоў — на "Белкамунмашы" і МАЗе. Таксама распрацоўваюцца новыя ўзоры тэхнікі для БЕЛАЗа.

Між тым, як найбуйнейшы навуковы цэнтр і вядучая навуковая арганізацыя краіны, Нацыянальная акадэмія навук не толькі ўцягнутая ў выкананне ўсіх комплексных праектаў будучыні, але і з'яўляецца галаўной арганізацыяй па такім праекце як "Біятэхналогіі для фармацэўтыкі".

— У нас запланавана рэалізацыя амбіцыйнага праекта па стварэнні айчынных тэхналогій, монаклананальных антыцелаў і лекавых прэпаратаў на іх аснове, — кажа галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй Іванец. — Фактычна ў Беларусі адсутнічаюць не толькі такія тэхналогіі, але і вытворчасць прэпаратаў на аснове монаклананальных антыцелаў. За бягучую пяцігодку мы плануем з навукоўцамі Інстытута біяарганічнай хіміі і шэрагу іншых арганізацый рэалізаваць гэты праект.

У адпаведнасці з планамі навукоўцаў і паводле іх цеснага ўзаемадзеяння

# ЯК ДРАЙВЕР РОСТУ
## эканомікі Беларусі





з партнёрамі, будуць распрацаваны не толькі тэхналогіі, новыя лекавыя формы на аснове гэтых прэпаратаў, але і створана доследная вытворчасць, якая дазволіць наладзіць выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі.

— Каб ацаніць патрэбнасць Беларусі ў дадзеных прэпаратах, штогод праводзіцца закупка імпартных прэпаратаў на аснове монаклանальных антыцелаў на суму каля $ 80 млн. — удакладняе Андрэй Іванец. — Істотны аб'ём, імпартазамяшчэнне якога мяркуецца ў ходзе выканання вызначанага праекта.

Акрамя таго, у планах Нацыянальнай акадэміі навук — ажыццявіць праект па стварэнні доследна-прамысловай вытворчасці цвёрдых лекавых формаў з ужываннем інавацыйных тэхналогій. Гаворка ідзе аб стварэнні прэпаратаў для лячэння сацыяльна значных захворванняў: ВІЧ-інфекцыі, гепатыту B, хваробы Альцгеймера. Праект будзе рэалізаваны на базе навукаёмістага фармацэўтычнага прадпрыемства "Акадэмфарм", якое створана ў структуры Акадэміі навук. У выкананне праекта будуць уцягнутыя і міжнародныя партнёры. Напрыклад, супрацоўнікі буйной індыйскай карпарацыі Cipla LTD, з якой НАН дастаткова паспяхова развівае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва.

Акрамя гэтага Акадэмія навук паспяхова ўдзельнічае ў праектах у галіне аграпрамысловага комплексу. Гэта, у прыватнасці, тычыцца дакладнага земляробства.

— Мы плануем з нашымі калегамі з вышэйшых навучальных устаноў, Мінсельгасхарча распрацаваць тыпавую лічбавую платформу, — растлумачыў галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук. — Працуем над геномнымі біятэхналогіямі для маркернай селекцыі ў сферы раслінаводства і жывёлагадоўлі.

А яшчэ ў планах навукоўцаў — стварэнне ўласных буйных вытворчых прадпрыемстваў з інавацыйнай і навукаёмістай прадукцыяй. У гэтай сувязі яны развіваюць узаемавыгаднае супрацоўніцтва са сваімі замежнымі партнёрамі. Выконваюць шэраг міжнародных праграм, праектаў, удзельнічаюць у дзейнасці міжнародных арганізацый і асацыяцый.

У прыватнасці, сёння НАН Беларусі актыўна супрацоўнічае з расійскім даследчым цэнтрам "Курчатаўскі інстытут". Плануецца стварыць філіял інстытута ў Мінску на базе Акадэміі навук, дзе будзе развівацца вельмі шырокі комплекс тэхналогій, у тым ліку, ядзерныя і біямедыцынскія даследаванні.

Каля пяцісот распрацовак беларускіх навукоўцаў плануецца ўкараніць у 2021 годзе. Пра гэта таксама казаў на прэс-канферэнцыі "Беларусь інтэлектуальная. Сучасная экасістэма інавацый" галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй Іванец. Дакладная статыстыка, з яго словаў, такая. Сёлета рэалізуецца больш за 470 распрацовак супрацоўнікаў НАН. Гэта вельмі шырокі комплекс, і ў Акадэміі лічаць, што выпуск прадукцыі у яго межах складзе не менш як на $700 млн.

У прыватнасці, па кірунку біятэхналагічнай вытворчасці ў гэтым годзе ўкараняюцца каля 30 распрацовак. Агульны аб'ём выпуску прадукцыі, які плануюць завяршыць менавіта сёлета, — на $4,5 млн. У аграпрамкомплексе — 250 распрацовак (каля $1,5 млрд). У фармацэўтыцы і медыцыне — болей за 40 распрацовак, якія таксама плануецца завяршыць часткова ў бягучым годзе. Агульны аб'ём выпуску прадукцыі тут мяркуецца на ўзроўні прыкладна $5 млн.




БЕЛТА

Андрэй Іванец адзначыў, што Нацыянальная акадэмія навук апошнім часам працуе як буйная навукова-вытворчая карпарацыя. У ёй генерыруюць новыя ідэі, адкрываюць заканамернасці па ўсім спектры навуковых ведаў, а таксама ствараюць тэхналогіі, вопытныя і эксперыментальныя ўзоры і, вядома, укараняюць іх у вытворчасць. Фактычна можна казаць аб тым, што НАН рэалізуе поўны інавацыйны цыкл: ад навуковай ідэі да тэхналогіі, вопытнай вытворчасці і ўкаранення.

У сувязі з гэтым, на думку галоўнага вучонага сакратара Нацыянальнай акадэміі навук, выкананне фундаментальных навуковых даследаванняў — аснова далейшых практыка-арыентаваных і інавацыйных праектаў. І тут асноўную функцыю ажыццяўляюць навукова-даследчыя інстытуты, якія выконваюць фундаментальныя даследаванні ў межах дзяржаўных праграм. На бягучую пяцігодку зацверджана 12 такіх праграм навуковых даследаванняў.

— Нацыянальная акадэмія навук цалкам каардынуе ўсе фундаментальныя даследаванні ў Беларусі і ўсе суб'екты навуковай сферы, — гаворыць Андрэй Іванец. — Мы працуем па самых перспектыўных напрамках, якія тычацца генетычных даследаванняў, біятэхналогій, фармтэхналогій. Таксама вельмі актыўна вядуцца распрацоўкі ў галіне ядзернай энергетыкі і аграпрамысловага комплексу — фактычна па ўсіх напрамках, якія зцяпер запатрабаваныя ў народнагаспадарчым комплексе краіны.

Варта заўважыць, што для рэалізацыі і выпуску вопытных, эксперыментальных узораў у Акадэміі навук функцыянуе больш за сто вытворчасцяў розных памераў. Спектр навукаёмістай прадукцыі самы шырокі: ад гатункаў, парод, машын і тэхналогій, у тым ліку генетычных біятэхналогій для аграпрамысловага комплексу да высокатэхналагічных галін. Гэта таксама — інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, суперкамп'ютары, фармацэўтыка, тонкая хімія, кампазіцыйныя матэрыялы, космас, беспілотныя апараты і электратранспарт.

Безумоўна, рэалізацыя ўсіх распрацовак і ўкараненне іх у рэальны сектар эканомікі ажыццяўляецца навукоўцамі ў цеснай каапераціі з усімі галінамі і прадпрыемствамі краіны. Дзеля гэтага створана каля 75 сумесных кластарных структур, якія аб'ядноўваюць не толькі навукова-даследчыя інстытуты НАН, але і вышэйшыя навучальныя ўстановы, буйныя прамысловыя прадпрыемствы як дзяржаўнага, так і прыватнага сектара па розных напрамках.

— У прыватнасці, у гэтую дзейнасць уключаныя такія прадпрыемствы як МТЗ, БЕЛАЗ, МАЗ, ММЗ, БМЗ, "Інтэграл", "Планар" і многія іншыя. Тым самым НАН на справе рэалізуе мадэль "Беларусь інтэлектуальная", — канстатаваў Андрэй Іванец. Ён нагадаў, што дадзеная мадэль была прынята ў якасці стратэгічнай перспектывы развіцця навуковай сферы на Другім з'ездзе навукоўцаў у 2017 годзе.



БЕЛТА

І яшчэ адзін цікавы аспект. Беларусь у найбліжэйшыя пяць гадоў плануе выйсці на ўзровень навукаёмістасці ВУП у памеры аднаго працэнта. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі "Беларусь інтэлектуальная. Сучасная экасістэма інавацый" намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Гатоўскі.

Між іншым, Інстытут эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук ажыццяўляе агульнае метадычнае суправаджэнне Праграмы сацыяльна-эканамічнага

развіцця краіны на пяцігадовы перыяд. Як і любая праграма, яна мае ў тым ліку і інавацыйны складнік, свае мэтавыя паказчыкі, на якія трэба выйсці за пяцігодку.

— Па іннаватыцы — гэта тры паказчыкі. Самым галоўным з'яўляецца навукаёмістасць ВУП, — удакладняе Аляксандр Гатоўскі. — У апошнія гады яна вар'іруецца паміж 0,55% — 0,60% ад валавога ўнутранага прадукту. Мы плануем дасягнуць у далейшым 1%. Гэта можа здацца невялікай доляй. Але калі параўнаць з іншымі краінам, то, напрыклад, у Еўразійскім эканамічным саюзе паказчык у 1% ВУП мае толькі Расія. Казахстан — 0,14%, Арменія — 0,23%, Кыргызстан — 0,12%. Гэта значыць, што мы маем добры сярэдні паказчык па ЕАЭС.

Дарэчы, сродкі на фінансаванне навукі ў далейшым будуць ісці не толькі з бюджэту. Ужо ў апошнія гады доля пазабюджэтнага фінансавання навукі складае 55% — 59%, гэта значыць больш за палову. Калі казаць аб фінансаванні з боку рэальнага сектара, камерцыйных арганізацый, то ў Беларусі гэтая доля складала летась 64%. Атрымліваецца, тут мы маем практычна сярэднееўрапейскі паказчык. Па Еўропе — гэта 66,5%. Так, ёсць некаторыя краіны, у якіх рэальны сектар больш інавацыйна актыўны. Напрыклад, у Японіі — 79%, у Паўднёвай Карэі — 80%. Але ў прынцыпе мы маем добры сярэднееўрапейскі паказчык і нават па ім пераўзыходзім усходнееўрапейскія краіны.

Наступны мэтавы паказчык, які прадугледжаны інавацыйным блокам у Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, — гэта ўдзельная вага інавацыйна-актыўных арганізацый у апрацоўчай прамысловасці.



За апошняе дзесяцігоддзе краіна дастаткова сур'ёзна прырасла па дадзеным кірунку, звярнуў увагу Аляксандр Гатоўскі. Калі ў 2010 годзе гэта было 16,6% , то да 2020 года выйшлі на 29,6%. Праграмай 2021-2025 прадугледжана замацавацца на ўзроўні больш за 30%. У цэлым, як бачна, ужо падыходзім да гэтай адзнакі.

Міжнародная статыстыка дае паказчык у сярэднім па прамысловасці — акрамя апрацоўчай яшчэ здабываючая, электраэнергетыка, камунальная гаспадарка. Тут паказчык у Беларусі быў крыху ніжэйшы. У апошнія гады — 26,2%. Для параўнання, у Расіі ён складае крыху больш за 9%, у Еўрапейскім саюзе — 50%, у Кітаі — крыху менш за 40%. У цэлым і тут нядрэнна рухаемся па сусветнаму трэнду, лічыць намеснік дырэктара Інстытута эканомікі.

Трэці ж паказчык, які згаданы ў Праграме, — гэта доля інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі арганізацый апрацоўчай прамысловасці. Тут таксама нядрэнна прыраслі. У 2010 годзе было 17,1%, а да 2020 года выйшлі на 20,9%. У планах — устойліва замацавацца на адзнацы 21% і вышэй.

— Мы ўжо падыходзім да гэтага паказчыка, — заўважыў Аляксандр Гатоўскі.

Зноў варта нагадаць, што міжнародная статыстыка дае лічбу па прамысловасці ў цэлым. У Беларусі яна складае 18%, бо традыцыйныя галіны ўключаюцца ў гэтае кола прадпрыемстваў. Еўрапейскі саюз у сярэднім мае 13%, Германія — крыху менш за 15%.

Такім чынам, увогуле нашы паказчыкі на фоне міжнароднай статыстыкі глядзяцца досыць нядрэнна. І гэта абнадзейвае.

Уладзімір **Веліхаў**



БЕЛТА



# ХЛЕБ У ЖАНОЧЫХ ДАЛОНЯХ

## Сучасная дзяўчына з вышэйшай адукацыяй на камбайне? Неверагодна! І, тым не менш, гэта факт.

Не раз даводзілася чуць: жніво — працэс творчы, які патрабуе наяўнасці не толькі вопыту, але і таленту. Вядома, пры тым неабходны і фізічная сіла, і цягавітасць — асноўныя аргументы для таго, каб працу камбайнёра выконвалі мужчыны. Аднак, усё часцей мы чуем пра тое, што сучасныя прадстаўніцы прыгожага полу, да таго ж зусім маладыя, працуюць на камбайнах. Толькі на Магілёўшчыне — у Быхаўскім, Крычаўскім, Магілёўскім, Мсціслаўскім, Слаўгарадскім, Хоцімскім і Шклоўскім раёнах у гэтую ўборачную кампанію на палях рэгіёну сярод 1605 механізатараў засвяцілася 10 жанчын. І хоць хлебароб — прафесія няпростая, з кожным годам "жаночая" колькасць у Беларусі па розных рэгіёнах узрастае. Нельга, вядома казаць пра масавую з'яву, але, тым не менш; факт застаецца фактам.

Даўно не сакрэт: каб дасягнуць поспехаў на жніве, трэба ведаць тонкасці працы на камбайне — адчуваць яго нораў ды і моцнае здароўе камбайнёрам да твару. А яшчэ важна разумець і адчуваць зямлю. І, відаць, у жанчын гэта нядрэнна атрымліваецца, раз мужчыны кажуць: жанчына на камбайне — да поспеху.

### Не ў першы раз

"Мы ўжо сёмы год заўважаем жанчын-камбайнёраў, якія ўносяць свой пасільны ўнёсак у хлебны каравай краіны. Такіх на ўвесь рэгіён набралася ўсяго дзесяць чалавек — гэта жонкі і дачкі, маладыя спецыялісты і нават шматдзетныя мамы. Іх праца заслугоўвае павагі, а высокія вынікі ў бітве за ўраджай — нашай удзячнасці, — такімі словамі вітала жанчын-камбайнёраў Шклоўскага раёна дэпутат Палаты прадстаўнікоў і член праўлення Беларускага саюза жанчын Вольга Петрашова падчас Рэспубліканскай акцыі "Хлеб на далонях жанчыны", якая праходзіла на Магілёўшчыне. Усе працаўніцы атрымалі ў падарунак ад дэпутата і прафсаюзаў бытавую тэхніку, пасцельную бялізну, касметыку і кветкі, а таксама пажаданні поспехаў у працы і сямейнага дабрабыту.

У Шклоўскім раёне жанчыны-камбайнеры працуюць у трох гаспадарках — ААТ "Амкадор-Шклоў", ЗАТ "Ніва" і ААТ "Гавяды-Агра". Муж і жонка Алена і Сяргей Галубцовы з ЗАТ "Ніва" за адным камбайнам ужо шостую ўборачную. За гэты час пачалі разумець адзін аднаго без слоў. "Жонка і гайку можа падкруціць, і ключ падаць — усё робім разам", — кажа муж.

"Жанчыне на камбайне няпроста, але чалавек да ўсяго прывыкае, таму і працуем плячо ў плячо не першы год," — кажа Алена.

У ААТ "Амкадор-Шклоў" працуюць 11 экіпажаў, з іх толькі адзін сямейны. Ужо другі тыдзень на палі гаспадаркі выязджаюць бацька і дачка Віталь Петрашэнка і Кацярына Крузьмер. Дзяўчына — будучы настаўнік фізкультуры, студэнтка трэцяга курса Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. На ўборачнай ужо не пачатковец — трэці год на пасадзе камбайнёра. Віншаванні прымае з удзячнасцю: такая ўвага прыемна і натхняе на новыя перамогі ў бітве за ўраджай.

"Працу ўжо ведаем, усё ладзіцца і атрымліваецца, — кажа Кацярына Крузьмер. — Сябры і знаёмыя нават не дзівяцца, што ўсё лета працую на камбайне. Адзінае, да чаго не прывыкла — гэта ранні пад'ём: праца ідзе напружаная з 7 раніцы і да 10 вечара. Заробленыя грошы пакуль не марную: адкладваю, бо хачу купіць машыну. Правы ўжо ёсць, засталася справа за малым".

Дарэчы, ініцыятарам акцыі "Хлеб на далонях жанчыны" стала Мінская абласная арганізацыя Беларускага саюза жанчын. Да гэтага праекта, каб адзначыць работніц, якія нароўні з мужчынамі прымаюць актыўны ўдзел ва ўборачнай кампаніі, далучыліся і іншыя рэгіёны краіны. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, член Прэзідыума "Беларускі саюз жанчын" Лілія Ананіч таксама прыняла ўдзел у акцыі "Хлеб на далонях жанчыны". У аграгаспадарцы "Птушкафабрыка Вяляцічы" Барысаўскага раёна яна ўручыла падарункі перадавікам жніва — загадчыцы збожжавага склада Святлане Паўлавец і кіроўцу-"тысячніку" Пятру Іллюшэнку.

А на Вілейшчыне, да прыкладу, у складзе маладзёжнага экіпажа на палях ААТ "Алая заря" памочнікам камбайнёра працуе Карына Пагуда. Для выпускніцы Вілейскага дзяржаўнага каледжа гэты ўборачны сезон першы. Але падтрымка ў яе надзейная — бо побач Ілля Чайкоўскі, які падтрымае і словам, і справай. З дэбютам на хлебнай ніве павіншавалі Карыну старшыня раённага Савета дэпутатаў Алена Чабатар, якая ўзначальвае раённую арганізацыю Беларускага саюза жанчын, старшыня Людзвінаўскаго сельскага савета Наталля Шавялёва і артысты Людзвінаўскага сельскага Дома культуры. З дыпломам і падарункам маладзёжны экіпаж вяртаўся ў кабіну камбайна — хлебная ніва чакаць не можа: ні зярнятка міма бункера — такую задачу ставіць перад усімі ўборачная.

На тым жа полі можна было сустрэць яшчэ адзін экіпаж, у якім на ўборцы ўраджаю задзейнічаны маладосць і вопыт. Зусім хутка Крысціна Прусава будзе распавядаць дашкалятам пра навакольны свет — у тым ліку, і як з'яўляецца на стале хлеб. І раскажа пра тое не па чутках — студэнтка педагагічнага ВНУ працуе на падмене ў тандэме з Валерыем Хамічом. "З абавязкамі памочніка спраўляецца", — гаворыць камбайнёр.

### Гэты гарачы мядовы месяц

Дэпутаты і прафсаюзы таксама пабывалі ў ААТ "Гавяды-Агра" Шклоўскага раёна, дзе на адным камбайне працуюць маладыя Яўген і Ангеліна Шэўчык. Яны зладзілі вяселле перад пачаткам масавай уборкі збожжавых. Аднак мядовы месяц закаханая пара вырашыла правесці не на марскіх узбярэжжах, а на бязмежных шклоўскіх палях за рулём камбайна.

У чым жа сакрэт іх сямейнага шчасця і сумеснай суладнай працы?

На уборачнай кампаніі ў ААТ "Гавяды-Агра" — кіруючая кампанія холдынгу маладыя людзі працуюць ужо



БЕЛТА

Ангеліне Андрэйкавец падабаюцца моманты любавання налітым коласам





БЕЛТА

Вышыня камбайна больш не палохае Ангеліну, бо побач заўсёды Яўген

трэці год. Калі на двух мінулых жнівах яны значыліся як маладзёжны змешаны экіпаж, то сёлета сталі яшчэ і сямейным. Яўген Шэўчык працуе ў гаспадарцы механізатарам. Сваю справу ведае і, па словах кіраўніцтва, ніколі не падводзіць. "Праца ўсюды аднолькавая, і патрабаванні да яе выканання таксама, — лічыць малады сем'янін. — Галоўнае не ленавацца і рабіць сваю справу добрасумленна, тады і зарплата будзе добрая, і ў калектыве заслужыш павагу ".

Яўген Шэўчык не мясцовы, ён прыехаў з Брэстчыны. Тут знайшоў працу і сустрэў свой лёс. У Ангеліны ў ААТ "Гавяды-Агра" ў свой час працаваў бацька, а маці і цяпер працуе ў гаспадарцы дыспетчарам. Спачатку хлопец стаў добрым сябрам сям'і, а потым ужо разгледзеў у дзяўчыне сваю адзіную. "Гэта мой чалавек, як кажуць, роднасная душа, адразу прыкіпеў да Ангеліны ўсім сэрцам, — прызнаецца малады чалавек. — Яна адна на мільён: добрая, разумная, заўсёды падтрымае ў любой сітуацыі".

Калі ў гаспадарцы хлопцу прапанавалі сесці за руль камбайна, ён узяў да сябе ў памочнікі будучую жонку, і гэта нават не абмяркоўвалася. У той час Ангеліна Андрэйкавец была студэнткай Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Працаваць камбайнёрам не спалохалася, а наадварот, вырашыла паспрабаваць нешта новае. "Тры гады таму я зусім нічога не ведала: ні як чысціць і прадзьмухваць тэхніку, ні як сачыць за працэсам уборкі збожжа, — успамінае дзяўчына. — Тым больш панічна баялася вышыні — на камбайн трэба было неяк залазіць. І ўсе страхі і сумневы ў мінулым: напрацавала добры вопыт, ды і муж падтрымлівае".

Цяпер дзяўчына працуе па размеркаванні настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў гімназіі Кармы Гомельскай вобласці. Застаўся год адпрацоўкі, але такі тэрмін маладых не палохае — час праляціць хутка. Сужонкам выдзелілі дом, які муж і жонка ўжо пачалі ўладкоўваць. На прэмію за ўборку ўраджаю купяць у залу вялікую канапу. Іншую частку заробленых грошай адкладуць у сямейны бюджэт. Завесці гаспадарку таксама плануюць.

Да новага сямейнаму статусу Ангеліна яшчэ не прывыкла, але кажа, што з мужам ёй вельмі пашанцавала. "Я параўноўваю яго з іншымі хлопцамі і кожны раз пераконваюся, што такіх больш няма, — расказвае дзяўчына. — Мы многа размаўляем, прыслухоўваемся адзін да аднаго і ўсё вырашаем разам. Жэня — мой першы памочнік ва ўсіх справах. Калі трэба і прыгатуе, і ў доме прыбярэ. Праца на ўборачнай нас аб'ядноўвае яшчэ мацней — адзін аднаму не надакучаем, гэта дакладна. Тым больш сёлетняя ўборачная стала для нас сапраўдным мядовым месяцам: па-іншаму не



БЕЛТА




Шчаслівым і напружаная праца на камбайне падаецца лёгкай

атрымліваецца, бо ў аграрыяў адпачынак зімой, а ў педагогаў — улетку. Вырвацца з працы і разам адпачыць у іншы час складана, але ў нас яшчэ ўсё наперадзе".

На пытанне, у чым сакрэт сямейнага шчасця, маладыя усміхаюцца і пераглядваюцца. "Галоўнае, усё рабіць разам — і працаваць, і адпачываць, — упэўнены Яўген Шэўчык. — А яшчэ заўсёды ісці на саступкі і размаў-ляць. Канфліктаваць, сварыцца і таіць крыўду нельга. Такія паводзіны да дабра не давядуць. Трэба выгаворвацца, а не маўчаць. Калі выконваць гэтыя простыя правілы, можна і да старасці дажыць у ладзе ды згодзе".

Алена Андрэйкавец, мама Ангеліны, зяцем вельмі задаволеная. "Жэня мне як другі сын, добры і спакойны, заўсёды дапаможа, — кажа жанчына. — Цяпер такіх добрых дзяцей мала — напэўна, дастаўся мне ад жыцця ва ўзнагароду. І я адказваю тым жа — падтрымліваю і дапамагаю. У мяне трое дзетак, я люблю і шкадую і сваіх, і чужых. Маладым заўсёды працягну руку дапамогі: калі трэба, падкажу штосьці па працы, пагавару ласкава. Можа, і маім дзецям у жыцці гэта вернецца — таксама побач будуць добрыя людзі".

"У нас у гаспадарцы ўсе людзі як на падбор — станоўчыя і працавітыя, — кажа старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі Інга Гаранская. — Мы іх падтрымліваем, дапамагаем і, вядома ж, стымулюем матэрыяльна. Так, сярэдняя зарплата за 2020 год склала Br1,75 тыс. у акцыянерным таварыстве працуюць 210 чалавек. Акрамя добрай зарплаты і напоўненага калектыўнага дагавора, людзі забяспечаны на ўборачнай бясплатнымі абедамі і вячэрамі, а таксама дадатковым заахвочваннем — штомесячнымі харчовымі пакетамі. Калі чалавек працуе звыш нормы, кошт харчовага пакета можа даходзіць да Br120 у месяц. пры выхадзе на пенсію нашым работнікам выплочваецца па 1 базавай велічыні за кожны адпрацаваны ў гаспадарцы год".

Па словах дырэктара ААТ "Гаўязды-Агра" Валерыя Ізмайловіча, асноўную выручку грашовых сродкаў гаспадарцы прыносіць прадукцыя жывёлагадоўлі. Сёння з трох малочнатаварных комплексаў рэалізуецца 35 т малака ў суткі. Аднак у планах расціць аб'ёмы да 40 т: кошты растуць, і для ўстойлівага развіцця прадпрыемства неабходна ісці ў нагу з часам і пастаянна ўдасканальвацца. Для дасягнення пастаўленых мэтаў у гаспадарцы будуць паляпшаць генетыку пагалоўя і ўдасканальваць кармавую базу.

"Сёння мы ўваходзім у пяцёрку самых буйных гаспадарак Шклоўскага раёна, — кажа Валерый Імайловіч. — Не адстаем і па ўборцы збожжавых."

Міхаліна **Чаркашына**
По матэрыялах БелТА

# НА ВАГУ ЗОЛАТА

**Зборная Беларусі на XXXII летніх Алімпійскіх гульнях "Токіа-2020" заняла 45-е месца ў медальным заліку. У актыве нашых спартсменаў 7 алімпійскіх узнагарод.**

На XXXII летняй Алімпіядзе Беларусь была прадстаўлена 108 атлетамі, якія выступілі ў 20 відах спорту. Адзіны залаты медаль для зборнай Беларусі заваяваў гімнаст Іван Літвіновіч, які выйграў барацьбу ў скоках на батуце. Ён паўтарыў поспех Уладзіслава Ганчарова, які быў лепшым у гэтым выгля-дзе спорту на Гульнях у Рыа-2016.

Тры сярэбраныя ўзнагароды, здабытыя намаганнямі іншых спартсменаў — мініяцюрнай Ірыны Курачкінай, Магамедхабіба Кадзімагамедава, выступаўшых на барцоўскім памосце. А таксама каманды па веславанні на байдарках і каноэ, у якую ўвайшлі Надзея Ляпешка, Марына Літвінчук, Маргарыта Махнева і Вольга Худэнка. Пад праліўным дажджом дзяўчаты заваявалі гэтую ўзнагароду ў Токіа на дыстанцыі 500 м на байдарцы-чацвёрцы. І пераўзышлі свой вынік у Рыа, адкуль прывозілі бронзу.

Алімпійская бронза — у легкаатлета Максіма Недасекава, які ўзляцеў над планкай 2 метры 37 сантыметраў, у Ванэсы Каладзінскай у жаночай барацьбе, якая не пакінула шанцаў амерыканцы Джакарры Вінчэсцер, і ў гімнасткі Аліны Гарнасько. Дарэчы,

*"Быў вельмі рады ў той момант, калі ўбачыў фінальную ацэнку. Здзіўлены залатым медалём. Калі шчыра, нацэльваўся на другое-трэцяе месца. Свой медаль хачу прысвяціць бабулі. Заўсёды хацеў гэта зрабіць..."*.
Іван Літвіновіч





БЕЛТА


SPYTNIK.BY

***"Гэтая ўзнагарода — асаблівая, першая для беларускай каманды ў Токіа. У суперніцтве з самымі моцнымі атлетамі планеты ты прадэманстраваў высокае майстэрства, дзіўную сілу духу і волю да перамогі. Даказаў, што сёння табе няма роўных".***

З віншавання Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі

такі выдатны падарунак сабе на дзень нараджэння і велізарную радасць заўзятарам прынесла гэтая таленавітая выхаванка алімпіскай чэмпіонкі гульняў у Сеуле Марыны Лобач.

Нагадаем чытачам: пяць гадоў таму ў Рыа-дэ-Жанэйра беларускія атлеты заваявалі 9 алімпійскіх медалёў. Самай паспяховай была Алімпіяда-2008 у Пекіне, на якой беларуская каманда заваявала 14 медалёў. Усяго за сем летніх Алімпійскіх гульняў, на якіх беларусы выступалі асобнай камандай, заваявана 85 узнагарод.

Дарэчы, усяго на алімпійскі п'едэстал у Токіа падымаліся прадстаўнікі 93 каманд з 206, якія ўдзельнічалі ў Гульнях. Было разыграна 339 камплектаў узнагарод у 33 відах.

Батутыст Іван Літвіновіч, падводзячы вынікі спаборніцтваў у Токіа распавёў журналістам, што задаволены выступленнем, падчас якога думаў толькі пра тое, каб не памыліцца.

"Праграма была даволі складаная, і вынікам я задаволены. Падчас фінальнага выступлення думаў толькі пра камбінацыі, асабліва калі паляцеў бліжэй да матаў. Там наогул не было ніякіх думак, акрамя таго, што трэба рабіць у любым выпадку", — расказаў спартсмен.

Кажучы пра тое, як ён сябе адчувае пасля выйгранага золата, ураджэнец Мінскай вобласці прызнаўся, што пакуль асаблівых адчуванняў з гэтай нагоды ў яго няма: "Ад таго, што стаў алімпійскім чэмпіёнам, няма нейкіх асаблівых адчуванняў. Можа, пазней яны з'явяцца? Быў вельмі рады ў той момант, калі ўбачыў фінальную ацэнку. Здзіўлены залатым медалём. Калі шчыра, нацэльваўся на другое-трэцяе месца. Свой медаль хачу прысвяціць бабулі. Заўсёды хацеў гэта зрабіць. Яна, на жаль, не дажыла да гэтага моманту ", — адзначыў алімпійскі чэмпіён Токіа-2020.

З золатам Алімпіяды Івана павіншаваў Прэзідэнт.

"Гэтая ўзнагарода — асаблівая, першая для беларускай каманды ў Токіа. У суперніцтве з самымі моцнымі атлетамі планеты ты прадэманстраваў высокае майстэрства, дзіўную сілу духу і волю да перамогі. Даказаў, што сёння табе няма роўных", — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт пажадаў спартсмену моцнага здароўя, дабрабыту і новых дасягненняў.

Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў з гэтым трыумфам і трэнерскі штаб на чале з Вольгай Уласавай. "Вашымі перамогамі ганарацца беларусы", — падкрэсліў ён.

Дзякуючы гэтаму поспеху нядрэнную падтрымку атрымаюць юныя выхаванцы Віцебскай СДЮШАР №1, паведамілі журналістам у Прэзідэнцкім спартыўным клубе.

Навaспечаны чэмпіён такійскіх Гульняў у рамках праекта "Алімпійскі выбар" вырашыў накіраваць Br20 тыс. у спартыўную школу, дзе вырастаюць будучыя алімпійцы. Іван Літвіновіч, якому нядаўна споўнілася 20 гадоў, нарадзіўся ў Вілейцы, але апошнім часам трэніраваўся ў Віцебску на базе СДЮШАР №1 пад кіраўніцтвам галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай па скачках на батуце Вольгі Уласавай. Падчас Алімпіяды-2016 у Рыа гэтая спартыўная школа ўжо атрымлівала матэрыяльную падтрымку пасля залатога выступлення яшчэ аднаго батутыста Уладзіслава Ганчарова.

Што тычыцца Аліны Гарнасько, то ў суме мнагабор'я наша грацыя набрала 102,700 бала. Перамогу ў гэтым выглядзе сенсацыйна атрымала ізраільцянка Ліной Ашрам (107,800), срэбра — у расіянкі Дзіны Аверын ай (107,650). Бронза 19-гадовай Аліны Гарнасько стала сёмым медалём, заваяваным беларускімі спартсменамі на Алімпійскіх гульнях у Токіа. Яшчэ адна наша



БЕЛТА



БЕЛТА



БЕЛТА



БЕЛТА



БЕЛТА

***За гонар беларускага сцяга змагаліся і іншыя нашы медалісты. Дастаткова паглядзець на фотаздымкі, якія адлюстроўваюць мноства змешаных эмоцый спартсменаў — змагароў Ірыны Курачкінай і Магамедхабіба Кадзімагамедава, а таксама байдарачніц — Надзеі Ляпешкі, Марыны Літвінчук, Маргарыты Махневай, Вольгі Худэнкі і Максіма Недасекава.***

грацыя Анастасія Салос ў фінале мнагабор'я заняла восьмае месца.

Аліна Гарнасько падыйшла да Алімпійскіх гульняў у аптымальнай форме. Так, яна была адной з прэтэндэнтак на медаль. Але канкурэнцыя ў барацьбе за алімпійскі п'едэстал у гэтым відзе, як вядома, вялікая.

У Мінску Аліну Гарнасько сустракалі як сапраўдную чэмпіёнку, бо апошні раз беларускія гімнасткі падымаліся на алімпійскі п'едэстал толькі на Гульнях у Лондане.

Пра планы на Гульні ў Парыжы ў 2024 годзе спартсменка пакуль кажа асцярожна. Пасля Алімпіяды часу на адпачынак у нашай каманды практычна няма. Ужо ў верасні зборная зноў адправіцца ў Японію, дзе паспрачаецца за медалі чэмпіянату свету. Пажадаем нашым грацыям удачы!

Таксама пажадаем поспеху і Максіму Недасекаву, якога таксама павіншаваў Аляксандр Лукашэнка. "Ты першым з беларускіх майстроў — скакуноў у вышыню, здолеў узысці на алімпійскі п'едэстал, адкрыўшы новую старонку ў гісторыі айчыннай лёгкай атлетыкі. Як сапраўдны спартсмен і патрыёт, ты пераканаўча даказаў, што трэба верыць у сябе і да канца змагацца за гонар свайго сцяга — і поспех абавязкова прыйдзе ", — сказана ў віншаванні.

За гонар беларускага сцяга змагаліся і іншыя нашы медалісты. Дастаткова паглядзець на фотаздымкі, якія адлюстроўваюць мноства змешаных эмоцый спартсменаў — барцоў Ірыны Курачкінай і Магамедхабіба Кадзімагамедава, а таксама байдарачніц — Надзеі Ляпешкі, Марыны Літвінчук, Маргарыты Махневай і Вольгі Худэнкі. Усе іх высілкі былі накіраваны на тое, каб перамагчы.

Так, медалёў на гэты раз прывезена ў Беларусь няшмат. Але, як кажуць і ў такіх выпадках, усе яны — на вагу золата.

Інга **Ліхтаровіч**

Па матэрыялах БелТА



SB.BY

***Аліна Гарнасько падышла да Алімпійскіх гульняў у аптымальнай форме. Так, яна была адной з прэтэндэнтак на медаль. Але канкурэнцыя ў барацьбе за алімпійскі п'едэстал у гэтым відзе, як вядома, велізарная. У Мінску Аліну Гарнасько сустракалі як сапраўдную чэмпіёнку. Апошні раз беларускія гімнасткі падымаліся на алімпійскі п'едэстал на Гульнях у Лондане — з таго моманту прайшло ўжо 9 гадоў.***

# ЦЯГНІК – У БУДУЧЫНЮ

**Рэспубліканскі маладзёжны цягнік "#БеларусьМоладзьАдзінства" сёлета пераадолеў каля 2 тысяч кіламетраў па нашай краіне. Яго пасажыры — студэнты, валанцёры, блогеры, маладыя дэпутаты, выкладчыкі пабывалі ў самых розных кутках сінявокай. Пад гукі колаў яны абмяркоўвалі розныя надзённыя пытанні: ад патрыятычнага выхавання моладзі да рэалізацыі сацыяльна значных ініцыятыў. У праекце прынялі ўдзел і маладыя людзі з Новасібірскай вобласці Расіі, а таксама з краін Азербайджана і Таджыкістана. Так што праект можна смела назваць міжнародным.**

Арганізатары распавялі, што гэтая ідэя нарадзілася даволі спантанна: падчас правядзення чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. "А чаму б не адправіцца па чыгуначнай магістралі з Брэста ва Уладзівасток?" — прапанаваў нехта з удзельнікаў Форуму. Гэта было ў 2020-м годзе. Але калі наступіла лета, стала зразумела, што міжнародным гэты вяяж пакуль не стане. А вось рэспубліканскаму — быць! Так, першы ў гісторыі краіны маладзёжны цягнік пад назвай "#БеларусьМоладзьНатхненне" адправіўся 17 ліпеня 2020 года ў сямідзённы маршрут па ўсіх рэгіёнах. Навошта? А каб вось такім крэатыўным чынам садзейнічаць аб'яднанню моладзі саюзных дзяржаў. Ну, і, вядома, паўплываць на фарміраванне пазітыўнага іміджу краіны. Ды выхаваць патрыятычны дух у маладога пакалення. Уласна кажучы, гэта і была галоўная задумка праекта.

Стаць удзельнікам ужо другога Рэспубліканскага маладзёжнага цягніка сёлета мелі магчымасць маладыя людзі ва ўзросце да 31 года. Дастаткова было для гэтага адправіць заяўку і расказаць пра свае дасягненні ў сферы адукацыі, навукі, спорту, культуры ці сацыяльнай дзейнасці. Было пададзена 200 зваротаў, з іх адабралі 100 удзельнікаў. Сярод іншых — Вікторыя Мяхедка, намеснік старшыні Рэспубліканскага творчага маладзёжнага грамадскага аб'яднання "Рух наперад моладзі". Гэтая арганізацыя займаецца развіццём творчага патэнцыялу маладых людзей, імкнецца як мага часцей уцягваць іх у грамадскае жыццё краіны. А таксама шанаваць традыцыі. Важную ролю, па словах Вікторыі, яны аддаюць захаванню гістарычнай праўды пра вайну. А яшчэ акцэнтуюць увагу на здаровым ладзе жыцця і



спрыяюць умацаванню адносін паміж славянскімі народамі.

Мяркуючы па фота і відэа, якімі Вікторыя шчодра дзялілася ў інстаграме падчас паездкі, праграма сямідзённага тура была вельмі насычанай. Таму пасля вяртання ў сталіцу, я адразу запрасіла яе на сустрэчу. Бо, як вядома, першыя ўражанні — самыя яркія.

— Наш вяж пачаўся з Гродна. Пасля арганізацыйных момантаў, нас адразу запрасілі на вячэрнюю экскурсію па Гродне. Потым былі інтэлектуальная віктарына і танцавальна-забаўляльныя імпрэзы "Гродна — маладзёжная сталіца". Мы трапілі ў мясцовы заапарк. Я вельмі люблю ўсялякіх звяркоў, і такі мілы пачатак вяжу — вельмі дарэчы. Пасля заапарка мы адправіліся добраўпарадкоўваць алею, закладзеную ўдзельнікамі леташняга праекта "Рэспубліканскі моладзевы цягнік "#БеларусьМоладзьНатхненне". Вось так паволі праект набіраў хуткасць. Ну а потым — дзе мы толькі не былі!.. У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце Янкі Купалы, у Лютэранскай царкве Святога Яна, у Доме-музеі Элізы Ажэшкі... Ускладалі кветкі да брацкай магілы савецкіх воінаў і партызан. Вельмі кранальная была цырымонія перадачы Дзяржаўнага сцяга Беларусі ўдзельнікам маладзёжнага цягніка ў рамках Рэспубліканскай акцыі "Сімвалы маёй краіны". У такія моманты адчуваеш сябе непадзельнай часткай цэлага, адчуваеш асабістую адказнасць за тое, што адбываецца зараз. А пазней у нас быў адкрыты дыялог "Моладзь: рэаліі сучаснасці" з удзелам знакамітых людзей Гродзеншчыны і спартсменаў.



Прыемна разглядаць краявіды сінявокай пад гукі колаў

***— І гэта ўсё, што ты зараз пералічыла, адбывалася ў адзін дзень?***

— Так! І хачу заўважыць, я нават не ўсе пункты актыўнага першага дня пералічыла. Яшчэ быў начны парад удзельнікаў маладзёжнага цягніка на электрасамакатах. І нават адпраўка нашага цягніка праходзіла ва ўрачыстай абстаноўцы.



***— І куды вы рушылі потым?***

— У Полацк. Там мы ўдзельнічалі ў дабрачыннай акцыі "Аднаўленне святынь Беларусі", а пасля — у адкрытым дыялогу "Моладзь. Асвета. Адзінства". Была экскурсія па Спаса-Еўфрасіннеўскім жаночым манастыры. Мітынг і ўскладанне кветак да мемарыяльнага комплексу "Урочышча Пескі" — наступны пункт у нашай насычанай праграме. Ну, і вядома, пагулялі па гістарычным Полацку, дзе адшукалі геаграфічны цэнтр Еўропы.

***— Падчас маладзёжнага турнэ вы сустракаліся з прадстаўнікамі ўлады, наколькі я ведаю?***

— Гэта так. У нас была адкрытая дыялогавая пляцоўка з Міністрам адукацыі Беларусі і Міністрам адукацыі Новасібірскай вобласці. Некаторыя з удзельнікаў былі якраз адтуль. Гэта адбылося ў Віцебску, 17 ліпеня.

***— У тыя дні ў Віцебску праходзіў XXX Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Не зазірнулі туды "на аганёк"?***

— Не толькі зазірнулі, але і ўзнагароджвалі пераможцаў нацыянальнага фестывалю-конкурсу "Агонь маладзёжных талентаў". Ён праходзіў у рамках "Славянскага базару". Так што, магу сказаць, і "падыхалі" конкурсным паветрам, і прасякнуліся фестывальнай атмасферай, якая вітала ў Віцебску ў той час.

***— Які дзень быў самы насычаны і чым ён запомніўся?***

— Складанае пытанне, бо мы былі занятыя з раніцы і да вечара, кожны дзень. Пачыналася ўсё традыцыйна з мітынгу і ўскладання кветак да помнікаў. Затым, у горадзе Горкі, напрыклад, мы наведалі рэсурсны цэнтр аграпрамысловага напрамку... А ў Петрыкаве трапілі ў горна-абагачальны камбінат "Беларуськалій". Я столькі фатаграфій там зрабіла! І ўзяла сабе "кавалачак памяці" — каменьчык. Гэта неверагодныя эмоцыі: калі ты на свае вочы бачыш тое, пра што чуў ці бачыў па тэлевізары. Зусім па-іншаму ўспрымаюцца рэчы, да якіх можаш дакрануцца ўласнымі рукамі. Так, у кожным горадзе мы наведвалі гістарычныя культурныя месцы і месцы памяці. Усюды ў нас былі адкрытыя дыялогі з прадстаўнікамі мясцовай улады, дзе мы абмяркоўвалі надзённыя праблемы: кадравай палітыкі, працы, захавання адзінства. Нават пытанні арміі, абароны краіны абмяркоўвалі. Напрыклад, у Мар'інай Горцы.

***— Вікторыя, я бачу, што табе вельмі спадабаўся сямідзённы тур. Хацела б яшчэ раз так праехаць з карысцю для справы?***

— Вядома! Я абедзвюма рукамі "за"! Перакананая, што такія праекты павінны быць, іх трэба ствараць як мага больш. Бо гэта не толькі пазнавальна. Гэта рэальна аб'ядноўвае нас — моладзь. Ды і не толькі моладзь, мне здаецца. Калі разам робіш нейкую агульную справу — гэта не можа не аб'ядноўваць. Адчуваеш сябе часткай цэлага. Адчуваеш сябе датычнай да нейкага глабальнага працэсу. Разумееш словы: "мы — будучыня", "наша будучыня пачынаецца сёння". Гэта сапраўды так і ёсць! І вельмі сімвалічна, што ў Год народнага адзінства Рэспубліканскі маладзёжны цягнік аб'ядноўвае ў сабе моладзь з усіх рэгіёнаў краіны. Нездарма і слоган у нас быў "Беларусь. Моладзь. Адзінства".

***— Ну а ў Мінску — на плошчы Дзяржаўнага сцяга — ва ўрачыстай абстаноўцы, ведаю, Міністр адукацыі ўручыў кожнаму з удзельнікаў сертыфікат...***

— Так, цяпер у мяне ёсць яшчэ адзін сертыфікат, які зойме бачнае месца ў маёй калекцыі дыпломаў і сертыфікатаў. А калі сур'ёзна, я вельмі натхнёная і гару новымі ідэямі. Так што ёсць чым заняцца на працы, у нашым маладзёжным аб'яднанні.

Аліса **Гюнгер**




Каля геаграфічнага цэнтра Еўропы ў Полацку



Разам з Міністрам адукацыі ў фінале праекта



У Гродзенскім заапарку

*«Калі разам робіш нейкую агульную справу – гэта не можа не аб'ядноўваць. Адчуваеш сябе часткай цэлага. ...Адчуваеш сябе датычнай да нейкага глабальнага працэсу. Разумееш словы: "мы – будучыня", "наша будучыня пачынаецца сёння"... У Год народнага адзінства Рэспубліканскі маладзёжны цягнік аб'ядноўвае ў сабе моладзь з усіх рэгіёнаў краіны. Нездарма і слоган у нас быў "Беларусь. Моладзь. Адзінства"*



Удзельнікі праекта




Кожнаму ўдзельніку праекта — сертыфікат

# УЗДОЎЖ МЯЖЫ – ПЕШШУ



Працяг. Пачатак ў №2,3,4,6

У той, 12-ы дзень вандроўкі раніца была халаднаватай. Начавалі ў лесе за вёскай Медрыкі: Смаргонскі раён. Прачынацца не хацелася: праяўлялася стома штодзённай хады. Настрой, аднак быў прыўзняты, бо месца на начлег выбіралі без дыскусіі, дзе стаць лепш. У каторы раз пераконваемся, наколькі моцна ўплывае настрой на фізічны стан. Таму і выйшлі на маршрут аж у 10.15, сабраўшыся без спеху. Тое-сёе нават падрамантавалі.

Праходзячы мястэчка Солы, зайшлі ў касцёл. Пасядзелі там падчас службы. Гучаў арган. Касцёл пабудаваны перад вайной на сродкі прыхаджанаў. У касцёле звярнулі ўвагу на дошку-памятку пра мясцовых жыхароў, хто загінуў ў часе войнаў. Тыя, у каго мы пыталіся, не ведаюць: адкуль назва Солы. Нават старэйшыя.

Ідучы ў Кушляны, прадаўжалі падлікі сустрэтых буслоў: 56. І пачынаем блытацца паціху, дзе раней начавалі ды што было там адметным. Таму занатавалі сёе-тое для памяці. А зранку ў той дзень слухалі радыёперадачу "Беларуская маладзёжная": нашы калегі праводзілі 26 красавіка радыёмарафон, прысвечаны 10-годдзю Чарнобыльскай трагеды. Лагоднасць і цеплыня ў прыродзе, прыгожы ранішні лес, у якім начавалі, спрыяў добраму настрою. Каб дайсці да Кушлян, мясцін, звязаных з Францішкам Багушэвічам, мы адхіляліся ад асноўнага маршрута — рухаліся з Медрыкаў на Солы, далей на Асіпаны, Гаўдзевічы ды Кушляны.

Запіс Івана пасля гутаркі з вясковым дзедам пры дарозе: "От, хай бы той бусел і быў," — кажа дзед. Ён і рамаў старых назацягваў на старыя дрэвы пры хаце — а буслы чамусьці ў яго не вядуцца. У ліпе, кажа, ім дакучаюць пчолы. Мы пра такое і не ведалі — а вось жа... Не ўсе суседзі буслам падабаюцца. Затое сарока, прадоўжыў дзед, "без усяго вывелася". Значыць, спрабуем разважаць, можа не ўсё ў парадку ў дзеда з энергетыкай — бусел не селіцца абы дзе.

Развагі яго ж наконт нацыянальнасці: "Мы ж — палякі. Бо ходзім да касцёла і молімся па-польску. У нас вера польская. Бацькі былі палякамі. Тут была Польшча да 1939 года"... А вось паэт Алесь Жамойцін аніколькі не сумняваецца ў тым, хто ён ёсць.

***Сустрэча з паэтам Алесем Жамойціным, які пажадаў нам моцы і святла на духоўнай дарозе*.**

Як прыйшлі ў Кушляны, то адразу — на пошту. Паставілі пячатку: знак таго, што мы там былі. Заадно даведаліся, дзе знайсці Алеся Жамойціна, мясцовую знакамітасць.

Наступны прыпынак — Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча. Знаёмімся з наглядчыцай, Рэгінай Сідаровіч, вельмі прыветнай жанчынай. Пакуль чакаем Алеся, яна расказвае, што нарадзіўся Францішак Багушэвіч у Свіранах — цяпер гэта Вільнюскі раён — 9 сакавіка 1840 года. Вучыўся ў Віленскай гімназіі... Памёр у 1900-м... А магіла яго — у Жупранах, пры касцёле на могілках. Тыя агульнавядомыя, даступныя і ў інтэрнэце факты пазначаем у дзённіку.

Музей Багушэвіча — наводдаль ад вёскі, якраз там, дзе была яго сядзіба. Помняцца прыгожыя краявіды-прасторы навокал, і што прагуляліся мы па алеі да альтанкі. Вось як пішуць пра яе ў інтэрнэце: "На тэрыторыі сядзібы захаваўся парк, дрэвы ў ім саджаў сам пісьменнік. Адна з алей, каштанавая, вядзе да любімай альтанкі паэта — месца яго творчага натхнення на Лысай гары". Краязнаўцы сцвярджаюць, што Багушэвіч будаваў яе разам з сябрамі ў памяць пра ахвяры паўстання 1863-64 гадоў, у якім і сам актыўна ўдзельнічаў. Раней у альтанцы стаяў драўляны крыж (не захаваўся), і называлася месца тое "Распятай воляй". Недалёка, на ўзлессі, яшчэ адзін важны элемент ансамбля: камень-патайнік. Кажуць, пад ім беларускі класік хаваў свае рукапісы, каб пазбегнуць ганенняў за вальнадумства. Пасля смерці пісьменніка невядомы майстар на камені выбіў надпіс у памяць пра Мацея Бурачка (псеўданім Багушэвіча).

Алеся Жамойціна ўрэшце дачакаліся. Перад тым заходзілі да яго дадому, ды нікога не засталі. Заўважылі: у вядры з вадой на падворку, пры доме, ляжала сякера. Відаць, гаспадар

збіраўся калоць дровы. Бо з вясковага досведу Іван ведае: сякерышча ад вільгаці разбухае, сякера мацней на ім сядзіць. І вуллі былі пры сядзібе: Жамойцін яшчэ і пчаляр. На той час цяперашні загадчык Музея-сядзібы Францішка Багушэвіча "Кушляны" трымаў і ўласнага каня, скарыстоўваючы яго і па гаспадарцы, і дзеля патрэбаў музея.



TOMKAD.LIVEJOURNAL.COM

## Нататкі пра падарожжа, якое пакуль ніхто не паўтарыў

Працаваць у музеі паэт пачаў у 1988-м, прыкіпеў, казаў, сэрцам да гэтага краю. Сам Алесь з Брэстчыны: родам з вёскі Малахоўцы Баранавіцкага раёна. У музеі пачаў навуковым супрацоўнікам, а з 1989-га — загадчык музея, дырэктар. Кушлянскі перыяд жыцця і творчасці Алеся Жамойціна звязаны з рэстаўрацыяй сядзібы, арганізацыяй новай экспазіцыі, наданнем музею сапраўды мемарыяльнага статусу. Музей-ся-дзіба "Кушляны" заснаваны ў 1990-м у рэканструяваным доме, які Францішак Багушэвіч пабудаваў у 1896-м і правёў апошнія гады жыцця. Дом той — адзіны, відаць, на ўсю Беларусь аўтэнтычны прыклад пісьменніцкай сядзібы XIX стагоддзя. Там і вядзе справы Алесь Жамойцін, дасведчаны ў многіх таямніцах жыцця, спадчыны паэта, знаёмы з яго нашчадкамі. Бывае ў яго і за дзве тысячы экскурсій на год, і для кожнай групы шукае свой падыход. Дарэчы, пра тое ды наогул пра нашага крэатыўнага суразмоўцу ёсць падрабязныя звесткі ў Баранавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы, пісала пра яго і "Гродзенская праўда".

Па ходзе размовы з Алесем і пасля рабім запісы. У той час ён займаўся навуковай працай, вывучаў ёгу, акультызм і міфалогію "з праекцыяй на Беларусь". Гадоў 20 збіраў матэрыялы. А ў 1996-м у навукоўца, як ён прызнаўся, была "стадыя сістэматызацыі". Да таго ж удзельнічаў у ансамблі народнай музыкі, для якога нават сінтэзатар набылі. А дачка Зарынка, пахваліўся, піша музыку. На тую пару сеткавае радыё ў Кушлянах ужо зліквідавалі. Гаворым наогул і пра рэчы глабальныя. Пра сусветны крызіс, напрыклад. І пра тое, што вучоны-сацыёлаг Бястужаў-Лада, па словах Алеся, "дае цывілізацыі 60+20 гадоў, каб адумацца і не скаціцца канчаткова ў прорву". Жонку паэта завуць Тэрэза, ёсць у іх і дачка Вольга.

Яшчэ ў памяці засталася вячэра са смачнаю варанаю бульбай: гаспадары накрылі гасцям стол. Мы іх распытваем пра жыццё, яны нашымі планамі цікавяцца. Тэрэза расказвае пра містычныя падзеі ў тых месцах. Як у 1996-м перад Калядамі пацыенты шпіталю ў Смаргоні бачылі: днём з'явілася ў небе вясёлка, і яе канцы злучалі касцёл і царкву. Потым у адной з палат было з'яўленне Маці Божай, Ісуса Хрыста — на праваслаўныя Каляды і на Грамніцы.

Пазней мы запісалі ў дзённік, што ў Алеся Жамойціна ёсць спроба паяднання жыцця на зямлі з жыццём у сферах духоўных, сферах ведаў. Свой конь, карова, каза, свінні, куры… І нават сабачка, нямецкі шпіц — але ж ёсць і заняткі навукай, жаданне адухавіць зямлю, зразумець, дзе мы жывём. Адкуль мы, і як нам жыць далей. Жонка больш займаецца гаспадаркай і дзецьмі, Алесь — навукай і пчоламі. Кажа: падабаецца яму асяродак вясковай інтэлігенцыі. Там адзначаюць угодкі знакамітых людзей, надаюць увагу жыццю душы.



MUSEUMS.BY

Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны"



GRODNONEWS.BY

Алесь Жамойцін цудоўна ведае спадчыну Францішка Багушэвіча



Жупранскі краявід з касцёлам

*Гатычны касцёл святых Пятра і Паўла, так званы Петрапаўлаўскі касцёл — галоўная славутасць аграгарадка Жупраны, пабудаваны ў 1854 годзе. Само паселішча знаходзіцца ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці; на ўчастку трасы Р63 паміж Смаргонню і Ашмянамі. Жупраны вядомыя тым, што з 1407 года вёскай валодалі Радзівілы. Але сапраўдную папулярнасць вёска набыла ў XIX стагоддзі.*

Але мы так і не зразумелі: ці рэалізуе Алесь свой творчы патэнцыял у глыбінцы? Ці зарыентаваны ў пошуках на плён працы ўжо дасведчаных у навуках людзей? Ці ўмее даць "кожнаму па свядомасці"? Хочацца ў тое верыць. Так мы думалі-пісалі тады. Рады ён, што знайшоў у Крэве (нарэшце!) язычніцкае капішча. Падобнае, казаў, да знакамітага Стоўнхенджа! З рознымі ўзроўнямі камянёў, з месцам для галоўнага Агню-Зьніча. Ён таксама сцвярджаў, што друіды — гэта былі дасведчаныя людзі з кельтаў. А кельты ж — з арыяў, і цалкам магчыма, што друіды ў назвах па поўначы Беларусі пакідалі знакі сваёй прысутнасці: Друя, Друйка, Дрывяты, Дрысвяты... Да таго ж, па словах Алеся, рэлігія зораастрыйцаў ёсць у аснове спрадвечнай веры беларусаў — нашага язычніцтва.

Як абярэг нам у дарогу Алесь Жамойцін намаляваў у дзённіку на 60-й старонцы раўнабедраны трохкутнік са знакамі-сімваламі, упісанамі ўнутры яго. А ўнізе надпісы. "І рече Бог да будеть свет! І бысть свет!" (Скарынінская Біблія). Далей пажаданне: "Моцы вам і святла на духоўнай дарозе! Алесь Жамойцін. 26.VI.1996. Кушляны". І выгарала ўжо за 25 гадоў без пасты адбітая пячатка: "Музей-сядзіба... Кушляны".

Ад Жамойціных позна выбіраемся і рухаемся ў красавіцкую ноч: каб знайсці начлег у Жупранах, у школе. Ад Кушлян да Жупран кіламетраў 10. Спачатку да трасы (на картах дарога Р-63: Ашмяны — Смаргонь), потым улева па ёй у бок Ашмян. А цемень ужо беспрасветная. Калі глянуць на карце участак, ад Асіпан да Жупран, то ўбачыш немалыя лясныя масівы справа ад дарогі. Як жа яны запомніліся нам! Вільготна было ў паветры — прайшоў дождж. І неяк трывожна, як тое апісваецца ў якім-небудзь творы-фэнтэзі. Хмары. Цемра. І лес надта цямнюшчы. А яшчэ, як цяпер кажуць,"крутая" доўгая чорная машына некалькі разоў прыпыняецца, бы суправаджае нас. Як танцуе: то ўперад паедзе, то дасць назад. Нехта, пэўна ж, праз зацемненае шкло нас разглядае. Пра тое мы прыцішана гаворым, а імкнемся не глядзець у бок аўто. А хто ў ім? Для чаго за намі назірае? 90-я ж гады, і ўсяго на дарогах хапала. Іван дык на ўсялякі выпадак выцягвае з пакункаў ды кладзе сякеру бліжэй, пад руку: каб у выпадку чаго паспрабаваць абараніцца. І нават чытаем малітвы, і стараемся не ўпадаць у трывогу — не падпарадкоўвацца страху, хоць яўная небяспека ёсць, як кажуць, зусім побач — руку працягні...

Абышлося. Магчыма, перагаворваемся, гэта святая Еўфрасіння нас абараніла. Яе заступніцтва, мы ў тое верым, было з намі ва ўсім "Хаджэнні ў трыдзясятае царства". А чорную машыну ў чорным лесе часта згадваем. Бадай, тое быў адзіны вялікі страх, які спрабаваў нас на моц ў вандроўцы. Таму і сон у тую ноч быў трывожны.

**Дзень 13-ы. Жупраны — Каменка. Школа ў Жупранах. Дзеці-школьнікі, іх уяўленні пра шчасце і асноўны закон у Сусвеце. Касцёл у Жупранах ды помнік Францішку Багушэвічу. Садзім каштаны.**

Апісанне дня падаецца ў адпаведнасці з падрабязным зместам дзённікаў, які зрабіла Валя восенню 1996-га, праглядваючы запісы.

Учора, 26 красавіка, прайшлі 29 км. Дзень быў напружаны і па хадзе, і па сустрэчах. Начавалі ў Жупранскай школе-інтэрнаце. Прыйшлі позна вечарам, а скіравала нас туды наглядчыца музея: дачка-настаўніца ў школе працуе. Пакладаліся позна, бо апынуліся на школьным падворку ў 22.30. З дзённіка (піша Валя): "Іван адразу

пайшоў дамаўляцца ў інтэрнат. Я ж у поўнай цемры адна, хвілін 20, яго чакала — разам з чорнаю кошкай, што круцілася побач. І трохі баялася: нібы нейкія шматкі "страху з чорным аўто" да думак ліплі. Спалі па-паходнаму, між ложкамі на падлозе: складана было раскруціць спальнікі. Раніцай, як прачнуліся, хутка сабраліся, бо запрасілі нас у школу: на сустрэчу з вучнямі старэйшых класаў. Падлеткі — з прасветленымі тварамі. Падаравалі хлопцу і дзяўчыне нашу візітку. (Хто, жупранцы, тую сустрэчу памятае? Адгукніцеся!) Ды яшчэ дзяўчынцы Тоні гаварыў Іван пра асноўны закон быцця: закон прычын і наступстваў. Пра тое, што чалавек заўсёды, кожны момант робіць нейкі выбар. Пра вучэнне зараастрызму... Дырэктарка школы — вельмі прыемная жанчына. Мяккая жаноцкасць ёй уласцівая ў адрозненне ад дырэктарак строгіх і "властных", калі не сказаць жалезных. На дарогу дала нам цукерак!"

На сустрэчы задаем вучням 8, 9 і 10 класаў пытанне: што шукаюць людзі ў трыдзясятым царстве? Адказваюць: шчасце, лепшую долю, сваю каханую... А на другое пытанне, пра асноўны закон у свеце, гавораць: любоў да бліжняга. Па ўсім бачна, што ў Жупранах дзеці выхоўваюцца ў хрысціянскім духу. Дарэчы, цяпер гэта — "Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К. Багушэвіча". На той час у школе было 222 вучні і 24 настаўнікі. А настаўнік геаграфіі ды спявак Віктар Кавалёнак — падарожнік, як і мы. Вандруе, водзіць паходы на лодках і раварах.

А вось што казала нам дырэктарка школы Соф'я Іосіфаўна Кавалёнак. Яе развагі — у дзённіку. Цытуем:"Хацелася б зрабіць больш. Але паглынаюць шмат часу і сіл гаспадарчыя справы. Зімой, напрыклад, вельмі мерзлі: бо выйшла са строю кацельня. Грэлі батарэі на працягу тыдня паяльнымі лямпамі — бацькі паклапаціліся. Што тычыцца духоўнасці, то лічу: законы дабрыні — асноўныя ў свеце. Я ўсё магу вучням даравацъ, акрамя падману. І каб не білі адно аднаго". Дачку сваю, якая вучыцца ў 8 класе, акрамя таго спявае, удзельнічае ў конкурсах, спадарыня Соф'я імкнецца так выхоўваць.

З размовы з дырэктаркай мы яшчэ помнім, як яна з гордасцю згадвала пра тое, што ў школе бываў вядомы зямляк Франц Клінцэвіч, расійскі палітык, кандыдат псіхалагічных навук — ён родам з вёскі Крэйванцы Ашмянскага раёна. Нарадзіўся ў 1957-м. У 2006 годзе яшчэ рашэннем Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў за адвагу і самаадданасць, праяўленыя пры выкананні воінскага абавязку (удзельнічаў у баявых дзеяннях у Афганістане; палкоўнік запасу. — **Аўт.**) , вялікі асабісты ўнёсак у развіццё і ўмацаванне сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй, актыўную грамадскую дзейнасць на карысць




TOMKAD.LIVEJOURNAL.COM

Магіла Францішка Багушэвіча ў Жупранах

горада Ашмяны і Ашмянскага раёна прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны". Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай зоркі, ордэнам Пашаны, Дружбы, ордэнам Аляксандра Неўскага, ордэнам "Пашаны" Рэспублікі Беларусь, ордэнам "Зорка" III ступені Рэспублікі Афганістан, 12 медалямі СССР і Рэспублікі Афганістан.

Пасля сустрэчы ў школе ідзем у касцёл, які быў пабудаваны ў 1875 годзе. Знаёмімся з ксяндзом Кшыштафам. Цяперашнія звесткі пра гэты храм наступныя: "У 1875-м храм дабудаваны і асвечаны 12 кастрычніка 1875 года ў імя апосталаў Пятра і Паўла". І яшчэ: "каля 1550 г. — заснаваны першы драўляны храм. Канец XVI стагоддзя — прыстасаваны пад кальвінскі збор. 1854 г. — пачатак будаўніцтва мураванага касцёла па фундацыі графа А. Чапскага. У працах прымаў удзел будучы беларускі пісьменнік Францішак Багушэвіч. Праз недахоп грошай і паўстанне 1863 году будаўніцтва было прыпыненае".

Помнік Багушэвічу стаіць і ў аграгарадку Жупраны. Пастаўлены ён у 1958 годзе ў скверы. Аўтар помніка — вядомы скульптар Заір Азгур.

З запісаў Івана пасля гутаркі з ксяндзом: "Людзі ў Жупранах у большасці — палякі. Па-беларуску ў касцёле не моляцца, хоць кожны святар адкрыты да нацыянальнай мовы. Літургічная частка — на лацінскай ідзе. Няма вывучэння катэхізісу і ў школах. І ксёндз у школу не ходзіць...Тут ёсць такое падзяленне: як католік — то паляк, як праваслаўны — то рускі. Пётр і Павел — патроны касцёла".

Ксёндз яшчэ казаў, што дзяцей 30-40 у касцёл ходзяць. У паселішчы на пахаваннях алкаголю няма: такі ён завёў парадак: "Водка, — тлумачыў, — не патрэбная ні памерламу, ні п'яніцу яшчэ жывому. І як няма яе, то ёсць эканомія. Хто цэніць алкаголь — няхай шукае іншага ксяндза: я не хачу ўдзельнічаць у такой імпрэзе". Некаторыя запісы ў дзённіку ідуць пра асаблівасці каталіцкага набажэнства, жыцця вернікаў. Пазначаем, што святар свой час размяркоўвае сам. Гаворым пра ружанец, святарскую малітву, імшу...

З намі яшчэ гутарыла, праводзіла нас да магілы Багушэвіча школьная тэхнічка Тацццяна Багушэвіч — на той час завочніца Варшаўскага педуніверсітэта. Крыж на магіле Францішка Багушэвіча пастаўлены быў да ягонага 150-годдзя ад часу нараджэння. І партрэт у касцёл вернуты — да 150-х угодкаў. Тацццяна ж расказала, што ў былой плябані адкрыты араторыум — дом для моладзі. У той час вера вярталася ў паўсядзённае жыццё жупранцаў.

Далей у дзённіку невялічкі запіс ужо ў Ашмянах. Анічога прыкметнага







Каменка. Фота на памяць. Марыя Місевіч (злева ад Валянціны) разам з сынам Ігарам і пляменніцай Таццянай.

для нас там не адбылося: толькі пазначаны тэлефон галоўрэда газеты "Ашмянскі веснік" Юрыя Мікалаева, і што рэдакцыя месціцца па вул. Савецкай, 36. Патрапілі мы ў райцэнтр у суботу, 27 красавіка, ды яшчэ ў абед: не працавала рэдакцыя. А тое, як высадзілі 5 кушлянскіх каштанаў пры дарозе ад Ашмянаў (за 4-5 км), помніцца. Было вельмі холадна, ішлі мы ў цёплых куртках. І, абедаючы, нават грэліся ля вогнішча.

***З вялікай ўдзячнасцю — пра бібліятэкарку Марыю Місевіч. Яе гасціннасць і вялікую цікавасць да жыцця.***

По дарозе на Гальшаны начлежылі ў вёсцы Каменцы. Дом Уладзіміра і Марыі Місевічаў — пры дарозе, справа. Уладзімір на той час працуе на ферме, гаспадыня — бібліятэкарка. Знаёмімся. Бачна, як Марыя ўсхвалявана: журналісты з Мінска не кожны дзень на падвор'е заходзяць, ды просяцца яшчэ пераначаваць. Таму і спяшаецца пра ўсё расказаць. Малы сын Ігар — 6-гадовы, пляменніца Таццяна. Сашка — старэйшы. Сама закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Да Гальшанаў ад вёскі — 6-7 кіламетраў. Ёсць у Гальшанах гарадзішча і замак. А недалёка, пры вёсцы Людвікаўшчына, хутар Зялёнка, які мы прайшлі, жыве знахар Іван Казіміравіч Мацкевіч. Пытаем у Марыі: ці можна будзе ўранні туды схадзіць. Абяцае нам "конную экспедыцыю" — паехаць на возе.

Сям'я Місевічаў небагатая, але гасцінная. Нам адводзяць у доме цэлы пакой-святліцу. Марыя, шануючы гасцей, засцілае ложкі чыстымі прасцінамі, кладзе высокія падушкі... А мы, брудныя і здарожаныя, адчуваем сябе ніякавата, не хочам парушаць чысціню, і таму па вандроўнай звычцы ўладкоўваемся на падлозе, на свае спальнікі. Чым не ілюстрацыя, скажыце, беларускай ментальнасці: як з боку гаспадароў, так і гасцей...

А ўранні была сонечная нядзеля, шчасце-купанне ў ванне (упершыню за амаль два тыдні штодзённай хады), смачныя бліны гаспадыні і — дзень нараджэння яе старэйшага сына Сашы. А паколькі дарыць нам хлопцу не было чаго, то Іван напісаў яму верш, здаецца, на вандроўнай паштоўцы-візітцы. Хацелася падбадзёрыць ціхмянага, добрага, працавітага падлетка, які, паводле слоў маці, быў на той час не надта ўпэўненым у сваіх сілах. Пішучы нататкі ў 2021-м, разважаем: цікава, як склаўся лёс хлопца, кім стаў? Ці памятае Марыя нашу сустрэчу?

Канешне ж, памятае! Мы дазваніліся ў Каменку, і Ядзвіга Дакурна ўзялася дапамагчы зладзіць з ёй кантакт. Пераказала Марыі, што "знайшліся" падарожнікі-госці яе даўнія. Дарэчы, Ядзвіга вельмі добра гаварыла пра сваю аднавяскоўку. Яна жыве з малодшым сынам, Ігарам, той гэтым летам працуе памочнікам камбайнёра. Сын Саша, як і муж, пайшлі з жыцця. Марыя па-ранейшаму працуе ў бібліятэцы, і хоць лёс у яе няпросты, на жыццё не крыўдуе. Нас памятае: ані разу ж больш журналісты начлежыць да яе не прасіліся. Добра помніць, як вазіла нас да мясцовага знахара.

Памятаем і мы, як пасля снедання жыхары Каменкі назіралі такую карціну: мажная спадарыня Марыя, "восседая" з лейцамі на возе, вязе нас у саломе, разморaных купаннем і снеданнем, "сталічных журналістаў" — так прадстаўляла сустрэчным, на хутар да Казіміравіча. Ехалі "браць інтэрв'ю". Сустрэчы з лекарам не адбылося (гаспадара не заспелі дома), але ж былі мы ве-е-льмі задаволены вандроўкай! Асабліва гараджанка Валя, для якой паездка на вазку — экзотыка. Тым больш пасля двух тыдняў хады...

Тут варта заўважыць: ідэю цалкам пешага хаджэння вакол Беларусі той парадны выезд на возе анікольki не парушыў! Бо мы з'ездзілі "да Казіміраві-

ча" і назад — хто жадае, гляньце па карце! — пройдзенай намі дарогай. Потым вярнуліся ў Каменку, сабралі-спакавалі каляску-Лялечку, сфатаграфаваліся на памяць з Марыяй і дзецьмі ды рушылі па шашы далей, на Гальшаны з іх знакамітым замкам. А верш для Сашы Місевіча няхай застанецца на старонках часопіса: як памяць пра яго.

У вершы ёсць пажаданне веры і моцы. На жаль, Саша моцным не стаў... А пра знахара нам расказвала яго дачка, Леона Мацкевіч. Гаварыла, бацьку ад Бога сіла дадзена, каб лячыць людзей. Ён настоі робіць — з траў ды кветак. Дапамагае тым, у каго псарыяз, эпілепсія, ушчамленне нерва... У яго "сільны, бальшы гіпноз". Гадоў шэсць ужо людзей лечыць. "Нітку вывяжэ і за руку хворага падзержыць. А бывае, што патрымае руку і ўжо расказвае, што каму баліць." У адной жанчыны быў страшны зубны боль. Таблетак наелася, а не прайшло. А ён вылечыў. Нервовая сістэма калі ў каго не ў ладзе — супакойвае, потым здымае стрэс. Неяк нехта нагу зламаў, дык таму чалавеку тата зняў боль. І нага сама сабой зраслася, без гіпса: быў закрыты пераломам. Суправаджае лекаванне малітвай. Кнігі чытае. Ён католік, ходзіць да касцёла. Раней хадзіў у калгас. Цяпер на пенсіі.

Як мы зразумелі, лекар усё на сабе правярае — усе рэцэпты, якімі карыстаецца, а потым і людзям раіць. Па словах дачкі, цікавасць да лекавання ў бацькі выклікаў нямецкі ўрач, жыў у тых месцах, "застаўся з вайны". Тады Іван Казіміравіч маленькім быў, але нешта ў ім ускалыхнулася. У дзяцінстве, як пабіўся моцна, заўважыў: падзяржаўся рукой за пабітае месца — і прайшло. Усё ягонае жыццё праходзіць у вялікай працы. Да 33-х і не берогся, не звяртаў увагі на здароўе. Раз на дзень есць, а то і зусім не — пакуль усіх не прыме. Строгі да п'яніц, як выпіваеш — ён цябе і лячыць не будзе.

Хата знахара — пры дарозе з Ашмянаў на Гальшаны справа, слупок пры ёй: 54 км. Ідзем на Гальшаны. Адчуваем, што добра адпачылі. Засталася за неба-схілам гасцінная Каменка, і хвілін праз 45, як у нас было заведзена, робім невялічкі прыдарожны перадых.

Мясцовасць там узгорыстая: найбольш узвышаныя мясціны ля Каменкі, казалі нам, называюць Каўказамі. Ад хады па такой дарозе, як па вялізарных хвалях, ад пругкай радасці пераадолення сябе пасля разморанасці ўзнікае ў душы адпаведны настрой. У дзённіку ёсць такі запіс Валянціны: "Іван напісаў цудоўны верш, які прысвяціў мне". А гэта большпозняя рэмарка Івана пра Валю: "Яна годна і мужна пераносіла ў даволі няпростым 120-дзённым пешым падарожжы разам са мной усе выпрабаванні. Помніцца, як мяне ўшчуваў, ужо на Палессі, адзін сустрэчны: "Ну, з табой зразумела — захацеў, пайшоў. Ты моцны мужык! А навошта жанчыну мучыш?". Паклон табе і ўдзячнасць, мая спадарожніца!".

Шукаючы ў "Хаджэнні..." сярод іншага і адказ на пытанне: "Што такое шчасце?", мы чулі розныя меркаванні на гэты конт. І ўрэшце, асэнсоўваючы назбіраны вопыт, знайшлі такую яго формулу: шчасце і ў тым, каб у працы не таміцца — працай радавацца. Вядома ж, гэта не азначае: гультаяваць альбо працаваць напаўсілы. Тут найперш важны аптымістычны настрой душы на працу. І душэўная настроенасць вылушчыць радасць ад зробленага.

"Гэтая работа нас пазадушвае, працуем як рабы" — і такое мы чулі ад людзей, з якімі сустракаліся. І гэта, на жаль, зусім не працоўны настрой, а жыццё ў стрэсе, разбалансаванасць, а то і хвароба душы. З такім настроем і томішся хутка, і радасці ад працы не адчуваеш, і хваробы, сапраўды, побач ходзяць, каб "задушыць". А сустракалі ж мы і аптымістаў, якія робяць свае справы ў светлым настроі: "Дзякуй Богу, што дае сілы працаваць, здабываць хлеб сабе і блізкім. Дзякуй Богу, што я магу навесці парадак у сваёй гаспадарцы, што будзе прыбытак у дом". Пагадзіцеся, гэта ўжо зусім іншая працоўная мелодыя!

Калі напружваць свядомасць, трымаць такі настрой у душы, то, нават і моцна стаміўшыся, як мы ўжо казалі, будзеш адчуваць радасць. Настрой душы — мусіць, менавіта ён стамляе ці бадзёрыць нас у працы. А найлепшы, найсалодкі адпачынак — вядома ж, пасля моцнага напружання і зробленай справы. Радасць ад працы, радасць ад спакою і адпачынку — думаецца, гэтак лепш жыць, каб не наракаць потым ні на лёс, ні на людзей, ні на Бога.

У Гальшанах пабачылі цуд. Штук 5 двароў — нумары дамоў прыкладна 60-65 — стаяць пры Замкавым узвышшы — на ручаі. Яго вада ў руху ўвесь час. Уверсе пад гарою ёсць крыніца. Ручай без назвы. (Магчыма, пазней глянулі, гэта ручай Карабель? Такая назва сустракаецца ў апісаннях гальшанскіх краязнаўцаў.) Ручай упадае ў рэчку Гальшанку. З яго п'юць каровы, у ім людзі мыюць твары ўранні. З яго бяруць ваду для пiцця. Калі пусціць па ручаі караблік, то ён заплыве да рэчкі Беразіны. Вось які цуд. Але ж людзі з ім звыкліся. Таму і не лічаць ручай пры хатах вялікім цудам. Бо ён заўсёды побач. А тое, што побач і заўсёды, для нас — гэта звычайнасць, рэальнасць.

Нават уявіць такое прыемна: ва ўласным двары чысты ручай — паміж, скажам, домам ды садам! Не проста недзе за ваколіцай ці ля сядзібы. А ў двары! Нам бы такога хацелася.

Далей мы пайшлі да дырэктара краязнаўчага музея Эдуарда Корзуна дадому — і была нядзеля, і ён адпачываў... Але ж музей нам паказаць пагадзіўся... Цяпер няма ўжо на гэтым свеце Эдуарда Сямёнавіча, руплівага даследчыка Ашмянскага краю, а Гістарычны краязнаўчы музей у Гальшанах па праве носіць яго імя.

**Сашу з вёскі**
**Каменкі ў дзень 16-годдзя**

*Шаснаццаць!*
*І вясновая пара...*
*Дарог яшчэ наперадзе так многа!*
*Няхай сумненні ўсе*
*твае згараць*
*У полымі чаканых перамогаў.*
*І спраўдзяцца ўсе*
*мары! Толькі вер,*
*Што ўсё — у нас: і боль,*
*і радасць наша.*
*Дык выбірай,*
*і смела, шлях цяпер:*
*Усё-ўсё збудзецца,*
*як будзеш моцным, Саша!*

28.04.96, у вёсцы Каменцы Ашмянскага раёна.

Іван і Валянціна **Ждановічы**



# Вера Палякова: "Я ЧАЛАВЕК-СТВАРАЛЬНІК"

*Пра што галоўнае ў сваім жыцці Вера Палякова хацела б распавесці чытачам часопіса? З такім пытаннем мы звярнуліся да нашай суразмоўцы. А яна, як ведаем, жыве аднačасова нібы ў розных вымярэннях: як медыйная актрыса, тэлевядучая, кіраўніца тэатральнага праекту "ТриТформаТ", дацэнт кафедры вакалу, сцэнічнай мовы і пластычных дысцыплін Акадэміі мастацтваў Беларусі. Да таго ж Вера і дачка, і жонка, і маці...*

Урэшце гаварылі мы пра жыццё, тэатральныя пастаноўкі, пра новыя фарматы яе тэатральных паказаў, пра мужа, дзяцей і сяброў... А таксама пра тое, чаму год 2020-ы быў вельмі важным у яе лёсе. І што жыць, не напружваючыся, для Веры ніяк немагчыма, бо гэта сумна і наогул — нецікава. Неяк адна з калег сказала пра Веру Палякову, што яна — сапраўдная знаходка для журналістаў: яркая, бойкая, харызматычная і вельмі адкрытая. Так і ёсць. У чым і мы пераканаліся, размаўляючы з Верай. І што яшчэ б дадалі ў пералік, дык гэта — шчырасць. Непадробная прыродная яе якасць, якую не сыграеш проста так, нават маючы за плячыма дзясяткі роляў у тэатры і ў кіно: шчырасць альбо ёсць, альбо яе няма. Дык вось шчырасць Веры ёй вельмі да твару, яна да таго ж робіць артыстку чалавекам цёплым, сонечным, магнетычна прыцягальным.

***— Спадарыня Вера, псіхолагі сцвярджаюць, што ўсе мы складзены з мноства розных асоб, так званых субасоб. Пра якую з іх хацелі б вы з намі пагаварыць больш падрабязна? Якая вам у сабе найдаражэйшая і чаму?***

— Ой, не ведаю... На самой справе ўсё, што я раблю, у чым выяўляюся — мне падабаецца. Я настолькі люблю тое, чым займаюся, што не магу гэта хоць неяк прэпарыраваць. Мяне заўсёды здзіўляе, калі людзі кажуць: "Божа, як я стаміўся ці стамілася! Не хачу ісці на працу". Я таксама стамляюся, але ж я заўсёды хачу ісці і нешта рабіць. Нават у адпачынку не ляжу без працы на пляжы. Вядома, на лежаку знаходжуся, але аднačасова складаю новыя праекты, праводжу перамовы, з кім-небудзь спісваюся. Не бывае ніводнага горада, у які б я проста прыехала і не дамовілася пра гастролі свайго тэатральнага праекта "ТриТформаТ". Плануецца ў мяне адпачынак, я еду і ўжо думаю: абавязкова там з кімсьці пазнаёмлюся, дамоўлюся пра гастролі. Да прыкладу, мне вельмі хацелася б паказаць свае спектаклі ў Піцеры. Чаму? Наша рэжысёр з Ціхвіна родам, гарадка пад Піцерам, дзе яна заканчвала ВНУ, а потым вучылася ў Сяргея Салаўёва ў Маскве. І для яе было б крута паказаць нашы спектаклі ў Піцеры.

Хоць выкладанне, хоць мой тэатр альбо Тэатр кінаакцёра, і кіно, і тэлебачанне — гэта усё важныя часткі майго жыцця. І канцэртная дзейнасць таксама. Я ж бясконца вяду нейкія канцэрты, і сама ў іх выступаю, спяваю. Сёлета мы прадаўжаем "Цеплаходныя вечары". Летась, як навалілася пандэмія, не ведалі, куды сябе дзець. Я зрабіла 5 анлайн — два спектаклі, тры канцэрты, і падумала: усё, не магу больш анлайн! Трэба што-небудзь афлайн. І мы вынайшлі Музычныя вечары на цеплаходзе "Свислочь". Дамовіліся з людзьмі, якія ладзяць на ім прагулкі, пачалі выступаць. Аказалася, што адпачывальнікам гэта падабаецца! Па-першае, на свежым паветры як быццам і каронавіруса няма. Па-другое, зносіны цесныя. І па-трэцяе, там усё жывое: гук, спевы, рэакцыі, ніякіх дэкарацый. Ты імгненна рэагуеш на эмоцыі гледача. Прычым не ведаеш, хто сёння прыйшоў на цеплаход. У першы раз сабралося шмат людзей: месціцца там чалавек 30, было шмат і дзяцей. І мы з Арцёмам Давыдавічам — ён акцёр, іграе на гітары — пераглянуліся, кажу: а давайце выканаем для нашых дзяцей "Муху-цакатуху". І праспявалі казку цалкам. Усім спадабалася: дзецям і дарослым. Абсалютная імправізацыя! Звычайна ёсць нейкі сцэнарны план, якога прытрымліваемся. Але ў цэлым схільныя да імправізацыі. Выступаем там амаль кожную пятніцу.

***— Атрымліваецца, вы як вандроўныя артысты?***

— Так, толькі не вандруем, а плаваем. *(Смяецца).*

***— А з вамі можна ўсім, хто пажадае, паплаваць?***

— Так! Прыходзьце! З 7 да 9 вечара мы "ходзім у рэйс" кожныя 30 мінут: ад прычала ў Парку Перамогі, насупраць гатэля "Вікторыя", што на праспекце Пераможцаў. Там цеплаход і прапісаны, бачны з праспекта. Надвор'е сёлета выдатнае. Мы яшчэ летась анансавалі: на нашым цеплаходзе ніколі не бывае дажджу. Ні разу не намоклі! Хоць бывала і халаднавата, і ветрык здараецца. Плавалі 18 чэрвеня, потым 3 ліпеня. На Дзень Незалежнасці зрабілі ваенную праграму: 50 грамаў франтавых, кавалачак хлеба і кавалачак сальца... Мы заўсёды нешта прыдумваем. Падаем іншым разам бакал шампанскага. Ці сок, ці проста ваду разносім у бакалах. Дзяўчына прыходзіць, якая усё тое прыгожа робіць. Так што эксклюзіўныя жывыя вечары атрымліваюцца. Людзі пішуць удзячныя водгукі: "Зарад энергіі!.. Не жадаем сыходзіць!.. Нялёгка разыходзіцца!.." Нам гэта вельмі прыемна.

***— Вера, вы заўсёды такая жывая выдумляльніца? З дзяцінства?***

— Так, я заўсёды была такой актыўнай. І заўсёды хацела стаць артысткай. Спачатку спявачкай, а ў раннім дзяцінстве збіралася ў конюхі. Хацела жыць у вёсцы і там яшчэ выкладаць у музычнай школе. Марыла працаваць з дзецьмі. Пазней захацела стаць актрысай, паступіла ў Акадэмію мастацтваў. Але ўсё роўна жаданне выкладаць дзецям нікуды не дзелася. Цяпер у мяне ёсць і цэлая тэатральная школа "Алые паруса" — раней мы былі пры 16-й гімназіі, я там 4 гады выкладала, і год ужо мы адпрацавалі самі, без гімназіі. Сцэну, памяшканні арандавалі ў Канцэртнай зале "Мінск". Мае акцёры з "ТриТформаТа" выкладаюць. І адзін рэжысёр з Масквы Таццяна Самбук прыязджае. Яна ж і паставіла апошнія спектаклі. Год мы завяршылі тым, што ігралі з Прэзідэнцкім аркестрам — яго малым складам — на сцэне Палаца Рэспублікі. Адыгралі музыкі дзве казкі з намі 1 чэрвеня — на Дзень абароны дзяцей. У зале былі ўдзячныя гледачы: са шматдзетных сем'яў, дзіцячых дамоў, з інтэрната ў Чэрвені (там дзеткі з асаблівасцямі развіцця). Мне было важна, каб дзеці са студыі ў тым удзельнічалі. Была поўная зала на 462 месцы, і гледачоў — яблыку няма дзе ўпасці.

***— Атрымліваецца, усе вашы субасобы сябруюць між сабой...***

— Абсалютна! Прычым адна ў другую перацякаюць. Я наогул не займаюся тым, што не падабаецца мне. А калі што не падабаецца — я ў тым не ўдзельнічаю. Бывае, і памыляюся, але вельмі рэдка. І я хутка разумею: не, не маё. Усё, чым займаюся ўвесь час — усё тое ў першую чаргу мне дае задавальненне. А потым ужо прыносіць можа нейкія фінансавыя выгады... І я, смеючыся, часам кажу: я іду ў канцэрты, вяду іх, спяваю для таго, каб на вас усё аддаць, дарагія мае артысты, у тэатральным праекце "ТриТформаТ"... У мой праект я пастаянна ўкладваю грошы. Мару, што калі-небудзь і там нешта зараблю. Быў нават перыяд, калі адчувала сябе вольнаю — зарабляла, магла скарыстацца грашыма — ды прыйшла пандэмія. І я зноў пачала ўсё спачатку. Раней у мяне было неразуменне: — ну калі ж гэта скончыцца, чаму трэба пачынаць спачатку? — потым прыйшла ў сябе. І зразумела: год 2020-ы быў вельмі важным у маім лёсе. Ён мяне так выпрабаваў на трываласць! Эмацыйна вельмі многае для сябе зразумела. У тым ліку зацвердзілася ў тым, што ведала раней: няма для мяне нічога важней за сям'ю! І няма нічога важней за блізкіх людзей, тых, хто з табою побач. Ды і сяброў павінна быць раз, два тры — і хопіць. Усе астатнія — проста знаёмыя, калегі...



Артыстка, тэлевядучая Вера Палякова разам з мужам, Уладзімірам Макеем, Міністрам замежных спраў Беларусі, падчас папулярнай тэлеперадачы "Маркаў. Нічога асабістага"



Сцэна са спектакля “Княжна Мэры”. Вера Палякова ў ролі княгіні Лігаўскай.

***— Нам блізкая ваша пазіцыя, спадарыня Вера! Не варта скідваць усё ў адну кучу, варта выбіраць прыярытэты, расстаўляць акцэнты. Мабыць, гэта ж і ёсць важная частка жыцця любога чалавека...***

— Так! Дарэчы, гэта яшчэ прыкмета нашай сацыяльнай сталасці, жыццёвай мудрасці, прафесіяналізму. Што да маёй сітуацыі, то я змагла зберагчы калектыў і зрабіць шмат новых работ. 8 Сакавіка мы сыгралі "Княжну Мэры". І гэта яшчэ раз узнесла нас да творчых вышынь. Ніхто раней не рабіў спектакль у Вялікай зале Палаца Рэспублікі ды не збіраў там 8 Сакавіка поўную залу. Поўная зала! Артысты выйшлі — і не паверылі. Не чакалі, што такое можа быць. Так, мы старалiся. Было вельмі цяжка. Але на сцэне сядзеў увесь аркестр. Мы знайшлі цудоўнага аператара на тэлеканале АНТ — я ж не ведала, што такія таленты, як Аляксандр Крывецкі, побач працуюць. Патрэбен быў аператар для SD-камеры, каб глядач і далей за трэці рад у Палацы Рэспублікі разумеў, што ж адбываецца на сцэне. Што гэта спектакль, а не канцэрт, не песні, не скокі. Так, спектакль — але з выкарыстаннем аркестра, як важнага музычнага складніка. Дык вось гэты аператар з рэжысёрам Таццянай Самбук зрабілі такі сімбіёз, шматслаёвы відэашэраг! Гэта як святочны пірог з пластамі розных сэнсаў і эмоцый атрымаўся. Вось іграе жывая музыка — увесь аркестр. Вось жывая акцёрская ігра на авансцэне. Мы сядзім спіной да гледача, але камера заходзіць так, што буйнымі планамі бачныя ўсе нашы твары, і як выяўляюцца пачуцці. Што мы перажываем, калі тая ці іншая сцэна іграецца. Бачна таксама, як мы ставімся да яе герояў. Потым гледачы казалі мне: ніколі нічога лепшага яны ў сваім жыцці не бачылі. Гэта была першая прэм'ера — і адразу ў Вялікай зале. Нам хацелася зрабіць гэта маштабна, моцна, вось так: у-вау!

***— Вам раней, відаць, хацелася ўсіх разам збіраць за адным сталом?***

— Ва ўсялякім разе, мне здавалася, што сяброў у мяне значна больш. *(Смяецца).* Але мінулы год паказаў, хто ёсць хто. Са мной засталіся самыя блізкія, а ўсё астатняе — мішура. Я пра тое падрабязна расказвала ў тэлеперадачы Марата Маркава "Нічога асабістага", які запрасіў нас разам з мужам. Яна ёсць у запісу. Да таго ж я ў 2020-м навучылася спраўляцца з атакамі ў інтэрнэце, у сацсетках. Яны, атакі тыя, не забілі мяне, і не разбурылі — загартавалі. Я толькі стала больш моцнай. І ў 2021-ы выйшла з такімі праектамі, якіх не рабіў ніхто. Выпусціла ў пандэмію "Тры сястры" — спектакль, які адразу падняў мой праект на вельмі высокі ўзровень: гэта ўзровень "Золотой маски", Піцера, Масквы, іншых тэатральных цэнтраў за межамі Беларусі. Я сыграла ў Новы год, калі ўсе "памерлі", гэта значыць ніхто нічога не рабіў, 53 навагоднія казкі! Праўда, пытанне: што я на тым зарабіла? Прызнаюся: ні-чо-га! Але затое ўсе мае артысты, 60 чалавек — а ў мяне было дзве пляцоўкі (Малая зала Палаца Рэспублікі ды Вялікая зала ў Канцэртнай зале "Мінск") былі пры справе. Усе мае службы зарабілі. Лічу, што галоўнае — я ўтрымала калектыў на плыву, страціла толькі адну актрысу: выявіліся ў яе іншыя погляды на жыццё. Але рассталіся з ёй мірна...

***— Дык гэта ж новы фармат пастановачнага дзеяння ў вас і атрымаўся, вы яго сінтэзяавалі... З выкарыстаннем новых тэхналогій.***

— Абсалютна так! І мы потым перайшлі на Малую сцэну іграць, але захавалі гэтую аператарскую працу. Цяпер у нас на сцэне працуе 12 музыкантаў, а не ўвесь аркестр пад сотню чалавек. Але ўсё роўна жывы гук ёсць. Працуем у поўную сілу. Гэта вельмі дарагі для мяне спектакль.

***— Як маскоўская публіка ўспрыняла вашыя спектаклі?***

— Вельмі пазітыўна. І "Тры сястры", і "Княжну Мэры". І добрыя артыкулы выйшлі. Пасля "Трох сясцёр" месяц прайшоў, мы і "Княжну" выпусцілі, а там артыкулы ўсе выходзілі хвалебныя пра тое, што беларусы нарэшце прывезлі нешта вартае ўвагі. У Маскве тады ў сувязі з пандэміяй тэатры не збіралі гледачоў — па чалавек 50 толькі набіралася, мы ж у поўнай зале на 215 месцаў ў Дзелавым і культурным цэнтры Пасольства Беларусі ў Расіі адыгралі. І зрабілі дзею з аркестрам. І што было класнае ў "Княжне..." Мы пасябравалі з прадстаўнікамі "Tronic Show" — гэта такая расійская інтэрнэт-платформа. Спачатку я да іх з'ездзіла — мы 4 кліпы знялі. Потым запрасіла іх да нас "Тры сястры" паглядзець. Кажуць, паглядзеўшы: хочам вас здымаць. Я прыехала да іх 9 мая з канцэртам ваенным: анлайн і афлайн, мы яго зрабілі прама на вуліцы. Актрыса Алеся Пухавая чытала вершы. Мы спявалі ваенныя песні, гучала гітара. Вельмі добрая атрымалася праграма. Мы ў Мінску яе адпрацавалі, перанеслі ў Маскву, трошкі дадаўшы нумароў. Потым павезлі ў Маскву "Княжну..." у канцы мая на гастролі. Здымалі на 4 камеры, плюс нашу камеру SD-cam бралі, выводзілі гэта ўсё анлайн. Дык вось падчас спектакля на анлайн зайшло дзве з паловай тысячы чалавек. Мы гралі афлайн і адначасова ў рэжыме анлайн ішла трансляцыя. Прычым глядач мог сабе купіць месца ў зале! І былі на ютубе людзі, якія проста глядзелі гэта ўсё бясплатна. За суткі спектакль пабачылі больш за 10 тысяч чалавек! І гэта, я лічу, самае галоўнае, што мы зрабілі ў Маскве. Было важна, каб гэтая платформа спрацавала, каб

такая вялізная колькасць людзей нас паглядзела. Практычна ўсе водгукі атрымалі станоўчыя — а іх больш за 70. Пісалі і прыкладна так: "Дзякуй вам велізарны. Я жыву ў глухой вёсцы, да нас ніхто на гастролі не прыязджае. Не ведаю, ці будзе ў мяне магчымасць выехаць у Маскву ці да вас, каб спектакль паглядзець — улічваючы тое, што цяпер адбываецца. Вы падаравалі мне столькі задавальнення! У мяне было адчуванне, што я прысутнічаю на спектаклі!". Як па мне, то дзеля вось гэтага толькі водгука ўжо варта было ўсім тым займацца.

***— Вы ж былі нядаўна і на "Славянскім базары ў Віцебску" са сваім тэатральным праектам...***

— Так, там сыгралі 15 ліпеня "Тры сястры", і спецыялісты "Tronic Show" прыязджалі. Яны цяпер ездзяць за намі ўсюды . Здымалі наш цеплаход, здымалі дзіцячую казку. Мы дамовіліся з кіраўніцтвам Палаца Рэспублікі бясплатна запрашаць дзяцей з дзіцячых дамоў, са шматдзетных сем'яў, з дзіцячага хоспіса. Яшчэ і — "Чырвоны крыж" у супрацы з намі на дабрачыннай аснове. Запрасілі ўсіх у залу. І сыгралі казку для дзяцей: анлайн і афлайн адначасова. Калі ёсць і рэакцыя гледача, і велізарная інтэрнэт-аўдыторыя, то нам лёгка граць.

***— Гледачы ў зале вам падыгрываюць?***

— Так, і ўсю гэтую энергію мы акумулюем і транслюем ў інтэрнэт-прастору. Людзі па ўсім свеце змогуць яе адчуць. Потым на ютубе гэта вісіць і можна паглядзець.

***— Як ваша мама ставіцца да вашай творчасці?***

— Яна мяне радуе! Паглядзела спектакль "Княжна Мэры" анлайн з Масквы — і сказала: "Вера, як гэта крута! Які цудоўны спектакль! А можна ўсё-ткі, калі кавід пойдзе на спад, я прыйду і пагляджу яго ўжывую? " Вось вам і адказ на пытанне: ці захочуць людзі, паглядзеўшы спектакль анлайн, прыйсці на яго? Калі спектакль спадабаўся, то захочацца яго і ўжывую паглядзець. Таму што гэта — іншая энергетычная плынь.

***— Ці можна сказаць, што глядзельная зала ў злучэнні са сцэнай — гэта генератар для выпрацоўкі асаблівай, духоўнай энергіі?***

— Дакладна падмецілі! Прычым падчас спектакля, і я адчувала гэта не раз, адбываецца ўзаемаабмен энергіямі паміж артыстамі і гледачамі. Ну няўжо фільм, які спадабаўся, нам не захочацца перагледзець жыўцом як спектакль з любімымі артыстамі? Мне асабіста захочацца! Я з такіх меркаванняў зыходжу, прыўносячы ў свае тэатральныя праекты нешта новае.

***— Трохі раскажыце пра маму, свае родавыя карані, пра тое, адкуль у вас столькі творчай энергіі.***

— Я мінчанка, прычым карэнная, ужо ў чацвёртым калене. Мама, Таццяна Дзмітрыеўна Палякова — прафесар, доктар педагагічных навук. Наогул я прафесарская дачка. Мама ў свой час была самым маладым прафесарам. Усё жыццё займалася стральбой з пісталета і вінтоўкі, дакладней — выкладала гэтае майстэрства, была вядомым трэнерам. Потым цалкам пайшла ў навуку. Распрацавала шмат розных методык для псіхафізічнай падрыхтоўкі спартсменаў-стралкоў высокага ўзроўню. Тых, хто страляе з пнеўматычных відаў зброі, займаецца хуткаснай стральбой. Мама ў мяне разумная неверагодна, ну і ўнукі ў яе пайшлі. Мой старэйшы сын Дмітрый закончыў Медуніверсітэт, абараніў дыплом па спартыўным харчаванні на дзясятку. Мама, вядома ж, актыўна яму дапамагала і методыкай, і матэрыяламі. Да таго ж яна вельмі актыўная. Але па характары я пайшла ў тату, а ў маму — цэласнасцю сваёй.

***— Мама ваша стралкоў нездарма выхоўвала, вучыла біць у дзесятку...***

— Вось і я заўсёды ўсё даводжу да канца. Яна мне з дзяцінства казала: Вера, нават калі не можаш, не хочаш — ты заўсёды павінна ўсё давесці да канца! Ніколі нічога не кідай на паўдарозе. Тады ты сябе па-іншаму будзеш адчуваць у жыцці і калі ўсё, нават самае нялюбае і нецікавае давядзеш да канца. І вось таму я ў свой час вучылася ў аспірантуры: гэта спрацавалі выключна маміны пасылы. І тое, што я пайшла выкладаць — маміна энергетычная спружына ўва мне працуе. Гэта была маміна мара. Хаця ж і мне самой спадабалася выкладаць! І цяпер любога магу навучыць фехтаваць...

***— Вы маеце на ўвазе сцэнічнае фехтаванне?***

— Так, я выкладаю сцэнічны бой і фехтаванне — гэта шпага, шпага-дага, меч і двухручны меч, шчыт, кінжал-плашч — усе гэтыя напрамкі я ведаю і магу ім навучыць.

***— Маміны бацькі ў Мінску ў гады акупацыі, відаць, тут былі, калі ў вас карані родавыя адсюль?***

— Так, бабуля Вера, у гонар якой мяне назвалі, служыла ў контрразведцы СМЕРШ. Была сапраўднай разведчыцай. Нядаўна тэлекампанія "Мир" здымала пра мяне невялікі фільм да Дня Перамогі, у Маскве ўсё манціравалі. Ёсць здымкі ля дома на вуліцы Максіма Багдановіча, які будавалі мае дзядуля і бабуля пасля вайны. Дарэчы, на вайне ж яны і пазнаёміліся. Дзядуля таксама служыў у СМЕРШы, потым быў камісарам партызанскага атрада "Сокал" — у адным з падраздзяленняў брыгады імя бацькі Міная. І ў ліку першых вызваляў Мінск. Тры



У тэлепраграме
"Наше утро"
Вера Палякова разам
з Аляксандрам Сярэбраннікавым

першыя партызанскія атрады ўваходзілі ў Мінск, і пра тое пісалі ў газетах. Ёсць у мяне ў сямейным архіве і выразка, і фатаграфія. І самым першым там ідзе мой дзед — Дзмітрый Рудзін! Дарэчы, мой старэйшы сын названы ў яго гонар. Бабуля заставалася на сваім прозвішчы — Нікалаёнак.

***— Бабуля-разведчыца ўдзельнічала у вашым выхаванні?***

— Так, непасрэдным чынам, але параўнальна нядоўга. А дзядулю я не ведала, ён рана памёр: у 51 год. Бабуля пайшла з жыцця, калі мне было ўжо 7 гадоў. Я памятаю, што яна мяне заўсёды глядзела: бацькам дапамагала. І ў першы клас я пры ёй пайшла. Самыя цёплыя пра бабулю Веру ў мяне ўспаміны! У адным фільме пра вайну я грала яфрэйтара Юлію. Ёсць некалькі фотакадраў, дзе я ў ваеннай форме. Прычоску мне пад тую эпоху зрабілі. А ў бабулі ёсць падобныя здымкі. Мама казала: "Божа, як ты падобная на бабулю!". Хоць я ўся ў татаву пароду: вельмі падобная на ўсіх яго сваякоў, і на тату. Але на тых ваенных кадрах, у ваенным фільме "Беларусьфільма" "Яшчэ пра вайну" мы вельмі падобныя з бабуляй Верай. Яго часта паказваюць 22 чэрвеня, на Дзень Перамогі.

***— А цяпер раскажыце пра тату, на якога вы таксама вельмі падобная...***

— Тата мой Аляксандр Сямёнавіч Палякоў меў вышэйшую тэхнічную адукацыю, а ў часы перабудовы стаў займацца бізнесам. Сёння ён старшыня аднаго з дамавога таварыстваў — у тых дамах, дзе сам і жыве. Яму, як і мне, вельмі падабаецца мець зносіны з людзьмі. Да таго было ў яго турагенцтва, досыць вядомае. А ў дзяцінстве тата марыў быць артыстам. І калі я ўсё ж паступіла ў Акадэмію мастацтваў, закончыла яе, то ён быў вельмі мной задаволены. Тата заўсёды кажа: ты — увасабленне маёй мары. Так што я не проста так стала артысткай. Тата, дзе б я ні выступала, са студэнцтва — пастаянна прыходзіў на мае спектаклі. У мамы не заўсёды тое атрымлівалася.

***— Вы адна ў бацькоў?***

— Адна. Але ў маіх бацькоў ёсць ужо два ўнукі! *(Смяецца)*. Спадзяюся, у іх па трое дзяцей будзе.

***— І таму давайце далей пра вашу сям'ю пагаворым. Вы згодныя падзяліцца ?***

— Муж, Уладзімір Уладзіміравіч Макей, у мяне, як вы ведаеце, чалавек дзяржаўны, ён афіцэр. Прычым, з вялікай літары. Як быццам з тых далёкіх, добрых савецкіх часоў. Палкоўнік запасу, ваенны перакладчык па адукацыі, разведчык. Яго асноўная замежная мова — нямецкая, другая — англійская. На тое, як ён працуе з людзьмі, як выбудоўвае стасункі ў сям'і — мы ўсе, вядома, раўняемся. Бо ён — чалавек слова, чалавек гонару, чалавек справы. Ён ніколі нічога не кажа марна, і гаворыць коратка, ёміста. Калі нешта паабяцае, то абяцанне выканае. Заўсёды! У якім бы стане ні знаходзіўся, як бы сябе ні адчуваў. Даводзіць усё да канца, да лагічнага завяршэння — і гэта мне ў ім вельмі



Спектакль "Тры сястры" з поспехам прайшоў у Маскве



Вечары на цеплаходзе "Свислочь"

падабаецца. Ну і, вядома, тыя пачуцці, якія мы адчуваем адзін да аднаго, гэта ... ну, гэта вельмі сур'ёзна. Кожны з нас даў слова, і перад Богам у тым ліку, бо мы венчаныя, і перад людзьмі: пакуль смерць не разлучыць нас, мы будзем разам. І не дазволім сабе адзін аднаму здрадзіць. Так, я артыстка, я шмат іграю на сцэне кахання. Але, паверце, мне ніколі не хацелася нейкіх іншых адносін. Чым далей жывем, тым глыбей я разумею для сябе: няма нічога лепш маіх з мужам адносін. Мы вельмі цэнім іх. З кожным годам пазнаем адзін аднаго больш — і любім больш. Пачуццё, якое нас злучае, не змяншаецца — павялічваецца. Разрастаецца. А за тыя гады, што мы разам а іх ужо ... надцать!! як кажуць. Мы так многа прайшлі! Столькі ўсяго! Многія людзі спрабавалі разбурыць наша сумеснае жыццё, умяшацца. І нават у 2020-м у сацсетках усяго хапала: маўляў, яна разводзіцца з ім ... Так бы мовіць, сяброўкі сказалі... І гэтак далей. А якія сяброўкі? Перш чым пісаць усялякае глупства, вы пацікаўцеся хаця б: колькі ў мяне сяброўак?

***— Адным словам, фэйкі...***

— Так, менавіта так. І таму я жадаю нашым людзям у такія плёткі не верыць, пра ўсё даведвацца з першых вуснаў. Яшчэ хачу дадаць: не дачакаюцца. Колькі б ні спрабаваў хто-небудзь нас разлучыць — у іх не атрымаецца! Мы думаем аднолькава, ідзем па жыцці, як гаворыцца, ноздры ў ноздры, двое ў адной запрэжцы. І ўсё, што гаворым, робім і адчуваем — гэта ўзаемнае. У нас, у нашым жыцці няма разыходжанняў. Ні па якіх пытаннях. Нашы думкі, пачуцці, што мой муж робіць у палітыцы і што я сваёй творчасцю спрабую выказаць, данесці — гэта абсалютна сувымерныя думкі і пачуцці. Мы не разыходзімся ў галоўным ні па светапоглядных, ні па палітычных, ні па іншых матывах.

***— У мудрацоў ёсць такая парада людзям: хай усе вашы думкі, словы і справы будуць у гармоніі! Мяркуючы па вашых словах, такую гармонію ствараць вам з мужам у сям'і ўдаецца.***

— Так і ёсць. Да таго ж варта мець на ўвазе і такое разважанне — я пачула яго ад аднаго вядомага ў Беларусі чалавека. Ёсць пэўныя правілы гульні. І калі ты ў гульню гэтую трапляеш — ты павінен гуляць па яе правілах. Калі не — лепш тады зусім не гуляць.

Так і палітыка: гэта пэўныя правілы гульні, якія ты павінен выконваць. І калі ты любіш чалавека, з ім жывеш — ты ў палітычным жыцці быццам бы і не ўдзельнічаеш, але ж ты гуляеш у гэтую гульню.

***— Хоць і ўскосна — але таксама ў гэтай камандзе...***

— Так, ты з мужам —у адной камандзе, таму не маеш права парушаць правілы. І калі нехта, да прыкладу, кажа: "Так, мой муж — міністр, ці намеснік міністра, а ў мяне іншыя погляды на жыццё. І я буду рабіць так, як лічу патрэбным", то я лічу такі падыход здрадай. Ты здраджваеш, калі так сцвярджаеш, справе свайго мужа. Па мне дык варта вызначыцца: альбо ты па жыцці яго баявая сяброўка, яго



Арцём Давідовіч.



Вера заўсёды ўдзячная сваім гледачам

радыстка Кэт (адна з гераінь фільма "Сямнаццаць імгненняў вясны". — **Аўт.),** і ты за ім — да канца. Альбо ўзялі рэчы і разышліся.

***— Артысцы Веры Паляковай па плячах няпростая роля радысткі-разведчыцы Кэт?***

— Ну так, я радыстка Кэт! Як жа інакш! У мяне ж, сказала, муж разведчык. Калі мы з Уладзімірам жаніліся, то адна сяброўка ўстала і сказала, звяртаючыся да яго: "Вы, вядома, для нас усіх — Шцірліц, але Вера — радыстка Кэт". *(Смяецца).* Неяк з тых часоў так і пайшло. Я магу прыйсці да мужа і сказаць: "Валодзя, давай мы з табой тое-сёе абмяркуем". Я, маўляў, хацела б для сябе нешта праясніць. Растлумач мне: чаму гэта так, а не інакш? Але каб я сказала "фу" ў нейкай складанай, неадназначнай сітуацыі — такога не можа быць у прынцыпе. Бо хто я пасля гэтага? Ну і наогул, калі закранаць мімаходзь некаторыя палітычныя пытанні, то я ж не настолькі дурная, каб не разумець: было ў нашым жыцці ўсялякае. Але я не магу, як разумны чалавек, усё перакрэсліць і сказаць: фу, усё ў нас кепска. Ды не кепска! Навошта хлусіць сабе і іншым? Упэўнена: ніколі не бывае добра пасля разбурэння таго, што стваралася...

Мы ўсе памятаем, як развалiўся Саюз... А я па натуры чалавек, які будуе. Усё жыццё нешта ствараю. І не дазваляю сабе часам разбураць тое, што, магчыма, атрымалася не зусім гладка. І калі казаць пра пераход улады ў краіне, то для нашага ж агульнага дабра ён павінен быць спакойным, узважаным. Без істэрык. Я сама эмацыйны чалавек, і вельмі выбухны. Але цвяроза і сурова раблю выснову: анічога добрага са мной не адбывалася пасля таго, як я выбухала. Звычайна пасля гэтага доўга, як кажуць, залізвала раны і прабачэння ў людзей прасіла. Жыццё нас часам вельмі жорстка нечаму вучыць, і важна ўмець засвойваць падобныя ўрокі.

***— Ды і сам сябе як бы па кавалачках збіраеш пасля эмацыйных выбухаў. І болю шмат, і бяссілле поўнае...***

— Цяпер я навучылася стрымліваць сябе. Стараюся стрымліваць. Інакш нічога добрага не будзе.

***— Што б вы яшчэ сказалі пра свой характар?***

— Калі глянуць гараскоп, то я ў апошні дзень Шаляў нарадзілася: 22 кастрычніка. Ужо і не Шалі, але ж яшчэ не Скарпіён. А муж Леў. Леў! *(Смяецца)* Цар звяроў. Але я вам хачу сказаць вядомае: зоркі нас не прымушаюць, як паступаць, як жыць, дзейнічаць — яны падказваюць. А мы, набіваючы сабе гузы, выбіраем сваю, найбольш нам прыдатную "жыццёвую стратэгію і тактыку". Вось вам прыклад. Я сына малодшага, Арцёма, збірала ў лагер на пачатку лета. Мы з ім ездзілі на шопінг, рэчы выбіралі. Потым ён мне сказаў: "Мама, як мне з табой спадабалася ў гэты раз рэчы купляць! Мы з табой нават ні разу не пасварыліся". *(Смяецца).*

***— Можа быць, вы яму сказалі: гэта ты, сынок, падрос, больш ураўнаважаным стаў...***

— Не, не сказала. У яго ж цяпер складаны перыяд: 12 гадоў, пачынаецца пераходны ўзрост. І мы перыядычна, вядома ж, з ім... дыскутуем. Але я ж таксама раблю высновы, шмат чаму вучуся, у тым ліку і назіраць за ім. Неяк гладзіла рэчы, сын позна сядзеў за камп'ютарам... І раптам кажа мне: "Мама, як я цябе люблю! Ты незвычайная. Для нас з Дзімам (гэта старэйшы наш) ты — сябар. Вось усе мае сябры сваіх мам вельмі баяцца. А я ведаю, што заўсёды з табой магу пагаварыць. Нават паспрачацца ці пасварыцца. Але мы ўсёроўна знойдзем агульную мову. Таму што ты нам больш сябар, чым мама". *(Смяецца).* Не ведаю, добра гэта ці дрэнна ... Але мне вельмі прыемна такое чуць ад дзяцей.

***— Выдатна! Такая высокая ступень даверу...***

— ...Але ў нас ёсць строгі тата. І яго слова ў сям'і апошняе. Часам, калі нешта ў мяне ніяк з дзецьмі не атрымліваецца разруліць сітуацыю, я кажу: "Стоп! Хай нас рассудзіць тата! Да яго!". *(Смяецца).* Вядома ж, я нашмат больш часу праводжу з дзецьмі, чым мой муж. Але ён — апошняя інстанцыя ў нашай сямейнай дзяржаве. Калі я разумею, што не магу прыняць рашэнне — накіроўваю дзяцей да яго. І ён ужо іх прымае. А што да слоў малодшага пра маму-сябра, то, мабыць, так і ёсць. Мы з Дзімам сустракаемся, бывае, з яго сябрамі. Я нават з імі на дыскатэкі хаджу, і ў адпачынках перасякаемся. І сябры, ведаю, часам кажуць: "Блін, вось бы ў нас была такая мама! Яна такая вясёлая *(смяецца)* і выглядае добра. А ў Дзімы, якому 22,

сябры старэйшыя ёсць — некаторым і гадоў пад 30. Вядома, побач з імі ў нас не вельмі розніца ва ўзросце бачная. Прычым я чалавек гарэзлівы, люблю паскакаць, пасмяяцца, пажартаваць...

***— Сацыяльныя маскі, стэрэатыпы часам нас прыціскаюць...***

— Так! Мора матчыных роляўабавязкаў нам нарыхтавана. Прыбраць. Прыгатаваць. Памыць... Сказаць сабе:"Я ж маці!" Я ж павінна! Агарод ускапаць!..

***— А памочніца ў вас па доме ёсць?***

— Ёсць. Яна прыходзіць раз на тыдзень. Ганна Аляксандраўна — цудоўная жанчына, яна ўжо як член сям'і. Колькі гадоў майму малодшаму сыну — столькі ж і яна з намі. Дапамагае мне з уборкай. Хоць я гэтага ў свой час не хацела. Казала мужу, што сама з усім спраўлюся. Але калі даходзіла справа да ўборкі нейкай глабальнай, прапаноўвала яму некаторы ўчастак працы. Ён раз прыбраў, два прыбраў... Потым неяк прыязджаю з адпачынку — а ў мяне ўжо ў доме жанчына: "Добры дзень, я Ганна Аляксандраўна. Цяпер буду з вамі працаваць". Вось так прыгожа мой муж вырашыў праблему з уборкай. І вызваліў сябе і для сям'і, і для сябе. Хоць Уладзімір Уладзіміравіч ніякай працы не баіцца, у тым ліку і вясковай: у нас ёсць домік ў невялічкай вёсцы. У мяне там нават куры ёсць. Улетку з сабакам туды выязджаем, і часцей. Ад Мінска далекавата, але прыстасоўваемся. Раніцай у выхадны Уладзімір і ўчастак пакосіць — трымерам, і па гародзе нешта зробіць. Яму гэта падабаецца. Дровы паколе... Хоча адпачыць — адпачывае, хоча працаваць — працуе. Таму што гэта яго выхадны. Ён робіць у гэты дзень, што захоча. І цалкам мае на гэта права.

***— Разумны падыход. А за рулём вы абодва?***

— Так, але часцей я. Калі едзем разам кудысьці — за рулём заўсёды я. Па-першае, без руля мяне ўкалыхвае, а па-другое, я люблю весці машыну... Весцібулярка ў мяне так сабе, але я навучылася і лётаць, і плаваць. Часам дапамагае мне халодная кока-кола. Калі, скажам, гэта марская прагулка на яхце, то я плыву за яхтай. Спынілася, укалыхвае — я пап'ю і ў ваду. І ўсе смяюцца: ва ўсіх марская прагулка на яхце — а ў Веры за яхтай.

***— Аднак, як гаворыцца, вернемся з карабля ў тэатр. Вам даводзілася граць ролі, якія наогул не падабаліся? Забывалі тэкст?***

— Здаралася, але вельмі рэдка. Прычым адна-паўтары фразы за спектакль. І гэта, як правіла, не мела глабальнага значэння. Я добры партнёр, на мяне можна спадзявацца. Гэта ўсе ў тэатры ведаюць. Заўсёды выцягну і сябе, і таго, хто са мной побач. Адзін акцёр у нашым тэатры, паглядзеўшы спектакль, неяк сказаў пра мяне: "Дзівосная артыстка! Узваліла артыста на плечы і нясе яго праз увесь спектакль. І што галоўнае — рытму не губляе". *(Смяемся).*

***— Чаго на сцэне баіцеся больш за ўсё?***

— Забыць тэкст. А яшчэ мне сны сняцца, калі мяне хтосьці не пускае на сцэну — вось гэта самы страшны сон. Што ідзе спектакль, мне выходзіць — а нехта ці нешта не пускае. Дарэчы, падобныя сны сняцца таксама іншым артыстам.

***— Як успрымаеце крытыку?***

— Добра, калі яна канструктыўная. Да яе прыслухоўваюся. Не люблю такую крытыку, калі кажуць: мне не спадабалася. Растлумач: што менавіта? Мяне ні ў адным такім спектаклі "фу, не спадабалася" няма. Ёсць пастаноўкі, якія цяжка лічыць выбітнымі. Ёсць звычайныя, ёсць і адметныя. Але гэта не значыць, што я ў іх дрэнна працую. Сваю працу я заўсёды раблю з поўнай аддачай. Ніколі не апускаюся ніжэй пэўнай планкі.

***— Хтосьці з акцёраў пра тэатр сказаў, што ў ім усё пабудавана на энергіі святла і любові. А што сказалі б вы?***

— Ніводнага няма спектакля — ні ў мяне, ні ў тэатральным праекце "ТриТформаТ", ні ў Тэатры-студыі Кінаакцёра, каб не нёс ён думку нейкую. Нават ставячы простую дзіцячую казку, мы закладваем у пастаноўку светлую ідэю. Гаворым пра дабрыню. Пра дружбу. Пра любоў. Апошняя казка "Не Вожык", якую мы з Прэзідэнцкім аркестрам зрабілі, нясе глабальную думку. Пра тое, што ўсё роўна, калючы ты ці пухнаты. Які б ты ні быў — заўсёды знойдзецца той, хто цябе палюбіць такім, які ты ёсць. Самае важнае — заставацца самім сабой. І не трэба змяняцца. А ў спектаклі Вожык гэта спрабуе рабіць. Заяц яму раіць мець доўгія вушы, хтосьці — пушыстую шэрстку, крылы як у вароны... А Вавёрачка рудыя — лапкі... У выніку атрымалася абракадабра нейкая. Цуда-звер. Вожыка нават маці родная не пазнала.

***— Так, людзям уласціва бывае жаданне падладжвацца пад густы і чаканні іншых...***

— І казка пра тое! Я там іграю Маці-Вожычыху і агучваю гэтую ідэю, прычым гэта інтэрактыўная казка. Мы зносімся з гледачом у часе дзеяння. З гэтай казкай былі ў "Зубронку" неяк, дык нам потым з "Надзеі XXI стагоддзя" патэлефанавалі кіраўнікі. Сказалі: выдатная казка!.



Мінуты адпачынку падчас гастроляў у Батумі

Мы з малымі тэму працягнулі ды яшчэ цэлую гадзіну пасля спектакля з імі размаўлялі пра каштоўнасці самыя важныя. Наогул, казка вясёлая, простая. Дзеці ў зале так рагаталі — да таго ж у ёй закладзены магутны маральна-этычны пасыл! Як трэба заставацца самім сабой. А ў сённяшняй мас-культуры зусім іншыя пасылы.

***— Сапраўды, як важна такую маральную ўстаноўку даваць з дзяцінства...***

— Пакуль мы не будзем гэтага рабіць — розныя Цік-Токі зробяць сваю справу. Дарэчы, і я там ёсць. У мяне там нармальны твар. І апранута як жанчына, мой партнёр — як мужчына. Там жа большасць — як бы хлопчыкі і як бы дзяўчынкі... Дарэчы, ёсць я і ў Інстаграме, і ў Фэйсбуку. Не для славы і грошай. Я — актрыса, і магу зрабіць нешта патрэбнае і карыснае.

*Вера Палякова нарадзілася 22 кастрычніка 1978 года. Упершыню выйшла на сцэну Тэатра музычнай камедыі ў 12 гадоў – у дзіцячай казцы. Прафесійна пачала іграць у студэнцкія гады, на другім курсе БДАМ – у Малым тэатры Ігара Забары ў Мінску. У 1999-м закончыла Беларускую дзяржакадэмію мастацтваў (курс Лідзіі Манаковай). Іграла на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя Максіма Горкага, у Нацыянальным акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. З 2003-га – у Тэатры-студыі кінаакцёра кінастудыі "Беларусьфільм". Старшы выкладчык па сцэнічным руху і фехтаванні тэатральнага факультэта БДАМ. Выкладае этыкет, стылёвыя паводзіны, жангліраванне, акрабатыку. Была вядучай праграмы "Утро столицы" (тэлеканал «СТВ»). На першым канале Беларускага тэлебачання вяла папулярнае ток-шоў "Жизнь как жизнь", цяпер – вядучая праграмы "Наше утро" на АНТ.*

*Дэбютавала ў кіно ў 20 гадоў – у фільме "Павадыр». З тых часоў актыўна здымаецца, прычым як у расійскіх, так і ў беларускіх фільмах – "Дунечка" (2004), "Яшчэ пра вайну" (2004), "Спакуса" (2006), "Ма-мач-кі!.." (2012) ды іншых. Вера Палякова не толькі артыстка, тэлевядучая і выкладчыца, але яшчэ і спявачка. Восенню 2007 года адбылася прэзентацыя яе дэбютнага альбома "Артыстка". Член Беларускага саюза кінематаграфістаў.*

***— Што ў Тэатры-студыі Кінаакцёра цяпер у рабоце? Што ў вашым тэатральным праекце?***

— У Тэатры-студыі Кінаакцёра ставяць спектакль "Дзядзька Ваня". А я з тэатральным праектам "ТриТформаТ" езджу з казкамі. 10 ліпеня сыгралі мы "Княжну Мэры" ў Мінску, ля Ратушы для ўсіх гледачоў. 17 ліпеня "Тры сястры" гралі на "Славянскім базары". 20 ліпеня лёталі ў Батумі, паказалі "Княжну Мэры" і адкрылі там беларускае Ганаровае консульства. А ў мой дзень нараджэння — 22 кастрычніка — "Анна Карэніна" выйдзе, мы цяпер над ёй працуем. У мяне пакуль ёсць магчымасць сыграць гэтую галоўную ролю — па ўзросце яшчэ падыходжу. Спадзяюся, будзе незвычайны спектакль. А з верасня пачнем і "Княжну  Мэры", і  "Тры сястры" граць. Акрамя таго, мы выйгралі конкурс на правядзенне Галоўнай ёлкі краіны ў Малой зале і ў Вялікай зале Палаца Рэспублікі. У Малой пакажам спектакль "Блакітная страла" паводле Джані Радары, у Вялікай сыграем казку расійскага драматурга Ганны Багачовай. Я вельмі яе люблю, і мы ўжо некалькі казак гэтай аўтаркі паставілі. На гэты раз у працы будзе "Чароўная сіла": казка пра чароўную сілу дабрыні. Простая і добрая. Пра дабрыню, пра сяброўства і тое, як важна любіць і быць добрым.

***— Праца з Прэзідэнцкім аркестрам у вас прадаўжаецца?***

— Так! Сутворчасць з ім нам вельмі падабаецца. Мы пасябравалі з музыкамі, яны ўсе маладыя і крэатыўныя. Такія ж, як і мы — жадаюць рабіць нешта новае. У іх няма снабізму, нейкай акадэмічнай чапурыстасці. Яны гатовыя ісці з намі на самыя смелыя эксперыменты.

***— Амаль як музыкі ў знакамітым фільме "Вясёлыя рабяты"?..***

— Вось-вось, амаль так і ёсць! Калі б вы паглядзелі нашу казку "Не-Вожык", то пабачылі б, што там вытварае Віталь Кульбакоў — на яго ўсе прыходзяць паглядзець. (Віталь Кульбакоў — галоўны дырыжор аркестра — **Аўт.**). Ён іграе ролю Ваўка. Прычым гэта Дырыжор-Воўк. У яго шапка стылізаваная, фрак адпаведны... Як ён танчыць, як зарадку з дзецьмі робіць! Гэта проста дзіва! А ў аркестры ўсе — Зайчыкі. Аркестр Зайчыкаў! І яны рухаюцца, яны граюць танцуючы. Ну, такога вы ніколі не бачылі! Прычым у выкананні музыкантаў Прэзідэнцкага аркестра. Гэта вельмі-вельмі выдатна.

***— Як Вы сталі телевядучай праграмы "Наше утро"?***

— Я неяк прыйшла туды расказаць пра свой праект "ТриТформаТ", пра сваю творчую дзейнасць. А калі закончылі здымкі, Таццяна Рудакоўская, дырэктар нашай праграмы, кажа: "Ці не хочаш ты паспрабаваць сябе ў ролі вядучай?". Хачу, кажу, але толькі трэба ў мужа спытаць. Муж быў не супраць, сказаў: добра. Таццяна цяпер — сувядучая мая, у другой пары. Так і пачала я працаваць. Уцягнулася, і мне праграма вельмі падабаецца. Каманда ў нас добрая. У нашым свеце, я лічу, любое творчае дзеянне — гэта камандная праца.  Адзін — гэта выдатна. Але калі харызматычны, прыгожы чалавек не ўмее працаваць у камандзе — ніколі ў яго нічога не атрымаецца геніяльнага.

***— Як складаюцца вашыя адносіны з кіно?***

— Цяпер — не вельмі. Апошні фільм "Дамоклаў меч" мы знялі наогул без грошай, і ён неяк згубіўся. Выйшла яшчэ пару фільмаў "Каспій 24" на НТВ — там у мяне сур'ёзная праца, а ў галоўнай ролі — Анастасія Заваратнюк. Цяпер асаблівых прапаноў па кіно няма, што звязана з многімі фактарамі. Але я не ў роспачы.

***— Якія ў вас ёсць звычкі, каб падтрымліваць сябе ў добрай фізічнай форме? Можа, ёгай займаецеся?***

— Не, ёга — не маё. Я ж і так шмат рухаюся. Да таго ж у мяне свой комплекс практыкаванняў выпрацаваны — яго раблю. Але пасля кавіда яшчэ не зусім прыйшла ў сябе, часам кружыцца галава, хутка губляю сілы. Хварэла ў лістападзе, і вельмі сур'ёзна, працэс аднаўлення доўжыцца. Прычым у крыві шмат антыцелаў. Імкнуся больш хадзіць пешшу. Сабаку ў вёсцы бяру — і пайшла: да возера і назад. І вакол возера. Чаго і ўсім жадаю: рухацца!

Гутарылі Іван і Валянціна **Ждановічы.**

Фота з асабістага архіва Веры Паляковай

# КАЛІ ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАГІ І ЛІРЫЧНЫ НАСТРОЙ СПАЛУЧАЮЦЦА РАЗАМ

**Экспазіцыя твораў са шкла заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Мурахвера, якую прадставіў Нацыянальны мастацкі музей, здзівіла сваім арыгінальным зместам.**

Гэтая выстава прымеркавана да 90-годдзя з дня нараджэння аўтара. На ёй пераважна дэманструюцца вырабы з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір Мурахвер мае дачыненне да той плеяды творцаў, якія — кожны ў сваёй сферы — на доўгія гады вызначылі магістральныя шляхі развіцця нацыянальнай культуры. У 1959 годзе пасля заканчэння Ленінградскага вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча імя Веры Мухінай ён быў накіраваны на знакаміты беларускі шклозавод "Нёман". Вытворчасць тут славілася даўнімі, яшчэ з XIX стагоддзя, традыцыямі шклаварэння і вопытнымі майстрамі-шкловыдзімальнікамі, гатовымі рэалізоўваць самыя смелыя ідэі. Менавіта з прыходам прафесійных мастакоў пачаўся росквіт мастацкага шкла ў Беларусі як самастойнага віду мастацтва з уласнымі выразнымі сродкамі. А гэта значыць, што на першы план выходзілі аўтарскі пачатак, індывідуальная эстэтычная канцэпцыя, эксперымент.

Вядома, ва ўмовах завадской вытворчасці свабода творчасці не бязмежная. Тут не месца для "мастацтва дзеля мастацтва", абсалютна адарванага ад рэальнасці. Мастаку даводзіцца думаць не толькі аб увасабленні сваіх арыгінальных ідэй, але і аб тыражаванні, масавым вырабе прадукцыі па распрацаваных ім узорах. Гэта значыць дбаць не толькі пра "ўзвышанае", але і пра "зямное". Аднак для такіх майстроў, як Уладзімір Мурахвер, гэта былі не паралізуючыя кайданы, а выклік, які патрабуе асаблівых крэатыўных рашэнняў, які дае дадатковы імпульс для творчага пошуку.

Адметным з'яўляецца тое, што Уладзіміру Мурахверу ўдалося знайсці шчаслівую гарманічную раўнавагу паміж утылітарнай і дэкаратыўнай функцыямі шкла — здольнасць ператвараць прадметы ўжытку ў сапраўдныя творы мастацтва. Менавіта ён стаў адным з першых мастакоў-наватараў, якія перамянілі беларускае шклоробства, можна сказаць, здзейснілі ў ім рэвалюцыю. Уладзімір Мурахвер зыходзіў з самой прыроды матэрыялу, не скажаючы яе, а імкнучыся перадаць розны стан шкла, яго зменлівасць



і пластычнасць, прадэманстраваць прыгажосць колеру і фактур, гульню святла, рух масы.

Асновай для першых эксперыментаў Уладзіміра Мурахвера стала традыцыйная найстаражытная гутная тэхніка, у якой майстар з дапамогай спецыяльнай трубкі выдзімае расплаўленую да тэмпературы больш за 1000 градусаў шкляную масу, надаючы ёй форму за кароткі час, пакуль яна не астыла, нібы ўтаймоўваючы вогненную "лаву". Творчасць мастака ў тандэме са шкловыдзімальнікам, які ўвасабляе яго ідэі, заўсёды ўтрымлівала элемент імправізацыі, і нямала выяўленчых рашэнняў прыйшло да майстра непасрэдна ў самім працэсе працы.

Творы, выкананыя ў гутнай тэхніцы, нясуць асаблівы эмацыйны зарад, бо гэта ў літаральным сэнсе — застылае імгненне, матэрыялізацыя чалавечага дыхання. А сваё захапленне працай шкловыдзімальнікаў, якая ў чымсьці падобная чараўніцтву, магіі, Уладзімір Мурахвер выказаў у мностве твораў са стылізаванымі выявамі гэтых майстроў, якія нагадваюць часам музыкаў з мудрагелістымі духавымі інструментамі.

На працягу ўсяго жыцця ён шмат эксперыментаваў з рознымі тэхнікамі, бо творчасць мастака, які працуе са шклом, — гэта бесперапынны пошук не толькі новых вобразаў, але і наватарскіх прыёмаў, арыгінальных спосабаў аздаблення матэрыялу. Вядома ж, такія эксперыменты не былі для Уладзіміра Мурахвера самамэтай, а падпарадкоўваліся яго галоўнаму імкненню — жаданню стварыць прадмет, які не абмежаваны яго ўтылітарным









прызначэннем, а ператвараецца ў арт-аб'ект.

Напрыклад, нават самыя традыцыйныя "посудныя" формы ў многіх творах майстра відазмяняюцца. Ён "адгадваў" у абрысах сасудаў для піцця чалавечыя фігуры і асобы. Людзі, анёлы, монстры — улюбёныя вобразы мастака.

Яшчэ адна крыніца натхнення для Уладзіміра Мурахвера — прырода: жывёлы і птушкі, "раслінныя" фактуры і, вядома ж, натуральныя колеры — адценні зялёнага, сіняга, карычневага, чырвонага... Але якія б вобразы ён не ўвасабляў у шкле — нават калі гэта фігуры людзей або жывёл — гэта не проста "рэалістычны" малюнак, а заўсёды нейкі знак, сімвал. Філасофскае разважанне, лірычны настрой, выказаныя ў шкле, гратэск — здаецца, гэтаму мастаку было падуладна ўсё.

Без сумневу, Уладзімір Мурахвер выпрацаваў свой адметны аўтарскі почырк, стварыў уласны ўнікальны мастацкі свет. І разам з тым ён стаяў ля вытокаў фарміравання асаблівага стылю "нёманскага" шкла, быў адным з тых мастакоў, чые творы, створаныя на "Нёмане", сталі вядомымі і шанаванымі далёка за межамі Беларусі, такім жа прадметам нацыянальнага гонару, як, напрыклад, муранскае шкло ў Італіі або багемскі крышталь у Чэхіі.

Сам ён быў родам з невялікага гарадка Ананьева, што ў Адэскай вобласці. Пачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у Ташкенцкім рэспубліканскім мастацкім вучылішчы. Так, у 1959-м скончыў Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя Мухінай, дзе яго педагогам быў вядомы мастак Барыс Смірноў. У тым жа годзе пачаў працаваць на шклозаводзе "Нёман" у горадзе Бярозаўцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. З 1963 па 1975 год быў галоўным мастаком гэтага вядомага на ўвесь Савецкі Саюз прадпрыемства. Многія яго творы ўзнагароджваліся медалямі і дыпломамі СССР і Беларусі. У 1979-м мастак атрымаў залаты медаль Міжнароднага трыенале шкла і фарфору ў чэшскім горадзе Яблонец-над-Нісай. У 1990 годзе сярэбраным медалём Акадэміі мастацтваў СССР была ўзнагароджана яго дэкаратыўная кампазіцыя "Вандроўнікі. Мір таму, хто ўваходзіць".

Варта мець на ўвазе, што дыяпазон творчасці Уладзіміра Мурахвера ахопліваў шырокае кола інтарэсаў. Безумоўна, ён стаяў ля вытокаў новага стылю "нёманскага" шкла — беларускага мастацкага шкла другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя. Майстру

была ўласцівая вялікая любоў і бязмежная адданасць гэтаму матэрыялу, бездакорнае валоданне прафесійнымі навыкамі, вялікая мастацкая культура. Сёння пра яго ведаюць як пра аўтара шматлікіх узораў для масавай вытворчасці і стваральніка ўнікальных выставачных твораў, напоўненых жывым пачуццём і думкай аб свеце, аб прыродзе, аб чалавеку. Акрамя таго, кожная праца гэтага мастака — своеасаблівае даследаванне шкла, адкрыццё яго таямніц.

Зрэшты, разам са шклом Уладзімір Мурахвер актыўна займаўся жывапісам і графікай. Будучы таленавітым майстрам, ён і ў гэтых відах мастацтва здолеў ўвасобіць глыбокія вобразы, новыя ідэі і значныя сюжэты. Недарма творы Уладзіміра Мурахвера знаходзяцца ў зборах многіх музеяў Беларусі, а таксама ў прыватных калекцыях у замежных краінах.

Да ўсяго, трэба абавязкова адзначыць, што важнай і адказнай для Уладзіміра Мурахвера з'яўлялася грамадская дзейнасць. У 1969 годзе па яго ініцыятыве і пад яго кіраўніцтвам у Бярозаўцы пачала працу дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва, якая пастаянна ўдзельнічала ў рэспубліканскіх выставах дзіцячай творчасці. Інакш кажучы, мастак заўсёды здзіўляў невычэрпнасцю жыццёвай энергіі як у творчасці, так і ў звычайным жыцці.

Веніямін **Міхееў**
Фота аўтара











Жнівеньскім вечарам на Камсамольскім возеры ў  Мінску

# КРАІНА
# Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ




## Часопіс для тых, хто жадае ведаць больш

9 770320 754006 21008